Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

№ 16 (2907)
21 красавіка 1978 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Выдаецца з 1932 г.
Цана 8 кап.

У. І. ЛЕНІН.
Гравюра
мастака
В. Ткачука.

ПОСТУП ТЫДНЯ

ВЫДАДЗЕНА КАНСТЫТУЦЫЯ БССР

Выдавецтва «Беларусь» выпусціла ў свет афіцыйны тэкст Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, прынятай на нечарговай дзевятай сесіі Вярхоўнага Савета БССР дзевятага склікання 14 красавіка 1978 года.

Канстытуцыя выдадзена паасобнымі брашурамі масавым тыражом на беларускай і рускай мовах.

БЕЛТА.

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

Аб узнагароджанні тав. ГАРБАЦЭВІЧА В. С. Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

За шматгадовую актыўную літаратурную і педагагічную дзейнасць і ў сувязі з васьмідзесяціпяцігоддзем з дня нараджэння ўзнагародзіць тав. **Гарбацэвіча** Васіля Савіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
І. ПАЛЯКОЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Л. ЧАГІНА.

19 красавіка 1978 года,
г. Мінск.

НАСУСТРАЧ СУБОТНІКУ

Заўтра—свята працы, Усесаюзны Камуністычны суботнік, прысвечаны 108-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Гэты дзень тысячы, дзесяткі тысяч працоўных калектываў краіны абавязаліся зрабіць днём найвышэйшай прадукцыйнасці працы, адзначыць яго работай па зберажоных энергарэсурсах, сыравіне і матэрыялах, выпускам прадукцыі толькі выдатнай якасці.

«Чырвоную суботу» рыхтуецца дастойна сустрэць і творчая інтэлігенцыя рэспублікі, На сходах, што прайшлі ў творчых саюзах і арганізацыях, вызначаны канкрэтныя задачы на гэты дзень. На новабудоўлі, прамысловыя прадпрыемствы, у калгасы і саўгасы выедуць пісьменнікі, мастакі, артысты.

Свая традыцыя правядзення Свята працы склалася ў работнікаў Міністэрства культуры. Яны звычайна ў гэты дзень наведваюць мемарыяльны комплекс «Хатынь», дзе робяць падсадку дрэў, кветак, прыбіраюць і ўпарадкоўваюць тэрыторыю. І на гэты раз традыцыя не будзе парушана.

Канкрэтную праграму вызначыла для сябе Беларускае тэатральнае аб'яднанне. Артысты тэатраў, філармоніі ў дзень суботніка дадуць дзесяткі спектакляў і канцэртаў для працоўных.

Будзе выпускаць у гэты дзень сваю прадукцыю вытворчы камбінат БТА. Работнікі яго ўзялі павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы—паказаць вышэйшую прадукцыйнасць працы на выкананні спецыяльных заказаў. Усе зробленыя сродкі — звыш 11500 рублёў, будуць пераведзены ў фонд суботніка.

У дзень «Чырвонай суботы» калектыў кінастудыі «Беларусьфільм» мяркуе не менш як тры з паловай тысячы рублёў пералесці ў фонд суботніка. Тут, як звычайна, будуць працаваць цэхі, здымачныя павільёны. Многія прымуць удзел у добраўпарадкаванні тэрыторыі студыі.

КІНАЛЕТАПІС ВЯЛІКАГА ЖЫЦЦЯ

Паказ фільмаў, прысвечаны 108-й гадавіне з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна, пачаўся 17 красавіка ў рэспубліцы. Яго адкрыла новая хранікальна - дакументальная стужка «Галоўная плошча», якая расказвае аб святыні нашага народа — Краснай плошчы. Яна — жывы летапіс дзяржавы і памяць народа, якая будзе вечна несці варту ля ленінскага Маўзалея.

На рабочым стале Уладзіміра Ільіча заўсёды ляжаў «Атлас чыгунак Расіі». Ён карыстаўся ім у час гутарак з партыйнымі работнікамі, военачальнікамі, з хадакамі, робячы на яго старонках лаканічныя паметкі. Аўтары новай дакументальнай стужкі «Атлас Ільіча» вырашылі пазнаёміць гледачоў з гэтымі паметкамі і паглядзець, якія змены адбыліся ў месцах, адзначаных рукой У. І. Леніна.

Пазнаёмяцца гледачы з новымі дакументальнымі карцінамі «З Леніным у сэрцы» — расказам аб сустрэчах з правадыром старога бальшавіка В. Е. Васільева, «Ленін на Італьянскай плошчы», у якой адноўлена гісторыя адкрыцця ў Італьянскім горадзе Каўрыяга помніка Ільічу.

У праграму паказу ўключаны таксама мастацкія і дакументальныя фільмы мінулых гадоў — «Ленін у кастрычніку», «Чалавек з ружжом», «Сям'я Ульянавых», «Апавяданні аб Леніне», «Шостае ліпеня», «Ленін у Польшчы», «Апасіяната», «Сэрца маці», «У далёкім Шушанскім» і іншыя.

У фае многіх гарадскіх кінатэатраў, палацаў культуры, сельскіх клубаў экспануюцца фотавыстаўкі, якія расказваюць аб жыцці і дзейнасці заснавальніка і правадыра Камуністычнай партыі, раскрываюць поспехі камуністычнага будаўніцтва ў СССР.

БЕЛТА.

ЛЕНІНУ, РЭВАЛЮЦЫІ, КАСТРЫЧНІКУ

Маляўніча афармлены зборнік паэзіі «Вялікі Кастрычнік» набачыў свет у выдавецтве «Художественная литература». У яго ўвайшлі творы савецкіх паэтаў, прысвечаныя Леніну, рэвалюцыі, Кастрычніку, а таксама тыя, у якіх услаўляецца велічны шлях, пройдзены народам за гады Савецкай улады.

Ёсць у кнізе і беларускія аўтары. Вершы Я. Коласа «Ворагам», П. Броўкі «Дэкрэт Леніна», А. Куляшова «Камуністы» на рускую мову пераклалі С. Гарадзецкі, Я. Хелемскі, Я. Смелякоў.

НЕЗАБЫЎНЫЯ СТАРОНКІ

Працоўны дзень народнага артыста СССР Ф. Шмакава бывае распісаны літаральна па гадзінах. Акрамя творчай дзейнасці на коласаўскай сцэне, ён рэгулярна сустракаецца з рабочымі калектывамі прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў Віцебшчыны, са студэнтамі і школьнай моладдзю, з самадзейнымі артыстамі. І як пра самыя дарагія старонкі тэатральнага жыцця ён гаворыць пра беларускую сцэнічную Ленініяну, пачатак якой пазначаны 1938 годам, калі тут, у Віцебску, вядомы майстар Павел Малчанаў упершыню далучаўся да вялікага вобраза правадыра рэвалюцыі, выступаючы ў галоўнай ролі ў спектаклі «Чалавек з ружжом». Слухачы заўсёды з цікавасцю глядзяць сцэны са спектакля коласаўцаў пастаноўкі 1967 года «Шостае ліпеня», дзе сцэнічны партрэт У. І. Леніна стварыў Ф. Шмакаў.

У гэтыя дні актывісты Беларускага тэатральнага аб'яднання ў лекцыях і на канцэртах знаёмяць слухачоў з гісторыяй адлюстравання гераічнай дзейнасці стваральніка партыі і Савецкай дзяржавы. У творчай біяграфіі такіх прадстаўнікоў сцэнічнага мастацтва рэспублікі, як народныя артысты СССР П. Малчанаў і Б. Платонаў, народныя артысты БССР А. Трус, Д. Арлоў, А. Логінаў, С. Бульчын, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР А. Даброцін, заслужаны артыст БССР М. Цурбаноў, праца над вобразам правадыра была значнай падзеяй і пакінула яркі след ў летапісе беларускага савецкага тэатра. Гутаркі і канцэрты, прысвечаныя 108-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, праводзяць таксама рэжысёры і артысты народных тэатраў.

НА КРЫЛАХ ДРУЖБЫ

Значнай падзеяй у культурным жыцці нашай краіны стаў III фестываль польскай музыкі ў СССР. У рамках гэтага маляўнічага свята 15 красавіка ў Мінску адбыўся вечар польска-савецкай дружбы. Над сцэнай філармоніі — эмблема фестывалю. Апладысментамі сустрэлі гледачы пасланцоў ПНР — старшыню праўлення Саюза польскіх кампазітараў Яна Сцяншэўскага, прарэктара кансерваторыі ў г. Катавіцы Лявона Маркевіча і музыказнаўца Тадэвуша Качыньскага.

У выкананні вядучых беларускіх музыкантаў і салістаў прагучалі творы Станіслава Манюшкі, Фрыдэрыка Шапэна, Міхала Агінскага, Караля Шыманоўскага, Морыца Машкоўскага і сучаснага польскага кампазітара Тадэвуша Берда.

Арыі і дуэты з оперы С. Манюшкі «Галька» выканалі польскія вакалісты Агата Млынарска і Баляслаў Паўлюс, якіх мінчане памятаюць па ўдзелу ў спектаклях Акадэмічнага тэатра оперы і балета БССР. Саліст Варшаўскага Вялікага тэатра Ян Чэкай выступіў у Мінску ўпершыню. Фрагменты гучалі ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра Вялікага тэатра БССР, якім дырыжыраваў прафесар Варшаўскай музычнай акадэміі Багуслаў Мадэй. Слухачы цёпла прынялі праграму канцэрта.

На адкрыцці фестывалю польскай музыкі ў Мінску прысутнічалі сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін, загадчык аддзела культуры ЦК КПБ А. Л. Петрашкевіч, а таксама консул генеральнага консульства ПНР у Мінску К. Ноцунь.

Пяць дзён гучалі творы класікаў і сучасных кампазітараў Польшчы. Канцэрты выклікалі вялікую цікавасць у мінчан. Выступленнем Варшаўскага камернага аркестра завяршылася гэта маляўнічае свята музыкі.

ПАЭЗІЯ, ШТО СТАЛА ПЕСНЯЙ

Гэты вечар пачаўся і закончыўся песняй. Яна, песня, тут была паўнапраўнай гаспадыняй, без яе не ўяўляўся сам вечар, як не ўяўляецца без песні наогул творчасць вядомага беларускага паэта, заслужанага дзеяча культуры БССР Адама Русака.

Пісьменнікі, кампазітары, артысты мінскіх тэатраў і творчых калектываў, усе тыя, хто любіць беларускае мастацтва, прыйшлі ў Дом літаратара на творчы вечар А. Русака, каб выказаць сваё захапленне, радасць ад сустрэчы з паэзіяй, якая стала песняй. Кампазітары самых розных пакаленняў звярталіся да творчасці гэтага паэта. На яго вершы напісана звыш ста песень, многія з якіх вядомы ва ўсіх кутках нашай краіны...

Гучалі вершы, спяваліся песні. Добрыя словы гаварылі пра паэта пісьменнікі Уладзімір Юрэвіч і Сяргей Грахоўскі, народны артыст СССР Генадзь Цітовіч, народны артыст рэспублікі, кампазітар Юрый Семяняка, кампазітар Ігар Лучанок, музыказнавец Іна Зубрыч. Аб чым думаў паэт, слухаючы іх? Можа, аб тым, як Вялікі Кастрычнік адкрыў яму, вясковаму хлапчуку, пастушку, дарогу ў вялікае мастацтва, а можа, успомніў, як яго першая песня «Бывайце здаровы, жывіце багата» выконвалася са сцэны Ленінградскага опернага тэатра, а ён, былы музыкантам гэтага тэатра, нікому не прызнаўся, што з'яўляецца аўтарам яе слоў? Ці, можа, у думках быў на роднай зямлі капыльскай, якая адарыла яго шчодрай любоўю да роднага краю, да матчыных песень...

Беларусь мая, маці родная.
За сялом рака паўнаводная,
За ракой сады салаўіныя,
Льюцца песні ўдаль
пераліўныя.

На растанне Адам Русак сказаў: «Да новага свята». Будзем спадзявацца, што яго новыя «песні пераліўныя» яшчэ не раз прынясуць нам добры святочны настрой.

«СУЧАСНІК—77»

Адбылося пасяджэнне камісіі па нарысу і публіцыстыцы СП БССР, на якім абмеркавана выданне першай кніжкі з серыі «Сучаснік». Новая серыя выдавецтва «Мастацкая літаратура» будзе штогод даносіць да шырокага кола чытачоў лепшыя набыткі беларускай нарысістыкі, адкрываць новыя старонкі працоўнага подзвігу героя-сучасніка.

Зыходзячы з дасягнутага, на пасяджэнні вялася зацікаўленая творчая гаворка пра далейшы лёс новага выдання. «Сучаснік-77», як адзначыла кандыдат філалагічных навук А. Ф. Лысенка, нягледзячы на шырокі тэматычны ахоп, атрымаўся залішне аднастайны. І перш за ўсё гэта тлумачыцца тым, што нарысістамі замала раскрыты магчымасці жанру.

Пра сучасны нарыс гаварылі на пасяджэнні пісьменнікі В. Хомчанка, У. Ліпскі, І. Дуброўскі, П. Місько, Л. Левановіч, В. Дайліда. Адзначалася, што жыццёвасць «Сучасніка» цалкам залежыць ад творчых поспехаў пісьменнікаў і журналістаў, ад паўсядзённага клопату і намаганняў іх творчых саюзаў.

Пасяджэнне камісіі вёў яе старшыня, пісьменнік У. Юрэвіч.

ДЛЯ АМАТАРАЎ КНІГІ

У вёсцы Вышэвічы Пінскага раёна гасцінна адчыніла дзверы новая кнігарня. На яе паліцах каля трох тысяч назваў кніг. Тут можна набыць літаратуру па тэхніцы і сельскай гаспадарцы, філалогіі і мастацтву, прыродазнаўчых і дакладных навуках, ветэрынарыі і медыцыне.

Багаты выбар кніг мастацкай літаратуры беларускіх літаратараў— Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, М. Танка, І. Мележа, І. Шамякіна, В. Быкава, Р. Барадуліна, Я. Брыля, І. Навуменкі і іншых.

Не пакінуты без увагі самыя маленькія пакупнікі. Для іх у аддзеле дзіцячай літаратуры беларускія і рускія народныя казкі, творы А. Пушкіна, С. Маршака, К. Чукоўскага, М. Лынькова, Я. Маўра.

Прыгожа афармлены інтэр'ер кнігарні. На мазаічных драўляных плітках—плакаты з выказваннямі славутых людзей аб кнігах. Арыгінальныя падстаўкі з кветкамі надаюць кнігарні своеасаблівы настрой і гасціннасць.

«КРЫНІЦА»—ВЫТОК НАТХНЕННЯ

«Крыніца»... Так назвалі студэнты Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта сваё літаратурнае аб'яднанне. Ужо некалькі год існуе яно ў буйнейшай навучальнай установе беларускага Палесся. Кіруе аб'яднаннем выкладчык кафедры беларускай літаратуры, кандыдат філалагічных навук паэт Віктар Ярац. У канцы кожнага месяца збіраюцца маладыя паэты і празаікі на свае пасяджэнні, калектыўна абмяркоўваюць творы таварышаў.

З цягам часу з аб'яднання выдзеліўся самастойны літаратурна-крытычны гурток, члены якога на сваіх пасяджэннях абмяркоўваюць праблемы сучаснай прозы, паэзіі і драматургіі. Узначаліў гурток кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры крытык Мікола Луфераў. Маладыя крытыкі аналізуюць творы нашай сучаснай літаратуры.

Багатыя традыцыі літаб'яднання. З яго выйшлі вядомыя беларускія паэты і празаікі Іван Шамякін, Міхась Дучыленка, Анатоль Грачанікаў. Радуе сённяшняя таленавітая моладзь. Добрую літаратурную заяўку зрабілі Анатоль Зэкаў, Сямён Шынкун, Ніна Шклярава, Міхась Башлакоў, Ірына Багдановіч, Іван Мядзведзеў і іншыя.

Члены «Крыніцы» — частыя госці ў працоўных калектывах Гомеля і вобласці.

А. ШВЕДАЎ.

Навіны Магілёва

ЗАКОН, ПА ЯКОМУ ЖЫЦЬ І СТВАРАЦЬ

Такую назву атрымаў новы экскурсійны маршрут, які нядаўна распрацавалі супрацоўнікі Магілёўскага бюро падарожжаў і экскурсій. Ён прысвечаны новай Канстытуцыі СССР, дасягненням магілёўчан за 60 гадоў Савецкай улады. На маршруце прамысловыя прадпрыемствы і новыя жылыя раёны, навучальныя і навуковыя ўстановы, спартыўныя збудаванні, месцы адпачынку працоўных. Будучыя экскурсанты—слухачы школ камуністычнай працы, прапагандысты і агітатары — даведаюцца і ўбачаць, як працоўныя абласнога цэнтра выконваюць свае абавязкі, як выкарыстоўваюць правы, замацаваныя Асноўным Законам нашай краіны.

БУДЗЕ МУЗЕЙ

На Ленінскай вуліцы вядзецца рэстаўрацыя і пераабсталяванне жылога дома XVII стагоддзя, які з'яўляецца цікавым узорам гарадской сядзібнай архітэктуры. Тут працуюць спецыялісты рэспубліканскіх навукова-рэстаўрацыйных майстэрань.

Будынак ужо набыў першапачатковы вонкавы выгляд — чарапічны дах, мансарды, старадаўняга ўзору шыбы. Зараз ідуць аддзелачныя работы.

У хуткім часе магілёўчане і госці горада змогуць азнаёміцца з экспазіцыяй новага абласнога музея—мастацкага, які будзе абсталяваны тут пасля рэстаўрацыі. У ім намечана таксама стварыць мемарыяльную залу славутага земляка—народнага мастака РСФСР і БССР В. К. Бялыніцкага-Бірулі.

НОВЫЯ НАРОДНЫЯ

Ганаровае званне «народны» прысвоена яшчэ двум самадзейным калектывам горада. Яго ўдастоены лаўрэат Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных харавая капэла медыцынскіх работнікаў абласной псіханеўралагічнай бальніцы, якая ўжо 16 год пад кіраўніцтвам ветэрана вайны А. Мысава паспяхова выступае перад магілёўчанамі і жыхарамі іншых гарадоў рэспублікі, і агітацыйна-мастацкая брыгада Палаца культуры вытворчага аб'яднання «Хімвалакно» імя У. І. Леніна, якой кіруе А. Мошчанка.

Ва ўстановах культуры Магілёва зараз плённа дзейнічаюць 20 самадзейных народных калектываў.

У МАСКВУ НА ОПЕРУ

Першы тэатральны поезд з Беларусі пабываў нядаўна ў Маскве. Больш як 500 працоўных Магілёва змястоўна правялі ў сталіцы свой выхадны дзень.

Яны пазнаёміліся са славутымі мясцінамі сталіцы. Вечарам аматары музыкі пабывалі ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў на спектаклі Вялікага тэатра Саюза ССР Д. Пучыні «Чыо-Чыо-сан», паглядзелі ў новым маскоўскім цырку прадстаўленне з удзелам сусветна вядомага клоуна Алега Папова.

Гэту паездку арганізавала бюро падарожжаў і экскурсій абласнога цэнтра.

М. НОЖНІКАЎ.

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

Аб узнагароджанні часопіса «Маладосць» Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

За заслугі ў камуністычным выхаванні моладзі, развіцці беларускай савецкай літаратуры ўзнагародзіць часопіс «Маладосць» Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І. ПАЛЯКОЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Л. ЧАГІНА.

17 красавіка 1978 года.
г. Мінск.

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

Аб узнагароджанні Ганаровай граматай і Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР супрацоўнікаў рэдакцыі, няштатных аўтараў часопіса «Маладосць» і работнікаў друкарні выдавецтва ЦК Кампартыі Беларусі

За плённую літаратурную дзейнасць, актыўную работу ў друку і паліграфіі ўзнагародзіць:

ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Аўрамчыка Мікалая Якаўлевіча — паэта, рэдактара аддзела рэдакцыі часопіса.

Бураўкіна Генадзія Мікалаевіча — паэта, галоўнага рэдактара часопіса.

Гілевіча Ніла Сямёнавіча — паэта, няштатнага супрацоўніка часопіса.

Кашкурэвіча Арлена Міхайлавіча — мастака-графіка, няштатнага супрацоўніка часопіса.

ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Ждановіча Валянціна Ісакавіча — літаратурнага супрацоўніка рэдакцыі часопіса.

Кунько Ларысу Пятроўну — машыністку рэдакцыі часопіса.

Кухарава Сцяпана Іванавіча — пісьменніка, рэдактара аддзела рэдакцыі часопіса.

Ляпескую (Палтаран) Веру Сямёнаўну — пісьменніцу.

Прэжына Сяргея Артамонавіча — вярстальшчыка друкарні выдавецтва ЦК Кампартыі Беларусі.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І. ПАЛЯКОЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Л. ЧАГІНА.

17 красавіка 1978 года.
г. Мінск

СТАЛАЯ МАЛАДОСЦЬ «МАЛАДОСЦІ»

Ад імя рэдакцый часопісаў «Полымя», «Беларусь», «Неман» і штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» віншавальныя адрасы ўручае галоўны рэдактар «Немана» Анатоль Кудравец.

Фота І. АБРАЎЦА.

«Дарагія таварышы, камсамольцы і моладзь!

У вас ёсць тры бясцэнныя дары, якім я магу толькі пазайздросціць, у той жа час і парадавацца. Першы дар — ваша маладосць, сіла, жыццярадаснасць. Другі дар — прасторныя, шырокія дарогі ў жыццё, якія расчынілі перад вамі партыя Леніна і наш Савецкі ўрад. Трэці ваш дар... сягоння яго яшчэ няма ў вас, але ён будзе, яго вы павінны здабыць вашаю чэснаю, прынцыповаю, адданаю працаю на славу нашай сацыялістычнай Радзімы, партыі і народа. Гэты ваш дар можа і павінен праявіцца ў шматграннай вашай дзейнасці — дзейнасці савецкіх людзей. А для гэтага вам трэба вучыцца і вучыцца, і не толькі ў сценах школ і інстытутаў, але і па-за іх межамі.

Што ён такое, ваш трэці дар?

Гэта ваш уклад у навуку, у паэзію, у мастацтва, у справу будаўніцтва камуністычнага грамадства...

Мой запавет вам: ідзіце ў нагу з жыццём, не адставайце, апераджайце яго. Развівайце і памнажайце вашы дары, аддайце іх народу, роднай партыі, якія росцяць і выхоўваюць вас.

Ад усёй душы жадаю вам поспехаў на гэтым шляху».

Значную дапамогу калектыву рэдакцыі аказалі народны пісьменнік Беларусі М. Лынькоў і народны паэт рэспублікі М. Танк, якія доўгі час былі членамі рэдкалегіі, а галоўнае —пастаянна падтрымлівалі цесны, дзелавы кантакт з супрацоўнікамі, рэгулярна заходзілі ў рэдакцыю. Іх заўвагі, парады шмат далі «маладосцеўцам», бо М. Лынькоў меў значны вопыт рэдактарскай работы. Веданне ж паэзіі, мастацкаму густу М. Танка можна толькі пазайздросціць.

«Маладосць» упэўнена крочыла па жыцці. Сцяг моладзі рэспублікі лунаў на новабудоўлях, і агератыўныя рэпартажы, праблемныя артыкулы, цікавыя нарысы з'яўляліся з Наваполацка і Салігорска, журналісты і пісьменнікі ехалі на будаўніцтва Бярозаўскай і Васілевіцкай электрастанцый, пісалі пра жыццё маладзёжных калектываў Светлагорска і Баранавіч, Магілёва і Мазыра.

Аднак «Маладосць» — гэта перш за ўсё стартавая пляцоўка ў літаратуру дзесяткаў празаікаў і паэтаў, крытыкаў і нарысістаў. «Сваім» называюць часопіс і мастакі, бо на яго старонках рэгулярна змяшчаюцца рэпрадукцыі з іх твораў, друкуюцца творчыя партрэты скульптараў, жывапісцаў, графікаў... «Сваёй» стала таксама «Маладосць» і для артыстаў, спевакоў, бо менавіта яна часта першай адкрывае шырокай аўдыторыі імёны маладых.

Наша «Маладосць»... Сапраўды наша, сапраўды ўсіх. У гэтым асабліва добра можна было пераканацца на ўрачыстым вечары, арганізаваным Цэнтральным Камітэтам ЛКСМБ і Саюзам пісьменнікаў Беларусі і прысвечаным 25-годдзю з дня выхаду першага нумара часопіса. У Доме літаратара можна было ўбачыць вучня і студэнта, убеленага сівізной ветэрана і маладога паэта, знакамітага празаіка і народнага артыста.

Першы сакратар праўлення СП Беларусі, народны пісьменнік рэспублікі І. Шамякін, які адкрыў і вёў гэты вечар, таксама «маладосцевец», адзін з аўтараў часопіса, адзін з яго прыхільнікаў, сябраў і дарадцаў.

Ад імя Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і Савета Міністраў рэспублікі сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін сардэчна павіншаваў калектыў часопіса і яго аўтарскі актыў з высокай узнагародай і ўручыў прадстаўнікам рэдакцыі Ганаровую грамату Вярхоўнага Савета БССР.

А. Т. Кузьмін пажадаў калектыву рэдакцыі яшчэ большай паслядоўнасці, мэтанакіраванасці і зоркасці ў адлюстраванні жыцця моладзі, у публікацыі ідэйна сталых і па-мастацку дасканалых твораў, у нястомным пошуку і выхаванні маладых талентаў.

У сваім выступленні Г. Бураўкін нагадвае словы Пятра Міронавіча Машэрава, у свой час сакратара ЦК ЛКСМБ, сказаныя ім у сувязі з выхадам першага нумара «Маладосці»: Радзіма, як добрая маці, клапоціцца аб нашай моладзі. Новым сведчаннем гэтых клопатаў з'яўляецца выданне ў нашай рэспубліцы часопіса «Маладосць».

25 гадоў. 300 нумароў... Калі б скласці разам раманы, аповесці, паэмы, вершы, апавяданні, нарысы, публіцыстыку, якія ўпершыню прыйшлі да чытача са старонак «Маладосці», атрымалася б цэлая бібліятэка, з якой не сорам выйсці да людзей. На не аўтарытэтных паліцах стаяць побач аповесці В. Быкава, адзначаныя Дзяржаўнай прэміяй СССР; вершы Р. Барадуліна і Я. Сіпакова са зборнікаў «Рум» і «Веча славянскіх балад», удастоеных Дзяржаўных прэмій БССР імя Я. Купалы; «Хатынская аповесць» А. Адамовіча, за якую ён стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа; «Першая кніга» І. Мележа, трылогія І. Навуменкі «Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах», «Сорак трэці»; раманы І. Чыгрынава «Плач перапёлкі» і «Апраўданне крыві», аповесці і апавяданні І. Шамякіна, Я. Брыля, А. Кулакоўскага, А. Чарнышэвіча, Я. Васілёнка, І. Пташнікава, А. Асіпенкі, Б. Сачанкі, Б. Савіцкага; нарысы В. Палтаран, С. Кухарава; навелы М. Стральцова, В. Адамчыка, А. Кудраўца; вершы П. Броўкі, А. Куляшова, М. Танка, П. Панчанкі, М. Лужаніна, В. Віткі, К. Кірэенкі, С. Грахоўскага, С. Гаўрусёва, Н. Гілевіча, П. Макаля, Е. Лось, А. Вярцінскага, А. Лойкі, М. Арочкі, В. Зуёнка, А. Грачанікава; праблемныя артыкулы У. Юрэвіча, Р. Бярозкіна, В. Каваленкі, Д. Бугаёва, У. Гніламёдава... А колькі прозвішчаў і публікацый засталося па-за гэтым пералікам!

«Маладосць», працягвае Г. Бураўкін, шчыра прымае, бярэ ў дружную сям'ю літаратараў маладых пісьменнікаў. У сярэднім і маладым пакаленнях практычна няма ніводнага прыкметнага імені, якое ўпершыню не прагучала б у часопісе, не прайшло яго школу. У «Маладосці» наогул зайздросны і рэдкі лёс — яна не старэе, вечнае абнаўленне жыцця не толькі ярка адлюстроўваецца ў ёй, а праходзіць з яе актыўным удзелам.

На тытуле часопіса побач са словамі «літаратурна-мастацкі» стаіць яшчэ — «грамадска-палітычны». Пісаць летапіс роднай Савецкай Беларусі не толькі мастацкімі сродкамі, а і зброяй журналістыкі — штодзённая адказная задача. Калі нанесці на карту рэспублікі маршруты нарысістаў, рэпарцёраў, фотамайстроў «Маладосці» за 25 гадоў, дык не знойдзецца ніводнага больш-менш значнага пункта, дзе б яны не пабывалі.

Выступае першы сакратар ЦК ЛКСМБ К. М. Платонаў. Дваццаць пяць гадоў, гаворыць ён, часопіс верны сябра і дарадчык моладзі. Па ўзросту свайму ён, па сутнасці, равесник сённяшняга чытача. Ён не старэе, і заўсёды застаецца гэткім жа шчырым і непасрэдным.

К. Платонаў уручае калектыву Ганаровую грамату ЦК ЛКСМБ, якой часопіс узнагароджан за заслугі ў камуністычным выхаванні моладзі.

Віншавальны адрас Саюза пісьменнікаў Беларусі зачытвае старшыня праўлення СП БССР, народны паэт рэспублікі. Герой Сацыялістычнай Працы М. Танк.

Ад імя Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю і праўлення Саюза журналістаў рэспублікі выступае старшыня Дзяржкамвыда БССР, намеснік старшыні праўлення Саюза журналістаў рэспублікі М. І. Дзялец. Кожны з журналістаў, зазначае ён, хто рыхтуецца ў будучым стаць літаратарам, абавязкова павінен прайсці праз першае выпрабаванне, якое звычайна пачынаецца на старонках «Маладосці».

Пісьменнік Б. Рагаза прыехаў з Кіева. Адказны сакратар украінскага маладзёжнага часопіса «Дніпро», ён прывёз сувенір беларускім калегам і шчырае віншаванне.

«Маладосць» — часопіс не проста маладзёжны, а перш за ўсё камсамольскі, гаворыць зборшчыца вытворчага аб'яднання вылічальнай тэхнікі В. Сіўцова. Менавіта са старонак «Маладосці» для соцень юнакоў і дзяўчат пачынаецца вялікі шлях у вялікае жыццё.

«Цёплы мікраклімат творчасці панаваў і пануе ў рэдакцыі «Маладосці», сведчыць галоўны рэдактар часопіса «Неман» А. Кудравец. Увага да маладых талентаў была і ёсць самым галоўным у рабоце. Ён віншуе калектыў ад імя «цёманцаў», а таксама ад імя рэдакцый часопісаў «Полымя», «Беларусь», штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва».

Выступленні... У кожным з іх словы цеплыні і шчырасці, удзячнасці за зробленае, здзейсненае. Галоўны рэдактар літоўскага маладзёжнага часопіса «Яўніма Гратас» В. Бараўскас і Т. Отс — намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Наарус», які выходзіць у Эстоніі, прывезлі сувеніры, сваю карціну падарыў «маладосцеўцам» мастак Г. Паплаўскі.

Пра гады сваёй працы ў рэдакцыі ўспаміналі старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР В. Грамыка і галоўны рэдактар часопіса «Бярозка» В. Зуёнак.

А вось яшчэ адно сведчанне сённяшніх спраў рэдакцыі: «Маладосць» узяла шэфства над ударнай камсамольскай будоўляй Палесся — узвядзеннем саўгаса «Адраджэнне» ў Ганцавіцкім раёне. Заключаны дагавор на творчае супрацоўніцтва. Дырэктар саўгаса В. Зялёнка на вечары ўручыў калектыву Ганаровую грамату, якой ён узнагароджаны дырэкцыяй гаспадаркі.

Віншаванні паступілі таксама ад праўлення Саюза пісьменнікаў СССР і Савета па беларускай літаратуры, Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі, ад абласных, раённых і пярвічных камсамольскіх арганізацый рэспублікі, ад шматлікіх грамадскіх арганізацый, ад многіх чытачоў. Некаторыя з іх зачытаў намеснік галоўнага рэдактара «Маладосці» А. Жук.

Цёплую тэлеграму-віншаванне часопісу, у якім ён надрукаваў сваю кнігу «Зоры — побач», прыслаў лётчык-касманаўт СССР, двойчы Герой Савецкага Саюза, наш зямляк П. Клімук.

...Свята маладосці, літаратуры, мастацтва працягваецца. Выступаюць артысты мінскіх тэатраў, самы стары «маладосцевец», нязменны рэдактар аддзела паэзіі часопіса М. Аўрамчык. Гаспадарыць паэзія, музыка, песня. А ў зале — адухоўленыя, светлыя твары. У гэты вечар усе, хто сабраўся ў Доме літаратара неяк неўпрыкметку, неўспадзяванку пахарашэлі і памаладзелі. Інакш і быць не можа. Той, хто сябруе з «Маладосцю», не можа не быць маладым.

●

Ва ўрачыстым вечары, прысвечаным 25-годдзю з дня выхаду першага нумара часопіса «Маладосць», прынялі ўдзел загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ С. Я. Паўлаў, намеснікі загадчыкаў: аддзела культуры — Я. Б. Парватаў, аддзела прапаганды і агітацыі — Г. М. Конанаў.

Людзі спяшаюцца да газетных кіёскаў, з нецярпеннем зазіраюць у паштовыя скрынкі... Моладзь—і не моладзь —жыве чарговай сустрэчай з выданнем, якое даўно палюбіў, даўно лічыць самым лепшым і аўтарытэтным. Для многіх юнакоў і дзяўчат, а таксама людзей пажылога ўзросту менавіта такім выданнем і з'яўляецца літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны часопіс Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ і Саюза пісьменнікаў Беларусі «Маладосць».

Знаёмая белая вокладка з малюнкам, заўсёды выкананым па-майстэрску, строга і прадумана, а ўверсе — гэта ўжо стала добрай традыцыяй — блакітныя пялёсткі кветкі — сімвал юнацтва, маладосці, пастаяннага абнаўлення жыцця.

Такая яна, наша сённяшняя «Маладосць» — узмужнелая, пасталелая, і гэткая ж юная, бо па-ранейшаму на старонкі свае запрашае тых, хто любіць маладых і піша для маладых. І, вядома, саміх пачаткоўцаў.

«Маладосць» заўсёды ў хаўрусе з маладосцю. А шлях гэты ў вечнае юнацтва пачаўся роўна дваццаць пяць гадоў назад, калі было прынята рашэнне выдаваць у рэспубліцы часопіс для камсамольцаў і моладзі. І вось у красавіку 1953 года ў кіёсках з'явіўся яго першы нумар.

Першыя крокі... Яны заўсёды самыя цяжкія. Патрэбна было вызначыць творчы кірунак, выбраць арыенціры, на якія трымацца ў далейшым. Як шмат значыла тут сяброўская падтрымка старэйшых, іх добрае, шчырае і спагадлівае слова.

Яно прагучала. У першым нумары да моладзі рэспублікі, да ўсіх чытачоў звярнуўся народны пясняр беларускага народа Я Колас. Ён пісаў:

ПОСТУП ТЫДНЯ

МЫ ЗАНЯТЫ МІРНАЙ ПРАЦАЙ...

З РАДАСНЫМ настроем і вялікім уздымам Вярхоўны Савет БССР прыняў новую Канстытуцыю Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, чацвёртую па ліку ад пачатку нашай дзяржаўнасці.

Слова «канстытуцыя» на Беларусі пачало бытаваць пасля рэвалюцыі 1905 года, пасля лжывай царскай абяцанкі даць свабоду. Якуб Колас пісаў у 1908 годзе:

Канстытуцыю далі,
Адчынілі дзверы,
І... ў астрог нас павялі,
І таўкуць без меры.
. . . . . .
Зашумелі аб зямлі
У Думе дэпутаты,
Ды па карку ім далі —
І пайшлі дахаты.

Даўно адышлі ў нябыт тыя змрочныя часы і падзеі. Наша індустрыяльна-калгасная Беларусь прыходзіць да свайго шасцідзесяцігоддзя ў нябачнай славе і красе.

Пісьменнікі нашай рэспублікі, як і ўвесь народ, аднадушна ўхвалілі новую Канстытуцыю БССР.

Вядома, мы асаблівую ўвагу звярнулі на 27 артыкул:

«Дзяржава клапоціцца аб ахове, прымнажэнні і шырокім выкарыстанні духоўных каштоўнасцей для маральнага і эстэтычнага выхавання савецкіх людзей, павышэння іх культурнага ўзроўню.

У Беларускай ССР усямерна заахвочваецца развіццё прафесіянальнага мастацтва і народнай мастацкай творчасці».

І на той артыкул, дзе гаворыцца, што дзяржава стварае неабходныя ўмовы для развіцця літаратуры і мастацтва і аказвае падтрымку творчым саюзам.

Мы адчуваем штодзённыя клопаты Цэнтральнага Камітэта КПБ і Урада рэспублікі аб пісьменніках, аб усіх творчых работніках і за гэта вельмі ўдзячныя.

Беларускія пісьменнікі адчуваюць вялікую адказнасць перад родным народам, перад Камуністычнай партыяй за сваю нялёгкую працу. Наш час надзвычайна складаны. Паскораны тэмп жыцця, навукова - тэхнічная рэвалюцыя, высокія культурныя і эстэтычныя запатрабаванні савецкага чалавека, абавязваюць нас глыбей вывучаць жыццё, лепш адчуваць, разумець справы і пачуцці нашага сучасніка. Для таго, каб выхоўваць, патрэбна самім пісьменнікам, мастакам, кампазітарам, акцёрам вучыцца ў рабочых і калгаснікаў, інжынераў і аграномаў, вучыцца ў народа.

Лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў карыстаюцца папулярнасцю далёка за межамі Беларусі, перакладзены на многія мовы народаў Савецкага Саюза і зарубежных краін.

Мінскі паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа па працягу сутак выпускае дзвесце дваццаць тысяч экземпляраў кніг і брашур, а заказы на беларускую кнігу прыходзяць са ста дзесяці краін свету.

Найбольш выдатныя раманы і аповесці беларускіх празаікаў такіх, як І. Мележ, І. Шамякін, В. Быкаў выдаюцца на рускай мове ў мільёнах экземпляраў. П'есы К. Крапівы і А. Макаёнка ідуць у многіх тэатрах Савецкага Саюза. Ёсць значныя поспехі і ў паэзіі. Гэта сапраўды росквіт нацыянальнай літаратуры і культуры.

Аднак, у нас усё яшчэ мала таленавітых кніг пра сённяшні дзень, пра нашага сучасніка, пра рабочага чалавека. Недаравальна мала добрых п'ес, асабліва для самадзейнасці.

Ды і песні ў апошні час гучаць некалькі аднастайна: ён, яна, вясна ды салаўі. Гэта, вядома, патрэбна. Але неабходны патрыятычныя і гераічныя песні, каб яны загучалі так жа ўсхвалявана, як «Трывожная маладосць» Пахмутавай і «Дзень Перамогі» Тухманава.

Мы ганарымся нашай Канстытуцыяй, нашым гуманізмам, нашымі правамі.

Мне ўспамінаецца такі факт. На адной амерыканскай ваеннай базе ў Заходняй Германіі двумстам пяцідзесяці двум амерыканскім салдатам быў прачытаны наступны тэкст: «Мы лічым як само па сабе зразумелае, што ўсе людзі створаны роўнымі, што тварэц надзяліў іх неад'емнымі правамі, і сярод іх — правам на жыццё, свабоду, імкненнем да шчасця».

Тых, хто згодзен з гэтым, папрасілі паставіць свае подпісы. Семдзесят тры працэнты салдат адмовіліся падпісацца пад гэтымі словамі.

Іх не папярэдзілі, што тэкст гэты ўзяты з амерыканскай дэкларацыі незалежнасці.

Чаго варты гэтыя высокія словы, калі яны не падмацаваны справамі, калі ў іх не вераць і, нават, не ведаюць сваю канстытуцыю. Я быў у нью-йоркскім Гарлеме, бачыў бясконцыя кварталы чыкагскіх трушчоб, бачыў велізарныя чэргі беспрацоўных каля біржаў працы ў многіх еўрапейскіх і амерыканскіх гарадах. І заўсёды ў сэрцы было спачуванне людзям, якіх пазбавілі асноўных правоў: права на працу, права на жыллё. Адначасова сэрца перапаўнялася гордасцю за нашу вялікую сацыялістычную Радзіму, за савецкі лад жыцця. Такую ж гордую радасць я адчуў, калі ў далёкай спякотнай Гвінеі бачыў за працай нашы «МАЗы» і трактары «Беларусь».

Мы ніколі б не мелі такіх здабыткаў, каб нам не дапамагалі братнія народы, асабліва вялікі рускі народ. Таму мы асабліва вітаем артыкул Канстытуцыі аб роўнасці грамадзян Беларускай ССР перад законам незалежна ад паходжання, сацыяльнага і маёмаснага становішча, расавай і нацыянальнай прыналежнасці, полу, адукацыі, мовы, адносін да рэлігіі, роду і характару заняткаў, месца пражывання і іншых акалічнасцей.

У Беларусі жывуць і працуюць прадстаўнікі больш за 80 нацыянальнасцей. Адны з іх жылі тут здаўна, другія назаўсёды засталіся з часоў партызанскай барацьбы, іншыя прыехалі дапамагчы нам развіваць новыя галіны прамысловасці. Мы ім рады, як родным братам, і яны ўспрымаюць жыццё нашага народа, як сваё. Бываючы ў розных рэспубліках нашай вялікай Радзімы, мы заўсёды адчуваем, як любяць і паважаюць нашу Беларусь. І мы адказваем нашым братам і сёстрам самай гарачай і адданай любоўю. Добра пра гэта сказаў паэт Генадзь Бураўкін:

Я ўдзячны лёсу, што ва ўсе часы
Мая бланітнавокая радзіма
Не засланіла мне чужой красы,
Мяне ад свету не адгарадзіла,
Што не магла, не ўмела быць другой,
Жыла ў братэрстве і сяброў цаніла
І што ў краіне нашай дарагой
Яе завуць сястрою мілай.

І няхай сабе скавычуць наёмныя маніокі і плеткары з розных ілжывых радыёстанцый, праўда мацней за хлусню. Беларускі народ ведае свае правы, ведае свае абавязкі і з высокай годнасцю прымае сёння сваю Канстытуцыю.

Трэба адзначыць, што мы пазбаўлены, па нашу радасць, некаторых правоў, а іменна:

не маем права эксплуатаваць людзей, нажывацца за кошт чужой працы;

не маем права прапаведваць адчай і нявер'е ў свае сілы, выхоўваць у маладых людзях непавагу да ідэалаў сваіх бацькоў;

не маем права прыніжаць чалавека, якой бы нацыянальнасці ён ні быў;

мы не маем права прапаведваць расавую нянавісць і вайну.

Гэта запісана ў нашай Канстытуцыі. Але мала ненавідзець вайну, патрэбна актыўна і паслядоўна змагацца за мір, асабліва цяпер, калі ваенна-прамысловыя комплексы некаторых дзяржаў прагнуць паставіць свет на грань тэрмаядзернай вайны.

Леанід Ільіч Брэжнеў, выступаючы 7 красавіка перад маракамі-ціхаакіянцамі, сказаў:

«Пры ўсёй значнасці той або іншай праблемы ў сучасных умовах няма задачы больш важнай, якая закранае лёс кожнага чалавека на зямлі, чым дабіцца рэальнага раззбраення. Спыніць гонку ўзбраенняў, забяспечыць рух да змяншэння, а ў канчатковым выніку ліквідацыі пагрозы тэрмаядзернай катастрофы — вось асноўная праблема, якая стаіць цяпер на парадку дня нашага жыцця».

Удзельнікі сходу, як і ўвесь беларускі народ, падтрымалі патрабаванне міралюбівай грамадскасці забараніць вытворчасць нейтроннай зброі, спыніць гонку ўзбраенняў, зрабіць працэс разрадкі незваротным.

Слесар-лякальшчык Мінскага трактарнага завода імя У. І. Леніна Герой Сацыялістычнай Працы Яўген Іванавіч Клімчанка сказаў:

«Ад імя рабочых прадпрыемства я выказваю гнеўны пратэст супраць намеру кіруючых колаў ЗША пачаць вытворчасць нейтроннай бомбы. Трактарабудаўнікі заняты мірнай, стваральнай працай. Наша прадукцыя, вядомая далёка за межамі краіны, прызначана для мірных мэт. Мы хочам, каб на зямлі зеляненелі палі і цвілі сады, каб дзеці раслі здаровымі і жыццярадаснымі пад мірным небам планеты».

Пад гэтымі словамі можа падпісацца кожны савецкі чалавек.

І хаця пад напорам гнеўнага пратэсту і абурэння сумленных людзей усяго свету амерыканскі прэзідэнт адклаў на некаторы час разгортванне нейтроннай зброі, мы ні на хвіліну не павінны забываць, што пагроза вайны не знікла.

Наш новы Асноўны Закон рэспублікі, як і Канстытуцыя СССР, — гэта мудрыя падручнікі жыцця. І я жадаў бы, каб тэкст Канстытуцый СССР і БССР у прыгожым малафарматным выданні, дарылі дзецям бацькі ці школа як мага раней і звярталі ўвагу не толькі на правы савецкага чалавека, а больш на абавязкі грамадзяніна.

Наша новая Канстытуцыя — цудоўны падарунак да шасцідзесяцігоддзя БССР і Камуністычнай партыі Беларусі.

Пімен ПАНЧАНКА.

Камсамолец Леанід Каратневіч — адзін з лепшых механізатараў саўгаса «Кармянскі» Гомельскай вобласці. Працуе ён па-ўдарнаму, з агеньчыкам.

Фота І. ЮДАША. (БЕЛТА).

Віктар РАКАЎ

ЖЫЦЦЯДАЙНАСЦЬ

ФРАГМЕНТЫ З ПАЭМЫ

На плошчах,
на плошчах,
на плошчах
Адвеку не сеюць, не жнуць.
На плошчах эпохі жывуць,
Сцягі сваю чырвань палошчуць,
У ціхую зорную поўнач
Прыстой тут сам-насам няўзнак —
Міжволі адчуеш раптоўна,
Як грудзі ўздымаюцца,
як
На камені золкім і гулкім,
На гулкай суровай пліце
Тут курчыцца стоена-мулка
Вякоў непадатлівы цень;
Як тут аднаміг, адначасна
І лашчыць душу, і скубе,
І смужна, і ўтомна, і ясна,
І вольна, і цесна табе.
У поклічнай, велічнай позе
Тут разам з табою ў разлог
Нязрушна
у мармуры, ў бронзе
Глядзяць сцяганосцы эпох.
Нязрушна
у мармуры, ў бронзе
Пасталі планеты сыны.
Пры людным прыпынку ў дарозе,
Пры станцыі кожнай яны.
Абліччы,
абліччы,
абліччы...
У нас іх любы пазнае,
Стары і малы іх залічыць
У спісы радзіны свае,
Пакліча пяшчотна, натхнёна
З далёкай і блізкай пары.
Імёны,
імёны,
імёны
У назвах дружын дзетвары,
Праспектаў, пасёлкаў, заводаў,
Сузор'яў
праменна цвітуць.
Праз годы,
праз годы,
праз годы
Героі ў бяссмерце ідуць.
Ідуць разам з намі ў здзяйсненне
Задум сваіх дзёрзкіх яны.
Наперадзе
родны наш Ленін,
Свяціла ў сузор'і зямных.
Ашчадна, разважна, высока
Абдуманы сёння наш быт.
І — бачна далёка-далёка,
І — ўсё зразумела, нібы.
Здаецца нам сёння звычайным,
Што будзень наш светлы такі,
Што ў свет малады жыццядайна
Прастуюць наўсцяж бальшакі,
Што маткі не плачуць, не тужаць
Аб долі нязнанай дзяцей,
Што ў кветніку яркая ружа
Дагледжана-гожа цвіце.
Што ў звонкую новую хату
Шчасліва ўязджае сям'я,
Што мроіць і лашчыць салдата
Развеснены спеў салаўя.
Ды побач —
маўкліва-імгліста
Увысь абеліскі ўзраслі...
...Ідуць уваччу камуністы
Па плошчах вячыстых Зямлі...
На плошчах,
на плошчах,
на плошчах
Паслухай —
глыбінна чуцён
Суровы, разложысты пошчак
Віхурных і ярасных дзён.
Тых дзён, што вяртаюцца святам
Штогод у наш дом, у наш век.
Паўстаў супраць зла чалавек —
І вечнасць упісвае даты.
У пліты, у календары
І колер дае ім чырвоны,
І —
ўсе дарагія імёны
У промнях святочных зары,
Мы ім абавязаны сёння
За ружу,
бальшак,
салаўя,
Што ёсць у нас песня свая,
Свой клопат на ўспешчаных гонях,
Што ў святы на плошчу заўжды
Прыходзім мы мірнай калонай...,
...Імёны ж
вялі батальёны
Сваіх камунараў сюды.
Пад позіркам ясным і мужным
На Ленінскай плошчы маўчу
І бачу не лаўры, не ружы —
Цярновая праўда ўваччу.
Сібір...
Закардонныя мукі...
І тайныя змовы — забіць!..
Ды ўскінула Будучынь рукі —
Жыць Леніну! Партыі жыць!
А поруч сіпелі, як гады,
Адводзілі праведны час:
«Няма ў нас узяць каму ўладу,
Няма такой партыі ў нас...»
І свет азірнуўся на голас,
Убачыў сваю маладосць —
Грымела і пела наўкола:
«Ёсць!
Гэткая партыя ёсць!».

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

БУКЕТ БЕЛЫХ АСТРАЎ

У левай руцэ ва Уладзіміра Ільіча ліст паперы. І гэты ліст, і выраз твару Леніна, і поза, у якой адлюстраваў яго мастак,— усё гаворыць пра тое, што ён кудысьці спяшаецца.

Але жанчын, якія яго абступілі, слухае ўважліва. Твары жанчын зяюць ад радасці. Адна з іх падае Леніну кветкі. Уладзімір Ільіч усміхаецца.

Гэты эпізод з жыцця вялікага правадыра працоўных усяго свету назаўсёды «спыніў» для нас і будучых пакаленняў мастак П. Васільеў у шырока вядомым малюнку-кампазіцыі «У. І. Ленін сярод дэлегатак першага Усерасійскага з'езда работніц у Маскве. 19 лістапада 1918 года».

Палатно створана на падставе сапраўднага гістарычнага факта. Камуністычная партыя, згуртоўваючы вакол сябе ўсё лепшае і прагрэсіўнае, разгарнула тытанічную дзейнасць па мабілізацыі мас на адпор ворагу. Асаблівая ўвага звярталася на выхаванне жанчын, прыцягненне іх да актыўнага сацыялістычнага будаўніцтва. Масавае ўцягненне жанчын у дынамічную, стваральную дзейнасць мела велізарнае народнагаспадарчае і сацыяльна-палітычнае значэнне. Гэта вырашала праблему фактычнага раўнапраўя і разняволення жанчын, асабліва сялянак, якія прадстаўлялі самую шматлікую частку сельскага насельніцтва. Але справа гэта была новай, цяжкай.

Пры царызме працоўныя жанчыны не мелі ніякіх палітычных і грамадзянскіх правоў. Асабліва ў цяжкім становішчы знаходзіліся беларускія жанчыны, дзе капіталістычная эксплуатацыя дапаўнялася нацыянальным прыгнечаннем.

Савецкая ўлада, ліквідаваўшы старыя законы, вызваліла жанчын і зрабіла іх раўнапраўнымі грамадзянкамі Краіны Саветаў. Цяпер трэба было практычна ажыццяўляць новыя гуманныя законы першай у свеце маладой дзяржавы рабочых і працоўных сялян. З гэтай мэтай і быў праведзены ў лістападзе 1918 года Першы Усерасійскі з'езд работніц і сялянак. Беларусь паслала на з'езд васемнаццаць дэлегатак, пяць з іх былі віцябчанкамі.

«Пяці дэлегаткам, абраным ад віцебскай канферэнцыі, быў дадзены наказ актыўна ўдзельнічаць у рабоце з'езда, — успамінае адна з віцебскіх дэлегатак Е. І. Коган-Пісманін, — асабіста перадаць Уладзіміру Ільічу прывітанне ад віцебскіх работніц».

Пасля некалькіх дзён цяжкай дарогі беларускія дэлегаткі, нарэшце, дабраліся да Масквы. Горад ад сцягоў і палотнішчаў здаваўся святочным, хаця жыў ён напружаным і цяжкім жыццём. У паноях, дзе размясціліся дэлегаткі з Беларусі, было сыра і прахалодна. Але яны не зважалі на тое. Такога яшчэ не было! У Маскву сабраліся сотні працаўніц з усіх канцоў краіны. Маладыя работніцы і ўбеленыя сівізной актывісткі з прадпрыемстваў і паветаў, жонкі чырвонаармейцаў і прадстаўнікі савецка-партыйных устаноў — вось далёка не поўны пералік складу з'езда. Многія з дэлегатак, трапіўшы ў такую незвычайную абстаноўку, саромеліся і трымаліся асобнымі групкамі. Уголас чыталі брашуры з «Дэкларацыяй правоў працоўнага і прыгнечанага народа» і Дэкрэтамі аб міры, аб зямлі, лозунгі і заклікі аб раўнапраўі жанчын, аб іх ролі ў будаўніцтве сацыялізму.

Цэнтральнай падзеяй з'езда, зразумела, з'явілася выступленне Леніна. Усе з нецярпеннем чакалі гэтай урачыстай хвіліны. Уладзімір Ільіч узышоў на сцэну сваёй хуткай хадою. Зала сустрэла яго вельмі цёпла. Апладысменты і авацыя працягваліся некалькі хвілін. Уладзімір Ільіч узняў руку, і ў зале ўсталявалася цішыня. Ён падышоў да трыбуны, выняў з кішэні пінжака некалькі спісаных лісткоў і пачаў гаварыць. Голас яго, бледнасць твару гаварылі аб вялікай стомленасці. Прайшло ўсяго тры месяцы пасля зладзейскага замаху...

— Таварышы, у некаторых адносінах з'езд жаночай частні пралетарскай арміі мае асабліва важнае значэнне, паколькі жанчыны ва ўсіх краінах цяжэй за ўсё прыходзілі ў рух. Не можа быць сацыялістычнага перавароту, калі велізарная частка працоўных жанчын не прыме ў ім значнага ўдзелу.

Уладзімір Ільіч зрабіў невялікую паўзу, паглядзеў на першыя рады дэлегатак, працягваў:

— Ва ўсіх цывілізаваных краінах, нават самых перадавых, становішча жанчын такое, што нездарма іх называюць хатнімі рабынямі. Ні ў адной капіталістычнай дзяржаве, нават самай свабоднай рэспубліцы, няма поўнага раўнапраўя жанчын. Задача Савецкай рэспублікі — у першую чаргу знішчыць усе абмежаванні правоў жанчын.

Далей У. І. Ленін гаварыў аб адмене пралетарскай уладай устарэлых правілаў, якія прыніжаюць годнасць жанчын, аб разняволенні сялянак, аб барацьбе з рэлігійнымі забабонамі.

— Да гэтага часу ніякая рэспубліка не магла вызваліць жанчыну. Савецкая ўлада дапамагае ёй. Наша справа непераможная, паколькі ва ўсіх краінах узнімаецца непераможны рабочы клас. Гэты рух азначае рост непераможнай сацыялістычнай рэвалюцыі, — закончыў Уладзімір Ільіч сваю прамову пад працяглыя апладысменты. Пасля яго выступлення работніцы заспявалі «Інтэрнацыянал».

Зала забурліла. «Ура Леніну!», «Няхай жыве сацыялізм!», «Няхай жыве правадыр рэвалюцыі!», — неслася з усіх бакоў. У. І. Ленін, закончыўшы сваё выступленне, пайшоў да выхаду. Яго чакалі тэрміновыя справы ў Саўнаркоме.

Віцябчанкі паспяшаліся ўслед за ім. Але выбрацца з залы было не так проста. Уладзімір Ільіч падыходзіў ужо да дзвярэй, калі да яго наблізіліся нашы зямлячкі. Убачыўшы іх, У. І. Ленін спыніўся. Ад хвалявання жанчыны не ведалі, што і рабіць. Потым, асмялеўшы, адна з іх падала У. І. Леніну букет белых астраў.

— Гэта вам, Уладзімір Ільіч, ад работніц горада Віцебска,— сказала яна.

«Уладзімір Ільіч выдатна разумеў нашу сарамлівасць, — успамінае далей Е. І. Коган-Пісманін. — Вельмі проста, з мілай сваёй усмешкай і вясёлымі іскрынкамі ў вачах, ён паглядзеў на нас, маладых дзяўчат, папрасіў перадаць прывітанне віцебскім работніцам і пажадаў ім поспехаў і здароўя. Развітваючыся, Ленін моцна паціснуў нам рукі. Ніколі мне не забыць ленінскага поціску рук».

Зразумела, у якім прыўзнятым настроі вярталіся дэлегаткі дамоў. Вестка аб іх сустрэчы з Леніным хутка разнеслася па горадзе і губерні. З прадпрыемстваў і ўстаноў, паветаў і валасцей паступалі шматлікія просьбы расказаць аб гэтай сустрэчы. І яны расказвалі. Часам даводзілася выступаць у дзень па некалькі разоў. Цяпло рук правадыра сагравала іх сэрцы.

У. ЯКУТАЎ.

З крыніцы народнай

Літаратура для дзяцей

Працяг размовы

У ДУХОЎНЫМ жыцці дзіцяці побач з іншымі жанрамі вельмі важнае месца займаюць загадкі. Яны даюць магчымасць маленькаму чалавеку эмацыянальна, вобразна спазнаваць свет ва ўсіх фарбах, гуках, колерах, выклікаюць любоў да роднага слова, раскрываюць «сакрэты» пранікнення ў яго сэнсавыя, вобразна-метафарычныя значэнні. Загадка здольна абудзіць творчае ўяўленне, развіць разумовыя здольнасці. Прыемна, што аўтарскія загадкі, а таксама апрацоўкі фальклорных твораў гэтага жанру, у апошні час даволі часта выдаюцца асобнымі кніжкамі, змяшчаюцца ў перыёдыцы.

Вельмі папулярныя сярод малышоў загадкі В. Віткі. І не выпадкова. Яны не толькі адказваюць на пытанні «што гэта?», «адкуль гэта?», «для чаго гэта?», але і адначасова далучаюць маленькага чытача да сапраўднай паэзіі.

Загадкі В. Віткі прасякнуты добрай усмешкай. У іх шмат гумару, вясёлай выдумкі. Гэта дазваляе паэту глыбей данесці да дзіцяці змест твора, яго ідэйна-эстэтычныя вартасці.

Шырока ўжываючы слова ў яго пераносным значэнні, выводзячы думку дзіцяці «з рамак звычайных, вялых асацыяцый» (М. Рыбнікава), В. Вітка ўдала падбірае трапныя параўнанні, якія метафарычна, але разам з тым дакладна і ў меру поўна ўказваюць на сапраўдныя прыкметы з'яў або прадметаў, што трэба адгадаць. Напрыклад, загадка «Конь»: «Такі рахманы, такі паслухмяны, сам гліняны, рот палымяны, у горле агонь, — які гэта конь? Хто цэлую зімку гладзіць яго спінку?» Літаральна ўсё, што сказана ў творы пра печ, у пэўным сэнсе ўласціва ёй на самай справе.

Некаторыя з твораў носяць выразна акрэслены жартоўны характар. Аднак і яны адыгрываюць важную ролю ў эстэтычным выхаванні маленькага чалавека, таму што выпрабоўваюць яго розум, кемлівасць, мастацкі густ, вучаць назіральнасці: «За тры вазы дзеразы купіў тата тры казы. А ці кожнаму вядома — па чым козы йшлі дадому?» Па чым жа? Адказ просты — па дарозе. Здавалася б, самы звычайны гарэзлівы жарт. Але пакладзены на мову паэзіі, ён прыносіць дзіцяці эстэтычную насалоду, абуджае ў яго фантазію, гумар, пачуццё слова. Міжволі ўспамінаецца выказванне М. Горкага аб тым, што «дзіця да дзесяцігадовага ўзросту патрабуе забаў, і патрабаванне яго біялагічна законна. Яно хоча гуляць, яно гуляе ўсім і пазнае акаляючы яго свет перш за ўсё і лягчэй за ўсё ў гульні, гульнёй».

Менавіта гарэзлівы жарт, добразычлівы гумар, трапная выдумка ляжаць у аснове большасці самабытных вершаваных «матэматычных» Віткавых загадак-задачак («У кожным кутку», «У старога вераб'я», «Колькі сарок?»), загадак Р. Барадуліна («Колькі засталося?», «Як быць?», «Колькі кошак?»), А. Дзеружынскага («Браты-памочнікі», «Колькі?»). Творы гэтыя не толькі вобразна, інтрыгуючы, развіваюць матэматычныя здольнасці, лагічнае мысленне дзяцей, але і ўдасканальваюць іх паэтычны слых, чуйнасць да музыкі слова.

Добрым густам, паэтычным майстэрствам вызначаюцца загадкі Н. Гілевіча — арыгінальнага дзіцячага паэта і ўдумлівага даследчыка вуснай народнай творчасці. Добрае веданне фальклору, тонкае адчуванне мастацкага слова спадарожнічаюць пісьменніку ў стварэнні па-бацькоўску пяшчотных і цёплых, па-народнаму мудрых і вобразных вершаваных загадак. Яны вучаць дзяцей мысліць асацыятыўна, прыкмячаць у з'явах, прадметах і рэчах яркія, характэрныя рысы, як напрыклад, «Чырвонае цельца, каменнае сэрца, вінная на смак, а завецца як?» Паэт удала падабраў найбольш характэрныя прыкметы, адлаведныя і смаку, і знешняму выгляду вішні. Пазбягаючы «лабавога» апісання прадмета, сціслага карыстаючыся выяўленчымі сродкамі, ён ажыўляе погляд дзіцяці, дае магчымасць успрымаць наваколле маляўніча, у незвычайным асвятленні.

У загадках Н. Гілевіча ўвогуле заўсёды прысутнічае багаты метафарычны вобраз, разгадка якога звычайна прыносіць дзіцяці эмацыянальную насалоду. Так, творчая фантазія аўтара малюе месяц-маладзік крутарогім бычком. Яму, гарэзе, непатрэбны дарогі. Спрытны, жвавы, ён усюды пойдзе — «у лесе не трэсне, на плёсе не ўсплёсне, праз возера скочыць — капыткоў не памочыць». Па сутнасці, перад намі малюнак прыроды, створаны надзвычай эканомнымі і ёмістымі, сакавітымі мазкамі.

Загадкі Н. Гілевіча багатыя на вобразна-паэтычныя ўвасабленні. Нават газета ў яго набывае рысы жывой істоты. Яна нагадвае паэту белага голуба: «Белы голуб прыляцеў, белым крыллем шалясцеў і з усёй зямлі навіны расказаў за паўгадзіны».

Паэт шырока і да месца карыстаецца гіпербалізаванай метафарай, якая добра развівае фантазію дзіцяці. У гэтым сэнсе паказальная загадка аб мурашніку. Яна дазваляе ўбачыць, адчуць паэзію там, дзе яе нават не чакаеш: «Касцёр пад дрэўцам не гарыць, кацёл не грэўся, а кіпіць, кіпіць, кіпіць, не выкіпае, кранеш рукою — апякае».

Зрэшты, у загадках Н. Гілевіча арганічна знітавана дыдактычна-адукацыйная і маральна-этычная функцыя твораў гэтага жанру. Яны неназойліва ўцягваюць дзіця ў гульню, у якой яно вучыцца думаць, аналізаваць, параўноўваць і супастаўляць розныя прадметы і з'явы, самастойна пазнаючы акаляючую рэчаіснасць:

Па зямлі я не хаджу
І на неба не гляджу,
Вочы маю — не міргаю,
Маю рот — не гавару,
Ёсць і хвост, але не звер я
І не птах, хоць ёсць і пер'е,
Хаты зроду не будую,
Ды ні трохі не бядую.

Несумненна, каб здагадацца, што гаворка ідзе пра самую звычайную рыбу, маленькаму чалавеку трэба будзе актывізаваць увесь запас сваіх ведаў, звярнуцца да паэтычнай фантазіі.

Адметнасць шэрагу загадак Н. Гілевіча заключаецца і ў тым, што яны нярэдка адлюстроўваюць прадмет або з'яву ў развіцці, у дыялектычным пераходзе з адной якасці ў другую. Такімі, прынамсі, з'яўляюцца загадкі пра гаршчок і пра лён, у якіх захапляюча апісаны працэс вырабу з гліны гаршка, вырошчвання і апрацоўкі льну.

Самабытна напісаны «Загадкі на градках» Р. Барадуліна, у якіх непарыўна зліліся эстэтычны і пазнавальны элементы. Творы для дзяцей Р. Барадуліна вызначаюцца назіральнасцю, прастатой і дасціпнасцю. Гарэзлівыя, забаўныя, з жартаўліва-ўсмешлівымі інтанацыямі, яны актыўна спрыяюць дзіцячаму пазнанню свету, вымагаюць творчага разумовага напружання. Па-майстэрску выкарыстоўваючы інтрыгуючы сюжэт, уводзячы ў твор яркія мастацкія вобразы, каламбуры, нечаканыя метафары, паэт па-новаму адкрывае дзецям знаёмыя рэчы. І што цікава: ён запрашае маленькіх зірнуць на гэтыя рэчы з новага — паэтычнага — боку. Ці не сапраўдным цудам паэзіі зрабілася цыбуля пад пяром майстра-чараўніка?

От бабуля важна села
І глядзіць навокал смела.
У зямлю схавала лапаць.
Як зачэпіш,
Будзеш плакаць.
Гэта злосная бабуля
называецца...
(цыбуля).

У большасці выпадкаў слова-адгадка падрыхтоўваецца Р. Барадуліным на працягу ўсяго твора і віртуозным гукапісам, які цудоўна імітуе зашыфраваны прадмет. Вось, у прыватнасці, загадка пра гарбуз:

Гэта што за важны туз,
Хвост зялёны,
Чэпкі вус?
Усім вядомы
Карапуз
Пузан Пузанавіч...
(Гарбуз).

Гэты ж мастацкі прыём, калі адгадка рыфмуецца з словам перадапошняга радка, таксама з поспехам выкарыстаў В. Зуёнак. Яго загадкі ад пачатку да канца насычаны элементамі гульні, наскрозь прасякнуты гумарам, камічнымі сітуацыямі. Не выпадкова сам аўтар назваў іх загадкамі-перакруткамі, шчыра запрашаючы маленькіх чытачоў дапамагчы яму адшукаць «згубленае» ў творы слова-адгадку.

Паэт тонка адчувае гукі, колеры, фарбы жывой народнай мовы. Ён даволі часта бліскуча абыгрывае ўнутраны сэнс слова-адгадкі: «Я букет хацеў нарваць, ды прыйшлося дзёру даць: сам дзіўлюся, як не з'еў там мяне... ... (Ільвіны зеў)». Загадка ж «Вясною» з лагоднай хітрынкай сведчыць аб тым, што прыемныя сны да янота звычайна прыходзяць у гэтую пару года: «Яноту сніцца добры сон, бо каля носа кветка—... (сон)». А вось у загадцы «На лузе» з добразычлівай усмешкай расказваецца пра лісахвост, які «выратоўвае» куртатых лісіц:

Ганчані лісіц ганялі,
Усім хвасты паадрывалі.
Глянь: куртатыя лісіцы
Бегаюць, дзе каласіцца
Ды ідзе на славу ў рост
У міжтраўі...
(лісахвост).

І яшчэ адна цікавая адметнасць загадак В. Зуёнка: у іх не толькі разнастайныя мастацкія сродкі непасрэдна або ўскосна ўдзельнічаюць у расшыфроўцы ўтоенай птушкі, звера, расліны, але і назва твора. Прынамсі, назвы прыведзеных вышэй загадак падказваюць дзіцяці, што кветка сон цвіце ўвесну, што трава лісахвост расце на лузе...

Як бачым, у загадках В. Зуёнка эстэтычны і адукацыйны змест шчасліва зліліся ў непарыўнае адзінае цэлае.

Вялікае эмацыянальнае і адначасова пазнавальнае значэнне маюць таксама вершаваныя загадкі Е. Лось. Яе «Дванаццаць загадак» — гэта разгорнутыя вобразныя малюнкі месяцаў года. Усе яны метафарычна актывізуюць уяўленні, памяць дзіцяці, развіваюць яго мысліцельныя здольнасці. Загадкі Е. Лось прываблiваюць разнастайнасцю інтанацыйных адценняў, іншасказальнай афарыстычнай мовай. Паэтэса па-майстэрску падабрала словы, якія сэнсава вельмі блізкія да адгадкі, а часам і пераклікаюцца з ёю. Акрамя таго, утоеная назва пэўнага месяца нярэдка сугучна гукавой інструментоўцы ўсяго твора.

Вось загадка пра студзень:

Як гэта называецца,
калі новы год пачынаецца?
Калі поле мяцеліцы студзяць,
маразы траскатнёю будзяць,
калі ў срэбры і свята,
і будзень?

Е. Лось знарок увяла ў тэкст загадкі слова «студзяць», зрабіўшы яго апорным. Яно асацыятыўна выклікае ў дзіцячай памяці назву месяца, у які «поле мяцеліцы студзяць».

Творы Е. Лось па-свойму эстэтычна выхоўваюць маленькага чалавека, прывучаючы яго да самастойнага мастацкага адкрыцця цудаў паэтычнага слова. Адначасова яны выконваюць адукацыйна-дыдактычную функцыю.

Часта радуе, здзіўляе маленькіх незвычайнымі паэтычнымі асацыяцыямі і П. Прануза:

У траве агонь ірдзее,
Не пячэцца і не грэе.
Ён пахучы і прыгожы,
Нават дождж заліць не можа.
І з такіх агнёў-праменняў
Вараць смачнае варэнне.

Так метафарычна апісаў аўтар суніцы. Яго творчая фантазія адшукала дакладныя маляўнічыя параўнанні. Шкада толькі, што часам П. Прануза стварае празмерна расцягнутыя загадкі, як, напрыклад, пра цень. Ён забывае, што творы гэтага жанру павінны быць як мага больш сціслымі, лаканічнымі.

Чароўным хараством метафарычнага вобраза цешаць дзіця многія загадкі В. Жуковіча аб роднай прыродзе з цыклу «Казачны сад». Яны паэтычна ўзбагачаюць эрудыцыю маленькіх, вучаць іх назіральнасці. Безумоўна, у дзіцяці абавязкова ўзнікне жаданне даведацца, што гэта за жоўтае сонейка, ад якога «ідуць белыя промнейкі» (рамонак). Наўрад ці зможа застацца яно абыякавым і да лірычна ўтоеных званочкаў, якія «срабрыстыя, духмяныя, у тугіх лістах схаваныя» (ландыш).

На жаль, менш удаліся В. Жуковічу «Загадкі пра хатнія рэчы». Ім нестае «жывой душы», яркасці і метафарычнасці малюнка, пачуцця гумару. Мяркуйце самі:

Не мароз і не вецер,
А марозіць, гудзе.
Не блукае па свеце —
Ён працуе ў людзей
(халадзільнік).

Не гучаць і многія загадкі У. Карызны. Прычынай таму — апісальнасць, адсутнасць займальнасці, дынамізму дзеяння, гумарыстычнага эфекту:

Прыгожая кветачка
На сонейку млела.
Вова хацеў сарваць —
Яна паляцела
(матылёк).

Рухомасці рытму, маляўнічай выразнасці, афарыстычнасці вобраза — зрэшты, паэтычнага вынаходніцтва нестае і загадкам В. Лаўрыновіча. Аўтар у большасці выпадкаў таксама прымітыўна, каструбаватым вершам пераказвае народныя творы гэтага жанру: «Яго часта просяць, чакаюць, а прыйдзе — хаваецца пачынаюць». А вось як у фальклоры пра дождж: «Мяне ўсе просяць, мяне ўсе чакаюць, а як толькі з'яўлюся, хаваецца пачынаюць».

Агульнавядома, што загадкам уласціва парадаксальнасць і нелагічнасць, неверагоднасць і незвычайнасць суадносін рэчаў, прадметаў і з'яў. Але ўсюды трэба мець пачуццё меры. Неабходна, каб лагічная недарэчнасць метафарычна працавала на загадку, а не замінала асацыятыўнай адгадцы яе, як гэта мае месца ў творах некаторых аўтараў. Нельга забываць залатое правіла: загадка магчыма толькі тады, калі ў ёй метафарычна пералічваюцца рэальныя прыкметы прадмета, калі даюцца ўпаўне рэальныя параўнанні і супастаўленні.

Безумоўна, поспехі ў развіцці вершаванай загадкі для дзяцей на сучасным этапе значныя. Аднак, на жаль, яшчэ не-не ды і сустракаюцца прымітыўныя апрацоўкі фальклорных загадак, падробкі пад іх. І трэба рашуча рабіць заслон пранікненню такіх псеўдапаэтычных загадак у кола дзіцячага чытання, каб не псаваць эстэтычныя густы маленькіх чытачоў.

Радзівальт ЛІТВІНАЎ.

ЯКІ ТЫ, САПРАЎДНЫ ЧАЛАВЕК?

Таццяна ГАРЭЛІКАВА— па прафесіі настаўніца, працуе дырэктарам адной з мінскіх школ. Думаецца, што менавіта гэтая акалічнасць у многім паўплывала на тое, што ў творчасці сваёй малады аўтар асноўную ўвагу ўдзяляе праблемам маральна - этычнага плана, пытанням фарміравання чалавека як асобы, грамадзяніна, будучага актыўнага будаўніка камуністычнага грамадства. Меркаваць, што гэта менавіта так, дае ўсе падставы першая кніга прозы пісьменніка, якая адрасуецца дзецям старэйшага школьнага ўзросту, менавіта таго ўзросту, з якога пачынаецца першая сцяжынка з юнацтва ў сталасць.

І апавяданні, якія склалі асноўны змест зборніка, і аповесць, што дала яму назву, тэматычна блізкія між сабой — у тым сэнсе, што з твора ў твор аўтар імкнецца адказаць на пытанне, якім павінен быць сапраўдны чалавек. Менавіта сапраўдны, і азначэнне гэтае хочацца падкрэсліць: тут маецца на ўвазе сацыяльная актыўнасць асобы, яе маральная чысціня, шырыня кругагляду, вернасць ідэалам дабра, справядлівасці, уменне выбраць правільны жыццёвы кірунак. Пра гэта думаў і вялікі педагог сучаснасці В. Сухамлінскі, калі пісаў: «Каб маральны ідэал стаў рэальнасцю, трэба вучыць чалавека правільна жыць, рабіць правільныя ўчынкі, правільна ставіцца да людзей і да самога сябе».

Нялёгка даюцца першыя самастойныя крокі Нікі, гераіні аповесці «Дзе лес шуміць», а, здавалася б, у жыцці ў яе павінна быць усё проста і ясна. Дзяўчына з залатым медалём закончыла сярэднюю школу, паступіла ў радыётэхнічны інстытут, на «выдатна» здала першую ў сваім жыцці студэнцкую сесію. Аднак праходзіць пэўны прамежак часу, і Ніка пачынае заўважаць, што тая прафесія, якую абрала яна, ёй не падабаецца...

Гераіня Т. Гарэлікавай пакідае інстытут, знаходзіць у сабе сілы не пайсці насуперак уласнаму сумленню. Безумоўна, усё гэта ёй даецца нялёгка. Баіцца пра сваё рашэнне сказаць маці, каб не засмуціць яе. Не разумее Ніку і Сяргей, з якім яна сябравала. Але дзяўчына добра ведае, што самае важнае прыняць тое рашэнне, якое ты лічыш адзіна правільным.

Мы сустракаемся з Нікай у піянерскім лагеры, дзе яна працуе важатай. Вядома, ёсць і тут свае цяжкасці, але дзяўчына шчаслівая, бо знайшла сваё сапраўднае прызванне.

Аўтар імкнецца ўважліва паставіцца да ўнутранага свету гераіні, адчуць тое, што рухае яе ўчынкамі. На жаль, гэта ёй удаецца не заўсёды. Месцамі ў аповесці заўважаецца своеасаблівы хуткапіс, не адчуваецца дакладнай псіхалагічнай матывіроўкі таго, што адбываецца. Таму хуткае сталенне Нікі крыху здзіўляе: яна неяк раптоўна сцвярджае сваё «я». Але ж былі і расчараванні, і няўменне знайсці кантакт з дзецьмі (трэці атрад лічыўся ў лагеры самым горшым), і няўпэўненасць у самой сабе.

Праўда, усё гэтыя выдаткі — вынік нявопытнасці маладога аўтара ў жанры аповесці. Больш свабодна Т. Гарэлікава адчувае сябе ў апавяданнях. Пабудаваныя на традыцыйных сюжэтах, яны прываблiваюць перш-наперш значнасцю пастаўленых праблем, спробай прасачыць тыя ўнутраныя зрухі, што адбываюцца ў чалавечай душы ў момант вялікага маральнага напружання, калі трэба зрабіць нейкі важны крок у жыцці.

Перад неабходнасцю прыняць самастойнае рашэнне апынулася і Юлька, дзесяцікласніца з апавядання «Заўтра экзамен». Да гэтага дня ў яе ўсё было проста і ясна. Яна добра вучылася, бацькі марылі бачыць сваю дачку студэнткай медыцынскага інстытута. І вось жаданне аднакласнікаў пасля выпускных экзаменаў усім класам падацца на сібірскую будоўлю. Дзяўчынка не можа пайсці насуперак волі класа. Яна дае згоду, пакуль што несвядома. Аднак праходзіць некалькі дзён, і Юлька разумее, што яе месца толькі там, на пярэднім краі, дзе яна зможа адчуць сябе сапраўдным чалавекам, паверыць ва ўласныя сілы і магчымасці.

Здараецца і так, што чалавек ужо вызначыў сваю жыццёвую дарогу, а вось пазіцыю, пазіцыю асобы, грамадзяніна дакладна акрэсліць не можа. Адсюль пэўная душэўная неўтаймаванасць, занепакоенасць, трывога і роздум. Таму можна зразумець Юрку з апавядання «Я ўсё помню, мама», які толькі тут, у матчынай хаце, неяк па-новаму, бы староннімі вачамі пачынае глядзець на тое, як жыў раней. І адчувае юнак, што многае ім было зроблена не так, што часта жыў ён як набяжыць, мала клапоцячыся пра заўтрашні дзень.

Пытанні ўзаемаадносін бацькоў і дзяцей, пытанні спрадвечныя і ў той жа час вечна новыя, узнімаюцца ў апавяданні «Свята» — як нам здаецца, лепшым у зборніку.

Здавалася б, Піліпаўна, якая працуе вахцёрам у студэнцкім інтэрнаце, павінна адчуваць сябе шчаслівай. Ёсць у яе неблагая работа, дачка, маленькі ўнучак. Дык што ж яшчэ патрэбна чалавеку, чаго не хапае яму ў асабістым жыцці?! Мала-га, але разам з тым, калі падумаць уважліва, дык многага — душэўнай дабраты і чуласці.

«Добрая» дачка Піліпаўны (яе мы ў апавяданні так і не бачым) на самай справе чэрствая і эгаістычная, бо забывае пра сваю маці, рэдка наведвае яе, не заходзіць нават у святы. А жывуць жа яны ў адным горадзе!

Т. Гарэлікава своечасова абрывае дзеянне. У гэтай недагаворанасці — свой псіхалагічны разлік, накіраваны на тое, каб адразу знайсці ў чытача субяседніка, які ўжо адзін, застаўшыся сам-насам са сваімі думкамі, змог бы паразважаць над узнятымі аўтарам пытаннямі.

Супроць чалавечай няўважлівасці, душэўнай абыякавасці выступае пісьменніца ў апавяданні «Соўка», напісаным на матэрыяле цяжкага пасляваеннага маленства. Мяшчанства, заспакоенасць, прагу любымі спосабамі жыць лепш за іншых яна асуджае ў «Скарбе».

Кожны з твораў, што ўвайшоў у першую кнігу Т. Гарэлікавай, па-свойму цікавы, у кожным з іх адчуваецца аўтарскае жаданне пагаварыць пра набалелае. Гэтая занепакоенасць чалавечымі лёсамі не можа не радаваць. Гэтаксама радасна і тое, што пісьменніца ўжо на пачатку творчай дарогі выразна вызначыла кола тых праблем, якія асабліва хвалююць яе.

З другога боку, «звужанасць» гаворкі прыводзіць да таго, што апавяданні ў нечым паўтараюцца.

Т. Гарэлікавай на будучае хацелася б параіць не проста расказваць пра тыя ці іншыя ўчынкі людзей, а глыбей даследаваць іх, танчэй пранікаць у псіхалогію герояў, спрабаваць зразумець вытокі таго, што вядзе да яркага выяўлення чалавечай індывідуальнасці. Не рытарычна даводзіць пэўную ідэю, якой бы важнай і значнай па сваім змесце яна ні была, а суадносіць усё гэта з самой логікай падзей, з тым адзіным правільным рашэннем, якое абавязкова павінен прыняць герой па ходу дзеяння.

Святлана ХОРСУН.

Т. Гарэлікава. Дзе лес шуміць. Аповесць і апавяданні. Для дзяцей старэйшага школьнага ўзросту. Мінск. «Мастацкая літаратура», 1978.

ДУМКА ЧЫТАЧА

ЗАСВЕДЧАНА ПЕРАЖЫТЫМ

Рабочая тэма ў беларускай, як і ва ўсёй савецкай літаратуры, у апошнія гады атрымлівае ўсё большае распаўсюджанне. Часцей і смялей за адлюстраванне яе бяруцца не толькі сталыя пісьменнікі, але і творчая моладзь. Прыклад гэтаму і нарысы, апавяданні Івана Шальманава, а таксама яго аповесць «Цагельня», якая напісана на дакументальным матэрыяле і мае акрэслены аўтабіяграфічны пачатак.

Аўтар яе працаваў на адным з цагельных заводаў, і па сённяшні дзень не парывае сувязей з сябрамі рабочага юнацтва. Уласна перажытае, якое асэнсавана з пазіцыі сённяшняга дня, і дазволіла яму стварыць вобраз нашага маладога сучасніка Косці Пальцімовіча, намаляваны з добрым веданнем заводскага жыцця.

Косця — учарашні воін, выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Неблагі спартсмен, адукаваны і валявы чалавек. Служба ў арміі надала яму яшчэ болей душэўнай сілы і маральнай чысціні. Вось чаму Пальцімовіч, апынуўшыся на сумнай і няветлай сталічнай ускраіне, адразу асіліў «халоднае, нядобрае прадчуванне», — не збочыў, не адмовіўся ад уласных планаў — папрацаваць, а пасля паступіць у інстытут.

Празаік прасочвае шлях маральнага і грамадзянскага сталення свайго героя, раскрывае яго жыццёвыя ідэалы.

Аповесць «Цагельня» пра тое, як малады чалавек становіцца сапраўдным рабочым, як у паўсядзённым жыцці ён сцвярджае сваё асабістае і грамадзянскае «я». Працэс гэты, безумоўна, зусім няпросты, а па-свойму складаны, адказны. Тым больш радасна ўсведамляць, што І. Шальманаў паспяхова справіўся з пастаўленай задачай.

Л. КРОЦІКАЎ,
навуковы супрацоўнік філіяла Літаратурнага музея Я. Купалы.

в. Ляўкі,
Аршанскі раён.

КРОК ДА СТАЛАСЦІ

Павел Марціновіч у літаратуры заявіў пра сябе параўнальна нядаўна, але досыць упэўнена. Яго вершы змяшчаліся ў газетах і часопісах. Лепшыя з іх увайшлі ў першы зборнік маладога аўтара «Прадвесне». І вось новая кніжка «Час бурштыну», якая складаецца з трох раздзелаў: «Калі даспелі гронкі арабіны...», «Трапеча ён, нібы асенні ліст...», «Жаданняў нашых сонечны адбітак». У кнізе вершы на лірычныя тэмы розных напрамкаў і ўражанняў.

Калі ж гаварыць аб галоўнай тэме, дык гэта роздум аўтара над тым, што было і ёсць у яго жыцці. Праз лірычнае «я» П. Марціновіч сцвярджае гуманістычны пафас, дабро, высокія маральна-этычныя ідэалы нашага сучасніка:

Ісці, пакуль вятры не адгулі,
І верыць, і змагацца.
І з казачнаю шчодрасцю зямлі
Зраўняецца душы маёй багацце.

Лірычны герой паэта тонка ўспрымае акружаючае яго асяроддзе. Няхай гэта замілаванне прыродаю, ці роздум над убачаным — заўсёды адчуваецца імкненне пранікнуць у сутнасць той ці іншай з'явы. Асацыяцыі, народжаныя вобразным мысленнем аўтара, свежыя і непаўторныя па сваёй напоўненасці.

Паэт хораша піша пра тое, што хвалюе нашага сучасніка, услаўляе яго імкненне да маральнай дасканаласці і сацыяльнай актыўнасці. Прага навізны, новых адкрыццяў пастаянна напаўняе яго-нае сэрца, жаданне прыносіць карысць іншым людзям. Адзін з вершаў зборніка называецца «Апантанасць». Усяго некалькі радкоў у ім, а сказана шмат. І пра душэўнае абнаўленне, і пра жаданне заўсёды заставацца маральна чыстым:

Апантанасць, шумлівае голле сваё разгарні,
Зазвініць хай яно ў заінелым паветры пакоя
Звонам тысяч дажджын красавіцкіх.
Ты іх страсяні
На душу.

Мне, чытачу, вельмі імпануе таксама паэтава жаданне штодня прыносіць карысць людзям, прысвячаць сябе патрэбнаму занятку. Пра гэта цікавы верш «Праца»:

Працай (хай самавіта
Каласяцца радкі)
Засланюся, як жытам,
Густым, трапяткім.

Нягледзячы на невыразнасць некаторых твораў, новая кніжка маладога аўтара бачыцца нам крокам наперад у яго-най творчасці.

Мікола ДУБОЎСКІ,
старшы інструктар упраўлення распаўсюджання друку.

Рэпертуарная старонка

Пастанова ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму развіццю самадзейнай мастацкай творчасці» — яшчэ адзін яркі прыклад клопатаў нашай партыі, дзяржавы аб духоўным побыце савецкіх людзей, росквіце народных талентаў.
Сёння газета «Літаратура і мастацтва» друкуе «Рэпертуарную старонку» ў дапамогу аматарам мастацкай самадзейнасці. Рэдакцыя спадзяецца, што самадзейным спевакам, танцорам, артыстам гэтая старонка дапаможа ў іх творчасці.
Мы чакаем, дарагія чытачы, вашых пісьмаў з заўвагамі, — якой бы хацелася б вам бачыць гэтую старонку?

ПАЦАЛУНАК

Словы У. КАРЫЗНЫ *Музыка І. ЛУЧАНКА*



Ні ў цёмным садзе
І ні ў чарніцах
Да вуснаў мілай
Не даступіцца.
То іх затуліць
Яна рукою,
То штосьці шэпча — 2 разы
Табе такое...
І не паспееш
Пацалавацца.
А яна будзе
Яшчэ смяяцца.
Ну, што ж, калі ўжо
Няма ў нас згоды,
Дык, можа, пойдзем — 2 разы
Адведаць мёду.

У любай вусны
Пасаладзелі.
Мінутай пчолы
Паналяцелі.
Ля самых вуснаў
Яны лятаюць.
«Цалуй, міленькі,
Бо закусаюць!»
Ля самых вуснаў
Яны лятаюць.
«Не бойся, міла,
Не закусаюць!»

Валянцін ЛУКША

ТАВАРЫСКІ СУД

Камедыя

Дзейныя асобы:

ЯУХІМ ЯУХІМАВІЧ ДОЎБНЯ — камендант маладзёжнага інтэрната.
ДОМНА — яго жонка.
ВОЛЬГА — паштарка.
ІЛЬЯ,
ДАБРЫНЯ,
АЛЯКСЕЙ — браты-мантажнікі.

...З вокнаў мураванага гмаха струменіць музыка, тут, у адным з пакояў маладзёжнага інтэрната, на поўную магутнасць уключана радыёла — гучыць фрагмент з оперы «Кармэн». Ля паркана, які ашчэрыўся, апяразваючы інтэрнат, шчыруе Яўхім Доўбня — плюне на цвічок, прыб'е малатком штыкеціну, потым бярэцца за другі.

ДОЎБНЯ (падпявае). Тарэадор, смялей!.. Ла-ла-лала... Тарэ-а-дор, Та-рэ-а-дор... (Узрадавана.) Вось і апошні цвічок забіты-закалочаны. Цяпер аматары геаметрыі не будуць, дзе падумаецца, сцежкі-дарожкі пракладваць... (Кідае малаток у скрыньку.) Не будуць! Цяпер, каб да сябе ў пакой трапіць, ім трэба будзе цэлы квартал абысці. (Пляскае ў далоні.) Э-эх, парканчык-парканок, паслужы мне, галубок! (Разважае.) Колькі разоў даводзіў домакіраўніцтву: каб людзі па газонах не гойсалі, газоны трэба лік-ві-даваць! (Усміхаецца.) Калі ж не будзе газона, як па ім хадзіць-гойсаць? То-та! Мне кажуць: а далей? Далей, што рабіцьмем? Далей? Ведаю, што далей. (Смяецца, спявае.)

Пасею гурочкі
Нізка над вадою,
Сама буду паліваці
Дробнаю слязою.
Выраслі гурочкі
У чатыры радочкі,
Не бачыла міленькага
Чатыры гадочкі...

Вы спытаеце: а што, гурочкі маюць меншую прыцягальную сілу, чым канюшына, райграс, цімафееўка, браткі? Не бяруся я сцвярджаць, што меншую, але дакладна ведаю — каб не было шкоды гароду, яго трэба а-пар-ка-ніць! Э-эх, парканчык-парканок, паслужы мне, галубок! (Зноў пляскае ў далоні.) Навошта, каб наша савецкая зямля пуставала?.. Няхай кожны яе сантыметр працуе на будучыню! (Запытальна ўглядаецца ў залу). А што, можа, я няправільна разумею барацьбу за камуністычны быт? Што канюшына? Што райграс? Што цімафееўка? Што браткі?.. Траўка... Кветачкі. Ды й толькі! М-мяшчанства! Во-во, мяшчанства! А гурочкі? Цыбулька? Бульбачка? Гэта ўжо так сказаць, матэрыяльныя каштоўнасці... Самому будзе заліцца — на базар звязу. Народу нашаму спатрэбіцца.. На-ро-ду. (Спявае.)

Пасею гурочкі
Нізка над вадою,
Сама буду паліваці
Дробнаю слязою.
Выраслі гурочкі
У чатыры радочкі,
Не бачыла міленькага
Чатыры гадочкі...

Нечакана паяўляецца Домна, прыслухоўваецца, рашуча падыходзіць да Яўхіма.

ДОМНА. Рана, пташачка, заспявала. Рана, Яўхімка, рана. Скончыў справу — гуляй на славу. Вось каб як я, мой любы, патоўкся. (Шамаціць паперай, разгортвае пакунак.)

ЯУХІМ (гуліва):

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Калі каля корпуса
Парадак іздзець!..
Чаму ж мне...

ДОМНА (перабівае). Годзе, Яўхімка, сціхні. А то, як тая сарока. Глядзі і дзівіся. Я вунь усё пра дом клапачуся. Усё па гаспадарцы. А ты смешачкі-папевачкі! Сорам!.. Мне дык глядзі, якую крушонніцу крышталёвую пашчасціла прыкупіць! А магло ж свята ў нас з табой быць яшчэ большае каб не адну толькі вырвала. Шкада.

ЯУХІМ (запытальна). Крушонніцу? А гэта для чаго? А, Домначка?.. Для чаго?

ДОМНА. Для крушону, казалі... (Адхінаецца.) Што ты на мяне так глядзіш? Усе бралі, і я ўзяла, і я ўзяла. Не дыназаўра ж я ў хату на матузку вяду. Крышталь! Усімі колерамі вясёлкі пераліваецца.

ЯУХІМ. Крушонніца.

ДОМНА. Яна, даражэнькая. Шэсцьсот рублікаў, як лёду, Яўхімка.

ЯУХІМ (хапаецца за галаву). Шэсцьсот? Ратуйце мяне, людзі добрыя!

ДОМНА (уладарна). Ціха, замоўкні! У гаспадарцы, Яўхімка, усё можа спатрэбіцца.

ЯУХІМ (чухае патыліцу). Ты мне прабач, Домначка, а з чым тэты крушон ядуць? Га-а, калі не сакрэт? З чым, Домначка?

ДОМНА. З чым, з чым... А з тым і ядуць... І не задавай дурных пытанняў. Разумнік, бачыце, знайшоўся! З чым ядуць? Многа будзеш ведаць...

ЯУХІМ. Хутка пастарэеш...

ДОМНА. Во-во! З чым ядуць... Вось пастаўлю на стол, тады і даведаешся з чым. А то на вуліцы яму ўсё тут і выкладвай.

ЯУХІМ (смяецца). Не ведаеш навват, а шкадуеш, што яшчэ адну не набыла гэтую... крушонніцу.

ДОМНА. Не адну, а і дзве б не пашкодзіла яшчэ прыкупіць. Табе гэтага не зразумець, Яўхімка.

Выходзіць Вольга, яна спыняецца, прыслухоўваецца да размовы, крыху адступае назад, каб яе не заўважылі.

ЯУХІМ. Куды нам! Але годзе, годзе.

ДОМНА (узнёсла). Уяўляеш, галубок, адна крушонніца — для гасцінай, другая — для кухні...

ЯУХІМ (смяецца). Трэцяя — для спальні.

ДОМНА. Не кпі. Разумнік знайшоўся! У наш век, калі крышталю пуд-два не маеш — сябе не паважаеш.

ЯУХІМ. На мой розум дык было б што, а з чаго — усё роўна. З крышталю, ці...

ДОМНА. З тваім розумам у камендантах інтэрната і сядзець. А мог бы... У касманаўты, можа, і не ўзялі б, але домакіраўніком якім...

ЯУХІМ. Кожнаму — сваё.

ДОМНА (уздыхае). О-ох, нікага з цябе навару, Яўхімка.

ЯУХІМ. Э-э... Тут ты якраз і памыляешся. Навар ён будзе. З гароднінкі. (Спявае.)

Пасею гурочкі
Нізка над вадою,
Сама буду паліваці
Дробнаю слязою...

ДОМНА (сур'ёзна). Не бачу прычыны для радасці. Я вунь у чарзе...

ЯУХІМ (разводзіць рукамі). Домначка, жоначка мая, даражэнькая! Вазьмі свае вочкі ды ў ручкі, да зірні навокал. Думаеш, пакуль ты ў чарзе свае бакі прасавала, каб купіць гэтую, як яе, кру-крушонніцу, я тут лынды біў? Не, даражэнькая! Не біў. Я тут з гектар мо зямлі перавярнуў! Ажно трынаццаць град зрабіў-засеяў! І кожную ад белага свету — парканчыкам! А ты «не бачу прычыны для радасці». Ганарыся, які ў цябе працавіты і кемлівы муж!

ДОМНА. Ганаруся, ганаруся. Яўхімка.

ЯУХІМ (расцвітае ва ўсмешцы). Даўно б, даўно б так, даражэнькая.

ДОМНА. Толькі як моладзь твае турботы-клопаты ацэніць, Яўхімка?

ЯУХІМ. Ацэніць. Належным чынам!

ДОМНА. Пажывём-паглядзім...

ЯУХІМ. Паглядзім.

ДОМНА (глядзіць на гадзіннік, спахопліваецца). А вохці мне. Колькі часу набегла! Хадзем у хатачку, чаю пап'ем. Перакусім. (Выходзіць).

ЯУХІМ. Іду ўжо. (Паціраe далоні.) Э-эх, пасею гурочкі нізка над вадою... (Выходзіць следам за Домнай.)

Вольга ставіць на лаўку ля паркана сумку, здзіўлена азіраецца.

ВОЛЬГА. У-ух... Усё навокал непазнавальна змяняецца. Нават паштовая сумка ўсё цяжэе і цяжэе. Раней сто пісьмаў на ўвесь інтэрнат прыходзіла, а цяпер, пасля таго, як фота трох волатаў-вышыннікаў у газеце надрукавалі, кожнаму з іх па сто пісьмаў штодня. Ілью — сто, Алёшу — сто, Дабрыню — сто. Сто пісьмаў у дзень на душу насельніцтва! І ў кожным не інакш як: «Дарагі, паважаны... Захапляюся вашымі працоўнымі поспехамі... Напішыце, калі ласка... З нецярплівасцю чакаю адказу...» Цяжкая ты, сумка паштальёна! І ў дадатак да ўсяго ў кожную кватэру прынясі ўсмешку, радасць. А тут яшчэ грады. (Смяецца.) Грады перад маладзёжным інтэрнатам! (Спявае.)

Пасею гурочкі
Нізка над вадою,
Сама буду паліваці
Дробнаю слязою...

Ну, таварыш Доўбня, за свае грады, адчувае маё сэрцайка,

(Заканчэнне на стар. 10).

У ПАДРЫХТОЎЦЫ СТАРОНКІ ПРЫМАЎ УДЗЕЛ РЭСПУБЛІКАНСКІ ДОМ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ.



На сцэне Беларускай дзяржаўнай філармоніі — гарадскі хор з Пінска і хор калгаса «Рассвет» імя К. П. Арлоўскага Кіраўскага раёна.
Фота І. АБРАЎЦА.

ДАРОГАЮ ШЧАСЛІВАЙ

Словы А. ДЗЕРУЖЫНСКАГА *Музыка А. ГРАСА*



Заспявалі пушчы і дубровы,
Зашумелі радасна палі.
І пачулі Ленінскае слова
Людзі з краю ў край на ўсёй зямлі. — 2 разы

Заспявалі каласамі нівы,
Адгукнуўся ім адвечны бор,
Беларусь дарогаю шчаслівай
Выйшла ў вечны, велічны прастор. — 2 разы

Зашумелі пушчы і дубровы,
Гарады, што ўсталі над зямлёй.
Нас з'яднала Ленінскае слова
Непарушнай, дружнаю сям'ёй. — 2 разы

«АКУЛІНА»

Беларускі народны танец



Танцуецца неабмежаванай колькасцю пар. Гэты запіс апрацаваны на шэсць пар.

Перад пачаткам танца выканаўцы выходзяць на сярэдзіну сцэны і становяцца парамі па кругу, тварам супраць руху стрэлкі гадзінніка. Рукі злучаны як на вальс.

1-я фігура — 8 тактаў.

Выконваецца музычнае суправаджэнне № 1.

1—2-гі такты.

Танцоры, выконваючы рух №1, рухаюцца па кругу супраць ходу стрэлкі гадзінніка.

3—4-ы такты.

Танцоры, выконваючы рух № 1 і не мяняючы паставы рук, рухаюцца спінай па ходу стрэлкі гадзінніка.

5—8-ы такты.

Танцоры, выконваючы рух № 2, рухаюцца па кругу супраць ходу стрэлкі гадзінніка. У канцы 8-га такта юнак бярэ правай рукой левую руку дзяўчыны, затрымаўшыся, паварочваецца да яе тварам. Свабодныя рукі апушчаны ўздоўж корпуса.

2-я фігура — 8 тактаў.

Выконваецца музычнае суправаджэнне № 1.

1-ы такт.

Танцоры, выконваючы рух № 1, рухаюцца па кругу супраць руху стрэлкі гадзінніка, адно да другога тварам. Злучаныя рукі падымаюць убок, да ўзроўню таліі.

2-гі такт.

Танцоры, выконваючы рух № 1, з другой нагі паварочваюцца на 180 градусаў — юнак налева, дзяўчына направа, і рухаюцца супроць руху стрэлкі гадзінніка. Злучаныя рукі выводзяць уперад да ўзроўню таліі (галава накіравана ўперад).

3-ці такт.

Танцоры, не мяняючы паставы корпуса і рук і выконваючы рух № 1, рухаюцца па кругу па ходу стрэлкі гадзінніка. Юнак пачынае рух з левай нагі, дзяўчына — з правай.

4-ы такт.

Танцоры, павярнуўшыся тварам адно да другога (юнак — направа, дзяўчына — налева) і выконваючы рух № 1, рухаюцца па кругу па ходу стрэлкі гадзінніка. Злучаныя рукі праводзяць праз ніз убок па ходу танца.

5—8-ы такты.

Танцоры, злучыўшы рукі як на вальс, выконваюць рух № 2 і разыходзяцца на дзве паралельныя лініі. У канцы 8-га такта паварочваюцца тварам у сярэдзіну (мал. 1). Юнак бярэ правай рукой левую руку дзяўчыны, паварочваючыся да яе тварам. Свабодныя рукі апускаюць уніз.

3-я фігура — 16 тактаў.

Выконваецца музычнае суправаджэнне № 2.

1—4-ы такты.

Танцоры, выконваючы два разы рухі першага і другога тактаў другой фігуры і захоўваючы паралельныя лініі, збліжаюцца да сярэдзіны, на адлегласць выцягнутай рукі (мал. 2).

5-ы такт.

Юнак бярэ правай рукой левую руку дзяўчыны, якая знаходзіцца супраць яго. Дзяўчына, падаючы руку юнаку, паварочваецца на месцы пад сваёй левай рукой на 360 градусаў улева, выконваючы рух № 3. Юнак выконвае рух № 3 на месцы без павароту (мал. 2). Такім парадкам юнакі мяняюцца партнёркамі.

6—8-ы такты.

Юнакі з новымі партнёркамі злучаюць рукі як на вальс і, выконваючы рух № 3, круцяцца з імі ўправа, разыходзячыся роўнымі лініямі на два бакі. У канцы 8-га такта паварочваюцца тварам да сярэдзіны (мал. 3). Юнак бярэ правай рукой левую руку дзяўчыны. Свабодныя рукі апускаюць уніз.

Паўтараецца музычнае суправаджэнне № 2.

1—4-ы такты.

Танцоры паўтараюць рухі папярэдніх 1—4-га тактаў гэтай фігуры, зыходзячыся ў сярэдзіну (мал. 2).

5—8-ы такты.

Танцоры-юнакі сыходзяцца са сваімі партнёркамі, паўтараюць рухі папярэдніх 5—8-га тактаў гэтай фігуры, разыходзяцца на агульны круг, і танец пачынаецца спачатку.

Юнакі і дзяўчаты, танцуючы, спяваюць:

Мая даражэнька,
Танцуй харашэнька.
Акуліна, руку дай.
Мы паедзем ў цёплы край.
Мы сабраліся дружынай
І танцуем «Акуліну»:
Тупнем, хлопнем, крыкнем — гэй!,
Каб было нам весялей.

АПІСАННЕ РУХАЎ

РУХ № 1

Выконваецца на адзін такт музыкі. Зыходнае становішча — шостая пазіцыя ног.

На лік «раз» зрабіць крок уперад юнаку левай нагой, дзяўчыне — правай.

На лік «і» прыставіць юнаку правую нагу да левай, дзяўчыне — левую да правай.

На лік «два» — зрабіць крок уперад юнаку левай нагой, дзяўчыне — правай, пераносячы цяжар корпуса на гэтыя ногі.

На лік «і» — паўза.

Гэты рух выконваецца таксама з другой нагі.

Рух № 2 — «полька першая».

Выконваецца на адзін такт музыкі.

Зыходнае становішча — шостая пазіцыя ног, рукі злучаныя як на вальс.

На затакт, пачынаючы паварот управа, падскочыць на нізкіх паўпальцах правай нагі, левую — злёгку прыўзняць, згінаючы ў калене.

На лік «раз» пераступіць на нізкіх паўпальцах левай нагі, працягваючы паварот управа.

На лік «і» пераступіць на нізкія паўпальцы правай нагі, паварочваючыся ўправа.

На лік «два» пераступіць на нізкія паўпальцы левай нагі, паварочваючыся ўправа.

На лік «і» выканаць рух, які выконваўся на затакт з другой (левай) нагі, заканчваючы поўны паварот (360 градусаў) управа.

Дзяўчына гэты рух пачынае з левай нагі.

Рух № 3 — «полька другая».

Выконваецца на адзін такт музыкі.

Зыходнае становішча — шостая пазіцыя ног, рукі — як на вальс.

На лік «раз» зрабіць крок на нізкіх паўпальцах левай нагі, пачынаючы паварот управа.

На лік «і» зрабіць крок на нізкіх паўпальцах правай нагі назад, паварочваючыся ўправа.

На лік «два» прыставіць левую нагу да правай, злёгку прысядаючы і заканчваючы поўны паварот (360 градусаў) управа.

На лік «і» — паўза.

Далей рух выконваецца з правай нагі, паварочваючыся ўправа. Дзяўчына гэты рух пачынае з правай нагі.



МАЛ. 1 МАЛ. 2 МАЛ. 3

Харэаграфічны запіс І. Хвораста, запіс і апрацоўка музыкі К. Паплаўскага. Танец запісаны ў вёсцы Барава Іўеўскага раёна ад Антаніны Міронччык і Паўліны Рутковскай.

ТАВАРЫСКІ СУД

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 8).

атрымаеш ты на арэхі! (З-за сцэны чуецца песня.) Хлопцы ідуць! Волаты-вышыннікі! Цікава, як падзейнічае на іх Яўхімава парканамічная адысея? Трэба схавацца за лаўку! Ціка-ва! (Хаваецца.)

ІЛЬЯ, АЛЕША, ДАБРЫНЯ (з песняй выходзяць на сцэну).

Мы сумленна даводзім
усім —
На дзяўчат аніколі
не глядзім,
Бо сэрцы краскі
раструшчаць заўжды
Не знаем іх — не ведаем
бяды...

ІЛЬЯ (здзіўлена). А браточкі мае! Паглядзіце, паглядзіце навокал! Грады?

АЛЕША. Паркаты!

ДАБРЫНЯ. Грады і паркаты перад маладзёжным інтэрнатам! Вось чаго нам не хапала.

ІЛЬЯ. Што гэта за мяшчанскія каленцы?

АЛЕША. Ад іх нават шыльда «Змагаемся за званне інтэрната камуністычнага быту» пачырванела!

ДАБРЫНЯ. Кропу, цыбулі...

ІЛЬЯ. Сажалкі з жабамі...

АЛЕША. Гурочкаў, калі хочаце, тут для поўнага антуражу не хапае!

ВОЛЬГА (спявае з-пад лаўкі).

Пасею гурочкі
Нізка над вадою,
Сама буду паліваці
Дробнаю слязою.
Выраслі гурочкі
У чатыры радочкі,
Не бачыла міленькага
Чатыры гадочкі...

ІЛЬЯ (смеючыся). Выходзь, выходзь, Волечка!

АЛЕША. Выходзь, сяброўка жаданая!

ДАБРЫНЯ. Мы даўно цябе бачым. (Пачынае чытаць былінна.)

Пакінь, красачка, сваё
сховішча
І парадуй нас добрай
весткаю...

Вольга пакідае сваё сховішча, выцягвае з сумкі пісьмы, падыходзіць да хлопцаў.

ВОЛЬГА. Выйшла, выйшла ўжо, цуды-волаты,
Клас-мантажнікі, зух-
вышынні кі.
Я прынесла вам весткі
слаўныя
У канвертах стракатых,
вясёлкавых.

Вольга раздае хлопцам пісьмы, шчыра ўсміхаецца.

Вось табе, Ілья, што не
Мурамец,
Вось табе, Аляксей,
не Паповіч што.
Вось — Дабрынюшку, не
Мікіціч...

Усе разам гучна смяюцца, задаволеныя экспромтам.

ІЛЬЯ (уваходзіць у ролю).
Дзякуй, дзякуй табе,
краска-дзеўчына.

АЛЕША. Дзякуй, любая...

ДАБРЫНЯ. Наша Волечка...
Весткі добрыя — песня
светлая.
Справы дрэнныя — песня
горкая.
Ці ж не бачыш — зямлю
апаганілі,
Інтэрнат маладзёжны
абразілі?
Што рабіць-парабіць ты
параіш нам?

ІЛЬЯ. Прапануеш што?

АЛЕША. Краска-дзеўчына?

ВОЛЬГА. Разумею вас, што
мяшчанскі густ
Не да твару юнаму гораду.
Што абражана не зямля
адна —
Сэрцы нашыя ўсе
абражаны.
Сузіраць такое не можам
мы,
І з нахабствам такім
не змірымся...

ДАБРЫНЯ. Што ж рабіць-парабіць ты параіш нам?

АЛЕША. Прапануеш што?

ІЛЬЯ. Краска-дзеўчына?

ВОЛЬГА (пасля паўзы).
Прапаную склікаць я
трацейскі суд,
Каб мяшчанства было
асуджана,
Паркана рабочай
годнасцю
І з карэннем з побыту
вырвана.

ІЛЬЯ (узрадавана). Такім чынам, калі ласка, на лаву падсудных яго невялікасць...

АЛЕША. Яго прыкрасць...

ДАБРЫНЯ. Мяшчанства.

ІЛЬЯ. У асобе каменданта нашага маладзёжнага інтэрната Яўхіма Яўхімавіча Доўбні.

АЛЕША. І яго жоначкі Домны Аламмпіеўны Доўбні.

ДАБРЫНЯ. З іх батальёнамі слонікаў, што пакрыты пылам гадоў.

ІЛЬЯ. З іх калекцыяй крышталю.

АЛЕША. І дываноў розных колераў і адценняў.

ДАБРЫНЯ. З іх імкненнем схаваць за ашчэранымі парканамі сапраўднае хараство нашага рабочага горада.

ІЛЬЯ. Веліч нашага чалавека.

АЛЕША. Але не толькі Яўхіма і Домну мы садзім на лаву падсудных.

ДАБРЫНЯ. Поплеч з імі мы садзім і ўсё тое, што даўно ўстарэла.

ІЛЬЯ. Што замінае чалавеку расці і развівацца...

АЛЕША. Рухацца наперад...

ДАБРЫНЯ. Жыць і працаваць творча...

ІЛЬЯ. З ініцыятывай.

АЛЕША. Што перашкаджае знаходзіць у чалавеку добры пачатак...

ДАБРЫНЯ. Адшукваць шляхі да сэрцаў...

ІЛЬЯ. Пачуццяў...

АЛЕША. Вось іменна, пачуццяў.

ДАБРЫНЯ. Душы.

ІЛЬЯ. Усё, што мы возьмем з сабой у заўтра.

АЛЕША. Ты, Волечка, прызначаешся суддзёй. Ад гэтага табе ніяк не адмовіцца — цудоўная практыка.

ДАБРЫНЯ. А мы, значыць, галоўныя абвінаваўцы.

ІЛЬЯ. І сведкі.

ВОЛЬГА. Дамовіліся.

ІЛЬЯ. Такім чынам... (Звоніць звязкам ключоў.)

АЛЕША. Устаць!

ДАБРЫНЯ. Суд ідзе!

ІЛЬЯ. Трацейскі суд пачынаецца!

ВОЛЬГА (пасля паўзы). Грамадзяне! Прашу ўвагі! Сёння мы сабраліся з вамі для таго, каб вынесці прысуд унікальнейшай з'яве, якая невядома як прасачылася ў наш маладзёжны горад, наш маладзёжны мікрараён, наш маладзёжны інтэрнат. Імя нашага падсуднага—мяшчанства. Што, яно з намі па камсамольскай пуцёўцы прыехала? Ці мо я, ты, Ілья, што не Мурамец, ты, Алёшачка, не Паповіч што, ты Дабрынечка, не Мікітавіч, як сваяка яго прывезлі? Не, не мы. Бо абураны ўсе, убачыўшы яго праявы. Мяшчанства прасачылася сюды ў куфэрках свядомасці некаторых. Прасачылася і, на вялікі жаль, аблытвае, быццам павуцінне, нас рознымі парканамі і парканчыкамі, градамі з кропам, цыбуляй, буракамі і... Аблытвае, бачыце, таварышы вы мае. І гаворку калі-нікалі сёй-той вядзе не пра кніжку цікавую, не пра спектакль выдатны, а пра тое, што набыў, прабачце мне, як выказваецца Яўхім Яўхімавіч Доўбня, кру-крушонніцу. Набыў, нават не ведаючы, ці спатрэбіцца яна хоць раз у жыцці, і калі спатрэбіцца, то для чаго? Ці ж такім мы хацелі бачыць наш горад, наш мікрараён Сонечны, наш інтэрнат? Не, не такім. Мы хацелі бачыць горад, мікрараён наш непаўторным, прыгожым, сонечным, зялёным. Каб назве сваёй адпавядаў — Сонечны! І інтэрнат светлы, сонечны. І людзей, якія жывуць у ім, з сонечнымі ўсмешкамі на тварах.

ІЛЬЯ. Праўду кажаш, Волечка.

АЛЕША. Чыстую праўду.

ДАБРЫНЯ. Пачакайце, пачакайце, а прысуд які гэтым розным адхіленням?

ВОЛЬГА. Патрушчыць гэта дапатопнае збудаванне, зруйнаваць грады, а на іх месцы зрабіць маляўнічыя газоны. Каб вока радавала чысціня, зеляніна, а не ашчэраныя паркаты. Прымаецца, хлопцы?

ІЛЬЯ. Прымаецца.

АЛЕША. Прымаецца.

ДАБРЫНЯ. Прымаецца.

ВОЛЬГА. Дык за справу, таварышы!

ДАБРЫНЯ (хапаецца за штыкеціну і адрывае яе). За справу, сябры, па знішчэнню ўласнымі рукамі гэтага пасмешышча! Смялей! (Трашчаць дошкі, паркан знікае.)

ІЛЬЯ. У стос складвайце.

АЛЕША. А з градамі, што рабіць?

ДАБРЫНЯ. З градамі?

З акна пачулася музыка — «Танец маленькіх лебедзяў» з балета «Лебядзінае возера».

АЛЕША. Што задумаўся, брат Дабрыня?

ДАБРЫНЯ. Мы - выканаем на іх «Танец маленькіх лебедзяў»! Трыо братоў Вавёркіных, падрыхтавацца.

ІЛЬЯ. Гатовы! А потым прабарануем грады.

АЛЕША. І давядзём да ладу.

ВОЛЬГА. Ваш выхад!

Браты Вавёркіны выконваюць «Танец маленькіх лебедзяў». З калідора, напяваючы, выходзіць Яўхім, за ім тэпае яго жонка Домна.

ЯЎХІМ. Пасею гурочкі
Нізка над вадою,
Сама бу-у-у...

ВОЛЬГА. Таварыш Доўбня?!

ЯЎХІМ (заўважае, што моладзь па-свойму добраўпарадкавала тэрыторыю, хапаецца за сэрца). Я-я...

ДОМНА. М-мы...

ЯЎХІМ. Гэта самаўпраўства! Гэта...

ДОМНА. Гэта самасуд!

ЯЎХІМ. Гэта...

ДОМНА. Разбой сярод белага дня!

ЯЎХІМ. Гэта... Гэта... самасуд.

ДОМНА. Во-во.

ВОЛЬГА. Не самасуд, а трацейскі суд.

ЯЎХІМ. Трацейскі?

ДОМНА. Які яшчэ трацейскі?

ВОЛЬГА. Суд, які выбіраецца для разгляду грамадзянскай справы па ўзаемнай згодзе бакоў. Вы што, не згодны?

ЯЎХІМ (ахвотна). Згодны... згодны...

ІЛЬЯ. Значыць, згода бакоў ёсць?

АЛЕША. Вы з аднаго боку, а мы, будаўнікі, з другога.

ДАБРЫНЯ. Большасцю галасоў прымаецца менавіта наша прапанова: знесці паркаты.

ІЛЬЯ. Зруйнаваць грады...

АЛЕША. І зрабіць газоны.

ЯЎХІМ. Дык я ж столькі...

ВОЛЬГА (строга). Большасцю галасоў прынята іх прапанова. І мы зробім...

ЯЎХІМ (аціхлым голасам). Зрабілі ўжо.

ВОЛЬГА. Мы зробім трацейскі запіс.

ДОМНА. І без запісу ўсё ясна.

ВОЛЬГА. Рашэнне трацейскага суда выконваецца добраахвотна.

ДОМНА. Добра сабе, Яўхімка, добраахвотна! Чалавек гэтулькі зямлі ўспароў дзеля карысці, каб не пуставала, яны ж знішчылі ўсё і яшчэ сцвярджаюць, што «добраахвотна». Не карову ж мы ў падвале трымаем, не парсюка на балконе гадуем!

ЯЎХІМ. Ды супакойся ты, Домначка. Пашкадуй нервовыя клеткі. Кажуць, што яны не аднаўляюцца.

ДОМНА. А грады, між іншым, аднаўляюцца? А паркапчык, між іншым, аднаўляецца? Не, вы мне скажыце, аднаўляецца? Скажыце, між іншым...

ВОЛЬГА. Не хвалюйцеся, грамадзянка Доўбня. Мы не на вашым прыватным гародзе парадак наводзілі.

ІЛЬЯ. А вакол нашага маладзёжнага інтэрната.

АЛЕША (падымае палец угору). Нашага, маладзёжнага!

ДАБРЫНЯ. Жыхары якога...

ІЛЬЯ. Не між іншым...

АЛЕША. Змагаюцца за прысваенне яму...

ДАБРЫНЯ. Звання «Інтэрнат камуністычнага быту».

ДОМНА. Божачкі, яны тут не толькі як у тым тэатры станцаваліся, але яшчэ і спеліся ўсе. І ўсе супраць цябе, мой Яўхімка.

ВОЛЬГА. Прабачце мне, грамадзянка Доўбня. Не супраць Яўхіма Яўхімавіча...

ІЛЬЯ. А супраць градаманіі...

АЛЕША. Супраць паркаманіі...

ДАБРЫНЯ. Супраць мяшчанаманіі.

ДОМНА. А дазвол хто вам даў?

ВОЛЬГА. Гэта рашэнне трацейскага суда.

ДОМНА. Трацейскага? (Смяецца.) І дзе толькі вас гэтаму вучаць?

ВОЛЬГА. Ва універсітэце. На юрыдычным факультэце універсітэта.

ІЛЬЯ. І ў нашым вячэрнім будаўнічым інстытуце, калі хочаце ведаць.

АЛЕША. Дарэчы, наконт «спеліся» вы таксама правільна сказалі.

ДАБРЫНЯ. Звяно камуністычнай працы братоў мантажнікаў-вышыннікаў у складзе Ільі, Алёшы і Дабрыні на сцэне значыцца вакальна-інструментальным трыо «Добрыя малайцы».

ІЛЬЯ. На канцэрт як-небудзь прыходзьце.

АЛЕША. Будзем рады...

ДАБРЫНЯ. Бачыць вас.

ДОМНА. Досыць з мяне і сённяшняга вашага канцэрта з кардэбалетам.

ІЛЬЯ. Вам досыць, а нам яшчэ газоны засеяць трэба.

АЛЕША. Паліць старанна.

ДАБРЫНЯ. Каб людзям на радасць зелянелі-красаваліся.

ДОМНА (Яўхіму). А ты чаму адмоўчваешся, Доўбня? Ты што, з усім пагаджаешся?

ЯЎХІМ. Пагаджацца не пагаджаюся, але з пасадай сваёй, бачна, развітаюся.

ДОМНА. Як? Без маёй санкцыі?

ЯЎХІМ (да моладзі). Яны вунь далі мне санкцыю на тое, што няможна мне з людзьмі. У кладаўшчыкі пайду. Там з матрацамі ды коўдрамі дроў не наломіш.

ВОЛЬГА. Часова можна, вядома, у падвале за матрацамі і коўдрамі схавацца, але неўзабаве і адтуль выцягне, выкалупне.

ІЛЬЯ. На паверхню вылузне.

АЛЕША. І сурова спытае.

ДАБРЫНЯ. Ці той ты чалавек, Яўхім Яўхімавіч Доўбня, якога варта ўзяць з сабой у заўтра?

ДОМНА (хапаецца за рукаў Яўхіма). А мяне?

ДАБРЫНЯ. Ці той вы чалавек Домна Аламмпіеўна Доўбня, якога...

ДОМНА. Я, калі хочаце, даведку з камісіёнкі прынясу, што ўвесь крышталь па баку.

ЯЎХІМ. Тады возьмеце?

ІЛЬЯ. Возьмем, калі ніводнай чарвяточыны не будзе ў вас...

ДОМНА. І мяне?

АЛЕША. А як наконт чарвяточын?

ДОМНА. Куплю антычарвяточарыц. На ўсю зарплату куплю.

ЯЎХІМ. Будзем прымаць па дзве таблеткі тры разы на дзень. Дык возьмеце?

ІЛЬЯ. Возьмем, таварышы?

ВОЛЬГА (смяецца). Возьмем, калі будзем ведаць, што сённяшні ўрок пайшоў вам на карысць.

ЯЎХІМ. Пайшоў.

ДОМНА (ахвотна). Пайшоў, пайшоў.

ВОЛЬГА. На ўсё жыццё запомніце яго?

ЯЎХІМ. Запомнім.

ДОМНА. Запомнім.

ВОЛЬГА (да хлопцаў). Прымем да ведама запэўніванне грамадзян Доўбняў?

ІЛЬЯ. Прымем.

АЛЕША. Прымем.

ДАБРЫНЯ. Прымем.

ВОЛЬГА (да залы). Прымем, таварышы? (Пасля кароткай паўзы.) І давайце часцей і пільней, больш уважліва прыглядацца да сябе, да сваіх таварыстваў і суседзяў — ці не крочыць поруч з намі... словам, тое, чаго б мы не хацелі бачыць у нашай сонечнай шчаслівай будучыні.

Заслона.

Хутка Першамай. Фота А. ГЛІНСКАГА.

ПЕРАЖЫТАЕ НАРОДАМ

РАЗМОВУ пра новы мастацкі фільм кінастудыі «Беларусьфільм» — «Чорная бяроза» хочацца пачаць з удзячнага слова ў адрас рэжысёра Віталя Чацверыкова і аператара Дзмітрыя Зайцава, якія праўдзіва і шчыра ўзнавілі атмасферу часу, выбралі з яго самае патрэбнае, выразнае, для таго, каб паказаць непаўторнасць і харастро нашай багатай на падзеі гісторыі.

...Па снежнай цаліне, якую нібы ўзяў у жалобную рамку хмызняк, ідзе жанчына ў чорным убранні. Гора. Гэта адчуваеш і па канкрэтнай чалавечай постаці, і па сімволіцы кадра. На вачах гэтай жанчыны немцы расстралялі яе мужа, цыгана, які дзейнічаў у партызанах.

Гэта ён, ратуючы партызанскую радыстку, адвёў ад яе варожую фашысцкую зграю. І загінуў. Гучыць сумная табарная песня. І чорная постаць жанчыны ўспрымаецца ў выразным і шматзначным мастацкім кантэксце гэтага сюжэтнага і выяўленчага вузла стужкі.

Захоўваючы стылістычнае адзінства агульнага пафасу ў экранным апавяданні, рэжысёр і аператар вельмі тактоўна ўводзяць у стужку кадры кінахронікі.

Наогул, цяпер лічыцца модным цытаваць у мастацкім фільме дакументальны матэрыял. Гледачы на экранах кінатэатраў і тэлевізараў маюць магчымасць даволі часта бачыць адны і тыя ж кадры дакументальнай хронікі ў зусім розных адвольных мантажных пабудовах. І ў іх ствараецца ўражанне, адваротнае таму, якое хацелі зрабіць на нас аўтары такіх стужак. Яны пачынаюць прыгадваць, дзе і ў спалучэнні з якімі іграўымі эпізодамі нядаўна бачылі тыя ж твары і тыя ж моманты баявых аперацый.

Рэжысёр «Чорнай бярозы» Віталь Чацверыкоў разам з аператарам Дзмітрыем Зайцавым так патрабавальна адбіралі хранікальныя кадры і так арганічна звязвалі іх з тымі, што здымаліся спецыяльна (напрыклад, для паказу пачатку будаўніцтва трактарнага завода ў Мінску, яшчэ не адноўленым пасля ваенных разбурэнняў), што мяжа паміж хранікальным гістарычным і сённяшнім кінаматэрыялам не заўважаецца. Хроніка ў іх — не цытата, а сапраўды мастацкая рэстаўрацыя пражытага народам.

Стваральнікі фільма вядуць апавяданне ў эпічным жанры. Яны разглядаюць пражытае народам у першы пасляваенны перыяд як працяг подзвігу, як сведчанне духоўнай мужнасці і ідэйнай сталасці савецкіх людзей. Час, адлюстраваны ў «Чорнай бярозе», вымагае маштабнага паказу яго герояў і яго адметнасці.

Па-шчырасці, дык я не аднёс бы да ўдалага пралог-пачатак фільма (святкаванне І Мая ў нашы дні), бо ён служыць тут толькі для кампазіцыйнага размеркавання матэрыялаў. Гледачоў жа пралог настройвае на іншы, святочны лад, хоць сутнасць твора ў іншым. Відаць, сцэнарысты Б. Архіпавец, М. Бярозка, С. Палякоў і рэжысёр В. Чацверыкоў, уводзячы ў фільм кадры святочнага горада, мелі намер па кантрасту ацаніць сённяшнім днём мінулы, каб больш узрушыць гэтым кантрапунктам гледачоў. Мне падалося, што мэта гэтая ў пралогу не дасягаецца.

Для раскрыцця мужнасці і чалавечнасці народнага характару сюжэтныя калізіі абраны надзвычайныя. Яны пагражалі спакусіць аўтараў на патэтыку, на фальшывую рыторыку. Такое ўжо здаралася з фільмамі, якія па літаратурнаму матэрыялу мелі нешта агульнае з «Чорнай бярозай». Да гонару В. Чацверыкова, ён пазбег такіх хібаў, і стужка трымаецца на высокай хвалі эпічнага апавядання.

Сказаўшы гэта, мушу заўважыць, што выдаткі творчага пошуку ўсё ж адчуваюцца на экране.

Складанае становішча ў таленавітага і абаяльнага артыста Я. Карэльскіх, выканаўцы ролі галоўнага героя фільма — Андрэя Хмары. Гэта — сапраўды смелы, духоўна прыгожы, здатны самастойна мысліць чалавек. Такія яго рысы заяўлены аўтарамі фільма адразу. Але потым Андрэй Хмара трапляе ў абставіны, якія надаюць вобразу нечакана супярэчлівыя рысы характару. Андрэй Хмара самавольна накіроўвае танк з чужой армейскай часці ў бок Мінска, ужо захопленага гітлераўскімі войскамі, гоніць варожых салдат па вуліцах горада, давіць гусеніцамі іх тэхніку... Для якой мэты? Аказваецца, для таго, каб прабіцца да свайго дома і паспрабаваць выратаваць сваю сям'ю. Высакародны ўчынак. Толькі ўчынак гэты мае спантанны, асабісты характар. Надта вялікі фон для падзей і ўчынкаў Андрэя Хмары — трагічныя вялікага горада, на вуліцы якога праз некалькі дзён пасля пачатку вайны ўступілі гітлераўцы. Ёсць, вядома, ва ўсім гэтым нешта такое, чым можна апраўдаць і, безумоўна, зразумець Андрэя Хмару. Але ж нельга не ўлічыць і тое, што з-за яго гіне танкіст, гіне жанчына-ўрач, гіне і баявая машына. Мог бы загінуць і ён, камандзір Чырвонай Арміі, які дзейнічае ў гэтых абставінах не зусім мэтазгодна.

Яшчэ адзін такі ж момант. У мірным тыле, прымаючы ўдзел у выпрабаванні адрамантаванага рабочымі танка, Андрэй Хмара раптам жалезным ломам крушыць трафейную варожую тэхніку. Акцёр робіць гэта эмацыянальна. Аператар здымае гэта выразна і эфектна. Толькі зноў жа мы бачым праяву нейкіх стыхійных сіл, няўменне прафесійнага ваеннага чалавека кіраваць сваімі пачуццямі і дзейнічаць зноў жа мэтазгодна.

З такіх учынкаў героя мы, гледачы, павінны скласці ўяўленне аб тым, якім ён бывае ў сапраўды небяспечных абставінах. Што ж, такі прыём «падказу» чытачу або гледачу, можа, і апраўданы. Толькі цяжка зразумець, чаму здаровы чалавек Андрэй Хмара не паказаны ў баявых дзеяннях на фронце, а толькі ў тыя часы, калі яго асабістыя пачуцці дыктуюць яму той або іншы крок, які не стасуецца з планамі вялікіх або малых баявых аперацый супраць ворага. Ці не таму Андрэй Хмара прадстае перад намі пераважна натурай апантанай прагай асабістай помсты. Нешта істотна важнае для паказу камандзіра Чырвонай Арміі, чалавека, які ў нечым нагадвае нам герояў, напрыклад, «Мінскага напрамку» І. Мележа, у фільме «Чорная бяроза» выпадае з працэсу мастацкага асэнсавання чалавечай асобы на вайне.

Больш сталым, больш устойлівым выглядае Макар Журавель. Савецкі інтэлігент, ён адчувае маштабы барацьбы з фашызмам і ўмее суадносіць лёс чалавечай адзінкі з вялікай стратэгіяй вайны. Не выпадкова ва ўсіх канфліктных сутыкненнях Макара Жураўля з яго маладым сябрам Андрэем Хмарай першы з іх заўсёды бярэ верх і маральна, і па ўзроўню інтэлектуальнага роздуму. Такому чалавеку, палітычна сталаму, мэтанакіраванаму, загартаванаму, на жаль, не знайшлі аўтары вартага апанента.

Мастацкая літаратура даволі шырока і падрабязна паказвала пасляваенную адбудову і рэканструкцыю заводаў і фабрык, гарадоў і паселішч Беларусі. У кінамастацтве гэты жыццёвы матэрыял, калі я не памыляюся, стаў прадметам увасаблення ўпершыню. Ва ўсякім разе ў такім эпічным развароце падзеі і людзі другой паловы саракавых гадоў на экране яшчэ не паўставалі.

Адчуваеш эпічнасць і ў тым, як аўтары фільма пазбягаюць празмернай дэталізацыі сюжэта і замалёвак жыцця, а бяруць, умоўна кажучы, фрагменты рэчаіснасці той пары.

Вось прыклад. Маладая жанчына атрымала «пахаронку». Але яна чакае мужа. Яна не дазваляе сабе пачаць новае жыццё з чалавекам, якога пакахала. І гэтая любоўная гісторыя пазбаўлена звычайнай у такіх сюжэтных паваротах інтымнасцей. Дзякуючы гэтаму, мы забываем пра банальнасць такой сітуацыі (кахаў адну, ды абставіны прымусілі ажаніцца з другой), дзякуем сцэнарыстам і рэжысёру за ўмелую абагульненасць асабістага лёсу людзей пасляваеннага часу.

Праўда, аўтарам можна было б пазбегнуць некаторай меладраматычнасці. Жонка з трыма дзецьмі ад'язджае для таго, каб... «ён» быў шчаслівы з другой жанчынай. Дзяўчына, якую кахаў і кахае герой, адыходзіць, каб... не разбіць сям'ю. Па-першае, такія сітуацыі даўно ўжо вандруюць з фільма ў фільм. Па-другое, гэтыя інтымныя ноты нічога не дадаюць да нашага ўяўлення пра духоўны свет і перажыванні Андрэя Хмары. Такія падрабязнасці толькі здрабняюць сюжэтную плынь эпічнага твора.

Я спыняюся на творчых праліках па ўвасабленню вобраза Андрэя Хмары таму, што ён на працягу ўсёй стужкі трымаецца ў промні, які высвятляе ў ім гераічны характар. Ён — герой, прадстаўнік народа. Каб такі вобраз не выглядаў фігурай «на катурнах», яму, трэба думаць, І прапануюцца абставіны, якія сведчаць, што гэты чалавек можа памыляцца, выбіраць не тыя метады барацьбы з праціўнікамі, што ім валодаюць І маленькія страсці... Мне думаецца, што такое «ажыўленне» і «ацяпленне» персанажу робяць яго толькі супярэчлівым ад прыроды.

Сапраўды гераічны характар — гэта Макар Журавель у выкананні Уладзіміра Куляшова. Дарэчы, У. Куляшоў працуе ў Беларускім акадэмічным тэатры імя Якуба Коласа і да гэтага фільма зрэдку паяўляўся на экране. На гэты раз акцёр паказаў, што ён умее паглыбляцца ў духоўны свет персанажу, з псіхалагічнай праўдай раскрываць маральнае хараство свайго героя. У Макара Жураўля, якім яго іграе У. Куляшоў, абвостранае пачуццё абавязку перад сваім народам. Гэтае пачуццё і вызначае яго ўчынкі. Вопыт вайны робіць яго больш стрыманым, разважлівым, але прасветленасць душы Макара застаецца зіхатлівай на працягу ўсяго фільма. Магчыма, у яго пасляваенным жыцці адчуваеш прымірэнне з некаторымі абставінамі, аб нечым ён яшчэ пашкадуе, але мітуслівага эмацыянальнага выбуху, як Андрэй Хмара, герой У. Куляшова не дазволіць сабе ніколі. Прывабная фігура!

Я не ставіў бы клічнік, калі б удача У. Куляшова была выпадковай або адзінай у «Чорнай бярозе». Хочацца павіншаваць здымачную групу з поспехам актрысы Н. Бражнікавай, якая стварае надзвычай прывабны, праўдзівы і чысты вобраз Надзі. Вось тыповы характар з народа. Вось сапраўды славянская натура — адданая, здольная на бескарыслівую любоў, на спачуванне, не чакаючы падзякі і адказу, самаахвярная. Гэтыя рысы выканаўца ролі не дэманструе, а стрымана, па-акцёрску ашчадна, з глыбокім напалам унутранага тэмпераменту праносіць праз фільм.

Здагадваешся, што вобразы Надзі І Макара Жураўля былі больш грунтоўна выпісаны ў літаратурным сцэнарыі. У Н. Бражнікавай і У. Куляшова быў удзячны матэрыял для таго, каб асабістыя дадзеныя прывесці ў пэўную сістэму мастацкага вобраза. Яны, Надзя І Макар Журавель, і звязваюць усе сюжэтныя галіны ў адзіны і завершаны твор. Яны вызначаюць эпічнае гучанне «Чорнай бярозы».

Па-эпічнаму строга вырашаны эпізоды з удзелам насьбітаў фашысцкай ідэалогіі, абалваненага фюрэрам мешчаніна, які паверыў у сваю выключнасць і асаблівую місію ў Еўропе. Калі фашысцкі афіцэр расстрэльвае жанчыну-ўрача, якая выканала свой медыцынскі абавязак, то ён, гэты «звышчалавек», расстрэльвае вельмі дзелавіта. Расстрэльвае і дзіця. Страляе і ў птушку. Зусім вольны ад «хімеры сумлення» тып! Сцэнарысты прадугледзелі, а рэжысура і выканаўцы ўвасобілі зноў жа рэальную з'яву вайны і абагульнены тып акупанта.

...Андрэй Хмара і яго паплечнікі — гэта таксама ўзброеныя салдаты, людзі ваеннай прафесіі. Але якія сапраўды гуманныя і велічныя яны ў параўнанні з фашысцкімі вылюдкамі! У фінале фільма Андрэй Хмара адшукае хлопчыка, выпадкова выратаванага ад фашысцкага самасуда, — гэта другое дзіця жанчыны-ўрача. І з вуснаў хлопчыка ён чуе вялікае і свяшчэннае слова: «Бацька...»

«Чорная бяроза» — значны мастацкі дакумент, цікавае ўвасабленне тэмы пасляваеннага аднаўлення жыцця.

Пятро ВАСІЛЕЎСКІ.

АД АБЕЛІСКА — ДА МЕМАРЫЯЛА

НІКОЛІ раней у нас у краіне не ставілася так многа помнікаў, не атрымлівала такога шырокага распаўсюджвання манументальна-дэкаратыўнае афармленне новых горадабудаўнічых комплексаў, як у апошнія гады. Роля розных відаў манументальнага мастацтва ў жыцці нашага грамадства непамерна ўзрасла і ў далейшым, несумненна, будзе яшчэ больш значнай. Задачы, якія стаяць перад майстрамі - манументалістамі, надзвычай складаныя і адказныя. У распрацаваных ЮНЕСКА «Дзевяці пунктах аб манументальнасці» манументы вызначаюцца як «арыенціры, як сімвалы чалавечых ідэалаў, мэт, дзеянняў. Яны прызначаны перажыць час, які нарадзіў іх, і класці спадчыну для будучых пакаленняў. Па сутнасці, яны ўтвараюць сувязь паміж мінулым і будучым». З'яўляючыся неад'емнай часткай штодзённага акружэння чалавека ў гарадскім і архітэктурным асяроддзі, творы манументальнага мастацтва фарміруюць свядомасць пакаленняў. Прырода-гэтага мастацтва такая, што яно звяртаецца не толькі да нашых сучаснікаў, але і да людзей будучыні. Яны змогуць меркаваць па яго мастацкаму ўзроўню пра нашу эпоху, яе ідэі, яе духоўныя запатрабаванні і густы.

Шырокія маштабы манументальнай творчасці звязаны з жыццём нашага грамадства і зменамі ў архітэктуры. Разам з тым наша практыка ў гэтай галіне з'яўляецца непасрэдным развіццём ідэй манументальнай прапаганды першых гадоў Савецкай улады, якія ўвайшлі ў гісторыю як Ленінскі план манументальнай прапаганды. Ленінскім яго назвалі таму, што менавіта Ленін роўна 60 гадоў назад першы ацаніў велізарную ролю, якую можа адыграць мастацтва ў фарміраванні чалавека новага грамадства, у прапагандзе перадавых ідэй.

Ёсць падзеі, якія ўжо знайшлі ў пэўнай ступені адлюстраванне ў многіх творах манументальнага мастацтва, але ўсё ж яшчэ чакаюць свайго больш поўнага раскрыцця. Да такіх гістарычных падзей належыць бессмяротны подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Тэма подзвігу не выпадкова атрымала найбольш важнае месца ў беларускім мемарыяльным будаўніцтве апошніх трыццаці гадоў. І таму зразумелае трапяткое хваляванне мастакоў, якія працуюць над помнікамі барацьбы і перамогі.

Веліч ідэй гуманізму, інтэрнацыянальнай салідарнасці, веліч ахвяр, якія паклаў савецкі народ на алтар перамогі ў барацьбе супраць фашызму, патрабуюць ад мастакоў і архітэктараў стварэння глыбока драматычных твораў з шырокім эпічным апавядальным пачаткам і адначасова філасофска-мастацкім асэнсаваннем мінулага ў яго сувязі з сённяшнім і будучым днём. Такой характэрнай для сучаснага этапа формай манументальнага будаўніцтва стаў у Беларусі мемарыяльны комплекс.

Якія ж асноўныя функцыі сучаснага беларускага мемарыяла? Які псіхалагічны, эмацыянальны рэзананс мемарыяльнага твора? Якія яго асноўныя канцэпцыі?

Адной з галоўных якасцей беларускага мемарыяльнага ансамбля, на наш погляд, з'яўляецца захаванне дакументальнага прасторавага асяроддзя памятнай падзеі в уключэннем у яго розных мемарыяльных надпісаў, знакаў, дошак, якія ўзмацняюць эмацыянальны ўплыў дакумента.

Сам па сабе гістарычны фон, праўдзівае гістарычнае асяроддзе яшчэ не створаць новай пластычнай якасці помніка і зусім неабавязкова змогуць узмацніць яго ўплыў. Ідэя помніка рэалізуецца ў пэўнай прасторы за кошт арганічнага спалучэння элементаў архітэктурных, якія ў роўнай меры могуць трактавацца сімвалічна, скульптурных і іншых дакументаў. Выкарыстанне таго або іншага прыёму павінна ў першую чаргу залежыць ад ідэйнай праграмы мемарыяла. Пластычная выразнасць помніка не павінна падмяняцца спадзяваннем на асацыяцыі, якія выклікае «дакумент», але ўсё ж такі ў цэлым тэндэнцыя гэтая вельмі перспектыўная. Такі помнік, вядома, з некаторымі заўвагамі, можна параўнаць з распаўсюджаным у апошнія гады жанрам манументальнай драмы.

Гэта датычыць мемарыяльных комплексаў, узведзеных у Беларусі на месцах вялікіх бітваў або масавага знішчэння мірных грамадзян. Тут памятны ансамбль выступае як своеасаблівы музей пад акрытым небам, «экспанаты» якога нясуць інфармацыю строгай гістарычнай праўдзівасці, дачынення да гераічнай або трагічнай падзеі.

Захаванне дакументальна-гістарычнага асяроддзя ў прасторы стала адной з функцый помнікаў у Брэсце, Хатыні, Леніна, Ушачах, Дуброўне і інш., дзе ў поліфанічны манументальны вобраз зліваюцца ў адно дакументальнае асяроддзе і прадметы-сімвалы. Сімвалы ўсіх відаў: сімвал перамогі жыцця над смерцю — кветкі; сімвал воінскай доблесці — трохгранныя рускія штыкі; сімвал вечнай баявой дружбы — спаяныя ў поціску рукі; сімвал бязмернага смутку па загінуўшых — жалобныя званы; сімвал разарванага блакаднага кола — прарэзаны напалам каменны блок і г. д.

Буйной творчай знаходкай з'яўляецца ў гэтым сэнсе і Галоўны ўваход у Брэсцкі мемарыял. Расколатая, але не страціўшая канфігурацыі, зорка, скрозь якую мы праходзім на тэрыторыю крэпасці, з'яўляецца значным сімвалам, таму што ў ёй знойдзена дакладна распрацаванае пластычнае вырашэнне, дакладна вызначаны маштаб, улічана аптычная перспектыва, якая візуальна звязвае складаны праём Галоўнага ўваходу з мастацка-дакументальнымі элементамі, размешчанымі ў перспектыве, удалечыні.

Эвалюцыя прасторавай канцэпцыі, прасторавага бачання, а ў сувязі з гэтым і прынцыпаў мастацкага фарміравання прасторы асабліва стала прыкметна ў беларускай мемарыяльнай пластыцы ў апошняе дзесяцігоддзе. Эвалюцыя гэтая, на наш погляд, заключаецца не толькі ў пераходзе ад монацэнтрычных кампазіцый (абеліск Перамогі ў Мінску, помнікі Ф. Копанавай у Любані, М. і А. Лузгіным у Обалі, А. Колесавай у Крупках, М. Гойшыку пад Івацэвічамі, помнікі загінуўшым воінам і партызанам, узведзеныя на Нарачы і Паліку, у вёсцы Чонкі на Гомельшчыне, у калгасах «Бальшавік» і імя Энгельса на Міншчыне, «Сцяг перамогі» на Віцебшчыне, пад Чэрвенем) да поліцэнтрычных (Хатынь, Ушачы, Леніна), не толькі ў павелічэнні фізічных аб'ёмаў мемарыяльнай прасторы, але галоўным чынам, у пераходзе ад замкнёнай і адасобленай прасторы — да прасторы няспыннай, бясконцай. Ад жорсткіх восей сіметрыі і парадных перспектыў з пэўнымі статычнымі ракурсамі—да свабоднага развіцця прасторавай кампазіцыі ва ўсіх трох вымярэннях, да шматграннасці сістэм бачання, ракурсаў, узроўняў, якія ўспрымаюцца паслядоўна і адначасова. Ад праграміравання дакладна зададзенага, наўмыснага і паслядоўнага руху гледача ў мемарыяльнай прасторы — да пашырэння і павелічэння свабоды руху, індывідуальнасці ўспрымання прасторавага вобразу. Ад архітэктурнай формы, якая служыць толькі абмежаваннем абрамленнем прасторы, — да архітэктурнай формы, якая свабодна размешчана ў прасторы і якая арганізуе яе, узаемазвязваецца з іншымі формамі і ўспрымаецца ў працэсе руху вакол яе.

Наглядным прыкладам развіцця падобных прынцыпаў з'явіліся конкурсныя праекты мемарыяльнага ансамбля Партызанскай Славы пад Мінскам.

Узаемадзеянне помніка з прыродай — яшчэ адзін важнейшы аспект сучаснага мемарыяльнага будаўніцтва. Характэрнай рысай з'яўляецца раскрыццё прасторы ансамбля ў прыроду, уключэнне ў яго буйных ландшафтных элементаў, пейзажных матываў і панарам у якасці неад'емнай часткі агульнай кампазіцыі, як, напрыклад, у Леніна. Гэтым, аднак, не вычэрпваецца роля прыроды ў стварэнні мемарыяльнага вобраза. У кампазіцыі асобных помнікаў прырода становіцца адным з дамінуючых сімвалаў. Так, у мемарыяльным комплексе «Прарыў» аўтарамі быў беражліва захаваны ўвесь пейзаж, дзе вясной сорак чацвёртага разгортвалася грандыёзная бітва, і гэтыя памятныя мясціны — балотца, рэчка, пагоркі, лес — самі па сабе ўжо сталі помнікамі.

Праўда гістарычнай абстаноўкі замацавана і ў манументальных формах мемарыяла ва ўрочышчы Гай пад Баранавічамі, дзе фашысты расстралялі 3 тысячы чэхаславацкіх грамадзян, і ў помніку ахвярам фашызму ў Дальве, і ў манументе, узведзеным у памяць загінуўшым грамадзянам у вёсцы Лішкі Гродзенскай вобласці, і ў многіх іншых.

У Хатыні праўдзівасць — у выкарыстанні сапраўднага акружэння вёскі і ў акцэнціроўцы архітэктурнымі сродкамі месца кожнай спаленай хаты, калодзежаў, адрыны, у якой былі знішчаны жыхары, і г. д.

Эвалюцыя прасторавай сістэмы ансамбляў адбылася і на важнейшай кампазіцыйнай функцыі — узаемадзеянні архітэктуры і скульптуры.

За апошнія гады значна ўзрасла архітэктанічная роля скульптуры — яе роля ў арганізацыі свабоднай, адкрытай прасторы. Так, у той жа Хатыні, ва Ушачах, на Кургане Славы, у манументе савецкай маці-патрыётцы ў Жодзіне, у помніку ахвярам фашызму ў Чэрвені скульптурны аб'ём з'яўляецца ўдалым прасторавым арыенцірам і дамінантай усяго акаляючага прыроднага ландшафту. Між іншым, пытанне гэтае дадатковa складанае, бо, на жаль, у гэтым плане ёсць і няўдачы. Так, гіпертрафіраваная буйная форма галавы Цэнтральнага манумента ў Брэсцкім мемарыяле не прывяла да мастацкага адкрыцця. Пачуццё такту, суразмернасці асабліва важна ў жывым асяроддзі гісторыі, дзе перабольшанне маштабу скульптурнай формы зменшыла тут значэнне існуючых помнікаў вайны — руін, якія нясуць у сабе велізарную выразную сілу.

Важны і яшчэ адзін кампазіцыйны аспект — сінтэз архітэктурна - скульптурна - жывапісных і ландшафтных форм з формамі не пластычнымі: святлом, словам, музыкай, гукам. Паэтычныя эпітафіі на надмагільных плітах, стэлах, памятных камянях. Строгія дакументальныя надпісы, рэліквіі. Жалобная музыка, сумна-трывожны гук званоў. За ўсім гэтым — найглыбейшыя народныя традыцыі, якія атрымалі сучасную форму.

Як і ў іншых рэспубліках, у Беларусі побач з разгорнутымі архітэктурна - скульптурнымі ансамблямі ўводзяцца і сціплыя помнікі. Часта подзвіг персаніфіцыруецца скульптарамі ў вобразе салдата-вызваліцеля або Маці-Радзімы. У такіх творах вялікая ўвага надаецца гістарычнай праўдзівасці падзеі, таму, «як гэта было». Разам з тым аўтары імкнуцца ў рэальным факце, усвядомленым у святле сацыяльнага вопыту сучаснасці, знайсці рысы сімволікі, усеагульнасці. Дасягаецца гэта розныімі шляхамі — трактоўкай саміх фігур або архітэктурным суправаджэннем; часам дапамагаюць выяўляць галоўнае і асаблівасці акаляючага ландшафту.

Канкрэтна і сімвалічна — гэта нялёгка. Нельга забываць, што подзвіг, які ўслаўляе мастак, быў непаўторны. Вось чаму нават самы сціплы манумент не можа быць стандартны. Аднатыпныя фігуры салдат з узнятымі аўтаматамі, якія яшчэ сустракаюцца ў практыцы, наўрад ці хвалююць людзей сёння, і калі раней даводзілася мірыцца з тыражыраванай скульптурай, якая толькі ўмоўна адзначала памятныя месцы, то цяпер лозунг «ніхто не забыты і ніштo не забыта» ўвасабляецца і павінен ўвасабляцца ўсё больш поўна і дыферэнцыравана. У беларускім мастацтве сёння з'яўляецца ўсё больш арыгінальных помнікаў, пазбаўленых шаблону, якія адлюстроўваюць канкрэтную героіку, канкрэтны характар, які захаваўся ў шэрагу гістарычных падзей. Успомнім тут помнікі савецкай маці-патрыётцы ў Жодзіне, М. Гастэла пад Радашковічамі, К. Заслонаву пад Оршай, камсамольцам братам Сянько ў Мінску, падпольшчыкам «Асінторфа» і многія іншыя.

Дзесяткі абеліскаў і помнікаў мемарыяльных знакаў, а то і проста суровых каменняў са строгай пяцікутнай зоркай, сёння стаяць на зямлі Беларусі. Яны не могуць спаборнічаць з буйнейшымі ансамблямі, якія ўражваюць сваімі маштабамі, грандыёзнасцю. Але яны разлічаны на дыялог з кожным асобным гледачом і таму маюць права па жыццё. Бо ўзводзяцца яны як сведчанні чалавечага імкнення да перамогі над часам.

Манументальныя творы, устаноўленыя на плошчы горада або за яго межамі, «перастаюць быць яго (скульптара-манументаліста. — Б. К.) асабістым дасягненнем або няўдачай, адказнасць перад самім сабою і перад масай людзей, для якіх створаны помнік, узрастае ў сто разоў. Кожны помнік — гэта пошукі новых шляхоў вырашэння, прадыктаваныя зместам, сувяззю з архітэктурна-прасторавым асяроддзем і галоўнае— з гледачом, да якога ён звернуты». Нам думаецца, у гэтых словах вядомага польскага скульптара Густава Землы ёсць вялікі сэнс.

Кіруючыся тымі задачамі, якія 60 гадоў назад былі пастаўлены ў Ленінскім плане манументальнай прапаганды, мастакі-сучаснікі ўвекавечваюць у творах манументальнага мастацтва гераічныя справы людзей свайго часу, людзей, што ўвасаблялі ідэі, за якія змагалася Рэвалюцыя.

Б. КРЭПАК.



Фрагмент мемарыяльнага комплексу «Хатынь».
Фота А. НІКАЛАЕВА.

З ЖЫВАТВОРНАЙ КРЫНІЦЫ...

Кожную раніцу па прыступках лесвіцы ў сваю майстэрню павольна падымаецца Алеся Ануфрыеўна Паслядовіч — выдатны беларускі графік, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, чалавек чулай душы, рэдкай добразычлівасці, спагадлівых адносін да людзей.

У яе невялічкай майстэрні асабліва ўтульна. Навокал — работы: завершаныя эстампы, накіды, эскізы, эцюды. Тут жа рэчы, зробленыя рукамі народных майстроў: ручнікі, калаўроты, кераміка. Яны нібы сімвалізуюць сувязь мастачкі са сваім народам, яго творчасцю. Тут Алеся Ануфрыеўна праводзіць амаль увесь свой час. Тут ажыццяўляюцца яе задумы, тут у творчай адзіноце яна абдумвае свае будучыя творы.

Нарадзілася А. Паслядовіч у Мінску ў сям'і чыгуначніка. Улетку амаль штогод гасцявала ў вясковай радні на хутары ля Пухавіч. Маляўнічыя краявіды Пухавіччыны глыбока запалі ў сэрца будучай мастачкі. «Асабліва незабыўнае ўражанне ў той час зрабілі на мяне мілагучныя беларускія народныя песні, што гучалі ў час дажынак. Звонкім рэхам адгукаючыся ў бары, яны плылі да зор познімі летнімі вечарамі, — згадвае мастачка. — У тых чароўных мелодыях раскрывалася душа народа, ягоныя мары, надзеі і спадзяванні. Відаць, менавіта ад хвалюючых уражанняў маленства ідзе мая любоў да беларускага народнага меласу, народнай творчасці».

З 15-ці год Паслядовіч пачала наведваць у Мінску студыю жывапісца Валянціна Волкава. Затым Віцебскі мастацкі тэхнікум, вучоба ў Л. Лейтмана, Х. Гутэрмана, Ф. Фогта. Яна была на пятым курсе, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Потым былі цяжкія дні эвакуацыі, напружаная праца ў тыле: у калгасе, што ў Куйбышаўскай вобласці, потым на заводзе.

Мастацкую адукацыю Паслядовіч завяршыла пасля вайны, ужо маючы за плячамі нялёгкі жыццёвы вопыт. У Ленінградскай акадэміі мастацтваў, якую яна скончыла ў 1950 годзе, яе настаўнікамі былі вядомыя савецкія мастакі К. Рудакоў, У. Канашэвіч, Г. Епіфанаў. Удасканаленню прафесійнага майстэрства садзейнічала таксама глыбокае знаёмства са скарбамі славутага Эрмітажа, Рускага музея, з творчасцю сусветна-вядомых майстроў.

У пачатку 60-х гадоў Паслядовіч вяртаецца ў Мінск. Разам з іншымі мастакамі (М. Савіцкім, А. Кашкурэвічам, Л. Шчамялёвым, Г. Вашчанкам) яна апынулася ў самым віры інтэнсіўнага мастацкага жыцця. Яе пранікнёныя, шчырыя працы як бы ўвабралі ў сябе лепшае, што было характэрна для беларускай графікі: багаты змест, яркую вобразнасць, тонкі лірыка - паэтычны настрой, нацыянальны каларыт.

Праўда, сваю ўласную тэму ў мастацтве, адметную выяўленча-вобразную стылістыку Паслядовіч знайшла не адразу. Спачатку яна працавала ў кніжнай графіцы: ілюстравала паэмы Я. Коласа «Сымон-музыка» (1957), «Рыбакова хата» (1962) і інш. Пры ўсіх станоўчых якасцях — вобразнасці, прафесійнасці выканання — ілюстрацыі не задавальнялі А. Паслядовіч. Мастачка ўнутрана адчувала, што кніжная графіка — не яе жанр, што па характару даравання яна перш за ўсё мастак - станкавіст. Гэта адчувалася ўжо ў першых станковых аркушах, выкананых у 1958—1961 гг. у тэхніцы пастэлі: «Поры года», «Веснавыя кветкі», «Вясна» і інш. У іх нібы праасвечваліся характэрныя рысы персанальнага стылю Паслядовіч: тонкі лірызм, багацце ўнутранага зместу, паэтычнасць, задушэўнасць.

Цікавасць да беларускага народнага мастацтва абудзілася ў Паслядовіч у часе падарожжаў па Палессі. Мастачка нібы нанова адкрыла для сябе свой край; з алоўкам у руках яна ўважліва вывучае своеасаблівы і выразны народны тыпаж, замалёўвае традыцыйную вопратку, палескія краявіды, прадметы этнаграфічнага побыту, уважліва вывучае беларускі фальклор, у тым ліку і выяўленчы. Гэта не магло не адбіцца на тэматыцы, настроі і фармальна-мастацкіх сродках яе графічных аркушаў. Неўзабаве фальклорная тэма стала вядучай у творчасці таленавітай мастачкі, яна як бы «перакладае» на выяўленчую мову шматгалоссе народнага меласу.

Зварот Паслядовіч да фальклору не быў выпадковым. У пашырэнні кола «зыходных традыцый», якое характэрна для савецкага мастацтва 60-х гадоў, народная творчасць увогуле адыграла даволі значную ролю.

Праўда, раннія творы Паслядовіч (пастэль «Беларуска», 1961, серыя афортаў «Жанчыны Палесся», 1965 і інш.) яшчэ не выяўляюць кантакту з народнай творчасцю. Гэтыя аркушы зроблены на падставе канкрэтных натурных замалёвак. Асобным з раннiх прац яшчэ нестае абагульнення, гэта як бы простыя накіды з натуры, без належнага адбору, без яркіх характараў.

Значнай удачай у творчасці графіка з'явілася серыя «Па матывах народных песень» (1967), якая складаецца з аркушаў: «Ой, рана на Івана», «У садочку зязюля кукуе», «Наказалі на вайну», «Пайду па лужку». Лепшыя аркушы серыі вылучаюцца вялікай паэтычнасцю, выклікаюць глыбокі роздум.

Серыя «Па матывах народных песень» стала значнай з'явай не толькі ў творчай эвалюцыі А. Паслядовіч, але і ва ўсёй беларускай графіцы. У ёй мастачка ў аспоўным ужо «знайшла сябе»: сваю тэму, своеасаблівыя выяўленча-пластычныя сродкі.

Творчы дыяпазон Паслядовіч не вычэрпваецца толькі фальклорнымі вобразамі. Нямала прац прысвяціла яна калгаснікам, людзям сёняшняй беларускай вёскі.

Тэма сучаснасці, стваральная праца народа адлюстраваны ў серыі «Людзі калгаснай вёскі» (1970). Серыя ўпершыню экспанавалася на выстаўцы беларускай графікі, прысвечанай Ленінскаму юбілею. У яе ўвайшлі аркушы «Лета ўраджайнае», «Зімовы вечар» і «Трактарысты». Літаграфія «Лета ўраджайнае» кампазіцыйна цікавая тым, што жаночыя фігуры ўпершыню даюцца аўтарам не фрагментарна, а ў поўны рост. Пры гэтым мастачка не страціла ўласцівай ёй паэтычнасці; будзённая сцэна збору садавіны набывае ў творы ўзнёслы сэнс, своеасаблівую высакароднасць. Важкі літаграфскі камень у Паслядовіч амаль не адчуваецца. Яна здабывае з яго эфекты, якія па лёгкасці і празрыстасці не саступаюць акварэлі.

У пачатку 70-х гадоў творчасць Паслядовіч эвалюцыянірує па шляху большага абагульнення, нават некаторага абстрагавання ад натуры. Глыбока разумеючы спецыфіку мастацтва як «маўклівай размовы», А. Паслядовіч у графічных серыях 70-х гадоў імкнецца ўздзейнічаць на гледача не літаратурным сюжэтам, а чыста выяўленчай вобразнасцю, пластыкай, формай у іх непарыўным адзінстве з унутранай ідэйнай задумай. Паказальныя графічныя цыклы «Беларускія жанчыны» (1971), «Народныя майстры» (1973) і інш. Для іх характэрны паказ людзей буйным планам, «у абрэз», некаторая «партрэтнасць» вобразаў. Іх выяўленчая мова больш абагульненая. Па-новаму цяпер вырашае Паслядовіч і праблему манументальнасці, імкнецца пазбавіцца ад бытавізму, апавядальнасці. У той жа час у літаграфіі, якая цяпер дамінуе ў творчасці графіка, яшчэ большая ўвага надаецца колеру, пададзенаму лаканічна, шырокімі, сакавітымі плямамі.

Жывапіснасць графічных прыёмаў характэрна і для ранніх твораў А. Паслядовіч. Але ў літаграфіях пачатку 70-х гадоў праблема колеру вырашаецца мастаком чыста графічнымі сродкамі.

У беларускай літаграфіі да А. Паслядовіч ніхто не ўдзяляў такой увагі колеру. Раней панавала чорна-белая літаграфія, якая зрэдку «аздаблялася» аднаколернай падмалёўкай. Прычым гэтыя падмалёўкі часта адыгрывалі толькі ролю дадатковага тону.

А. Паслядовіч не толькі развіла далей, але і значна ўзбагаціла, абнавіла выяўленчыя магчымасці літаграфіі. У эмацыянальным уздзеянні іх на гледача колеру належыць ледзь не першаступенная роля. Прычым у яе літаграфіях колер заўсёды актыўны, насычаны, густы.

У літаграфіі «Гаспадыня» добра відаць асаблівасці манеры А. Паслядовіч на новым этапе. Кампазіцыя вельмі простая, як і ў большасці ранейшых прац, мае партрэтны характар. З правага боку аркуша манументальна паказана фігура калгасніцы. Злева ад яе на белым ручніку — толькі што выпечаныя боханы хлеба...

Фігура калгасніцы выглядае маналітнай, яна «чытаецца» як бы па-за часам, у вечнасці. Перад намі сінтэзаваны вобраз, пазбаўлены ўсяго другараднага. Абагульненасць тут дамінуе ва ўсім: у трактоўцы твару сялянкі, яе рук, боханаў хлеба, фону, на якім лёгкімі абрысамі паказаны збаны. Уражанне важкасці, манументальнасці ўзмацняе каларыт, вытрыманы ў інтэнсіўных чырванаватых танах.

Ствараючы кампазіцыю, А. Паслядовіч ніколі не парушае плоскасці аркуша, не імкнецца стварыць ілюзію прасторы; яе літаграфіі амаль заўсёды двухмерныя. Да ліку лепшых прац трэба аднесці аркушы «Гаспадыня», «Рабіна», «Песня». У іх відаць жаданне зрабіць са звычайнага сюжэта нешта эпічнае, вечнае, што павінна зацвердзіцца ў народнай памяці, накшталт манументальнай фрэскі.

«Вечная» тэма мацярынства, якая намецілася ўжо ў ранніх графічных цыклах (аркуш «Поўдзень», з серыі «Жанчыны Палесся», 1965), развіваецца мастачкай у літаграфіях «Маці» (1972) «Калыханка» (1973) і інш. Вобраз маці ў эстампах Паслядовіч — гэта вобраз беларускай мадонны — стрымана спакойнай, паэтычнай, высакароднай у сваёй будзённасці.

У апошнія гады А. Паслядовіч вялікую ўвагу ўдзяляе нацюрморту. «Я ўспрымаю кожную рэч як жывую, адухоўленую істоту, — гаворыць мастачка, — бо ў «мёртвых» прадметах, якія нас акружаюць, часам столькі зместу, харастава, глыбокага ўнутранага свету!».

Сапраўды, нацюрморты Паслядовіч («Вясновы нацюрморт», 1975; «Званочкі», 1977, «Лён», 1977 і інш.) гаворыць часам гледачу больш, чым іншыя пампезныя, шматфігурныя палотны. У іх — праўда і прастата, філасофскі роздум пра жыццё, імкненне дайсці да яго неспазнаных таямніц, зразумець сутнасць з'яў і рэчаў. І спелае, сталае прафесійнае майстэрства, сапраўдная культура пластыкі.

«У кожнага народа свой шлях у мастацтве, свае рытмы, свае ўлюбёныя формы і фарбы. І калі мастак збіваецца з гэтага шляху, народ перастае разумець яго...», — пісаў выдатны савецкі скульптар Сяргей Канёнкаў. Паслядовіч валодае зайздросным уменнем адчуваць гэтыя рытмы і фарбы, паказваць іх хараство і непаўторную своеасаблівасць.

В. ШМАТАЎ.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

ЗНАЁМСТВА З ЭПОХАЙ АДРАДЖЭННЯ

У Гомельскім краязнаўчым музеі адкрыта выстаўка твораў выдатных мастакоў Італіі, Нідэрландаў, Германіі, Іспаніі і іншых краін, мастакоў эпохі Адраджэння. Гэта — факсімільныя рэпрадукцыі з фондаў Дзяржаўнага мастацкага музея БССР. Гледачы знаёмяцца з работамі Рафаэля, Леанарда да Вінчы, Альбрэхта Дзюрэра, Рэмбранта, Рубенса, Гоі і іншых мастакоў. Экспазіцыя выклікала вялікую цікавасць і гамяльчан і гасцей горада над Сожам.

А. МАКСІМАЎ.

СУСТРЭЧЫ З МАСТАЦТВАМ

З вялікай цікавасцю знаёмяцца пінчане з жывапіснымі палотнамі Беларусі, якія зараз экспануюцца на выстаўцы ў карцінай галерэі Пінскага краязнаўчага музея. Падоўгу не адыходзяць паклонні жывапісу ад карцін народных мастакоў Беларусі В. Бялыніцкага-Бірулі, Я. Зайцава, мастакоў У. Кудрэвіча, М. Даўгялы, І. Пратасені, І. Рудчыка, П. Данелія. Іх работы прыцягваюць увагу цеплынёй і любоўю да роднай прыроды, тонкай гамай красак, адчуваннем паэтычнасці і прыгажосці, закончанасцю вобразаў.

Л. КУЧЫНСКАЯ.

ТВОРЧАЯ САДРУЖНАСЦЬ

У мастакоў Брэста і ўкраінскага горада Луцка даўнія і моцныя сувязі. Штогод яны абменьваюцца выстаўкамі, выступаюць перад працоўнымі Брэстчыны і Валыні з творчымі справаздачамі.

Вось і нядаўна ў выставачнай зале брэсцкай абласной арганізацыі мастакоў свае новыя работы прадставілі ўкраінскія мастакі Ю. Герман, К. Барысюк, Н. Гевялюк, Г. Чарнакніжны і іншыя. Брастаўчане з цікавасцю пазнаёміліся з творчасцю суседзяў.

У час сустрэч луцкія і брэсцкія мастакі будуць абменьвацца вопытам афармлення музеяў, грамадскіх будынкаў, дамоў культуры, рэстаранаў.

Л. ІВАНОЎ.

У ГОНАР ЮБІЛЕЮ

Больш як трыццаць работ прадстаўлена на выстаўцы самадзейнага мастака Пятра Мысліўца, якая адкрыта ў Драгічыне ў гонар 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. Выстаўка арганізавана аддзелам культуры Драгічынскага райвыканкома і карцінай галерэяй Пінскага краязнаўчага музея.

У кнізе водгукаў наведвальнікі пакінулі шмат цёплых слоў у адрас аўтара твораў аб родным палескім краі, які расцвіў за гады Савецкай улады, аб людзях працы.

А. ЛЕАНАВЕЦ.

СПРАВАЗДАЧА МАСТАКА

У Палацы мастацтваў у Мінску адкрылася выстаўка твораў заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Анатоля Дзям'янавіча Шыбнёва, прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння мастака.

Дыяпазон творчай дзейнасці А. Шыбнёва надзвычай шырокі. Асаблівае месца ў яго творчасці належыць тэме Вялікай Айчыннай вайны. Яшчэ ў 1944 годзе мастак стварыў галерэю партрэтаў беларускіх партызан. А ў 1947 годзе ім напісана карціна «Палонных вядуць», якая паклала пачатак яго працы над тэматычнымі палотнамі. Потым з'явіліся такія творы, як «Памяць сэрца. Брэст», «Людзі памятаюць Хатынь»...

Шырока прадстаўлены на выстаўцы вялікія палотны, прысвечаныя У. І. Леніну і на гісторыка - рэвалюцыйную тэму. Гэта — «Есць такая партыя!», «Ленін у кастрычніку», «Кастрычніцкія дні», «Першы Усебеларускі з'езд Саветаў» і іншыя.

Шмат часу працаваў мастак над стварэннем твораў, прысвечаных людзям калгаснага жыцця. Яго палотны на гэтую тэматыку — «Радасць ураджаю. Дажынкі», «Маладзёжная брыгада», «Калгасніца» і многія іншыя.

На выстаўцы экспануюцца таксама шматлікія партрэты, паэтычныя пейзажы, у якіх мастак апявае прыгажосць роднага краю.

АДВЕЧНАЯ І ЗАЎСЁДЫ НОВАЯ

Як вядома, у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла анталогія літоўскай савецкай паэзіі ў двух тамах. Карэспандэнт штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» ўзяў інтэрв'ю ў рэдактара анталогіі, вядомага беларускага паэта, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР **Васіля Віткі.**

— Цімох Васільевіч, выданне анталогіі, безумоўна, важная з'ява не толькі ў культурным жыцці нашай рэспублікі, але і ў справе далейшага паглыблення ўзаемасувязей паміж беларускім і літоўскім народамі. Калі ўзнікла задума гэтага выдання? Як практычна ажыццяўлялася яна?

— Не ўпершыню ў нас выходзяць кнігі літоўскіх паэтаў. Перад гэтым мы мелі «Чатыры пары года» К. Данелайціса, «Паэму брагэрства» Э. Межэлайціса, кнігі С. Нерыс, А. Жукаўскаса, Э. Матузявічуса, мелі анталагічныя зборнікі «Паэты Савецкай Літвы», «Галасы сяброў», але да ўсенароднага свята — шасцідзесяці г о д д з я Вялікага Кастрычніка — хацелася паўней, грунтоўней і ў большым аб'ёме паказаць беларускім чытачам адну з цікавейшых, жывых, трапяткіх, яркіх і самабытных паэзій у нашай краіне — літоўскую савецкую паэзію. Яна захапіла нас магутным сімфанізмам гучання, разнастайнасцю галасоў, маляўнічасцю фарбаў і шырокім абсягам сучаснасці, гісторыі і народнага жыцця. Натуральна, што ў адной кнізе цяжка было змясціць нават выбранае з выбранага, прадставіць усіх слаўных песняроў братняй Літвы і старэйшага пакалення, і сярэдняга, і самых маладых. І ў той жа час не хацелася, каб гэта быў пяжкі, як падняць, том, які сваёй манументальнасцю прыдатны болей для бібліятэчнага фонду, чым для непасрэднага асабістага карыстання, што найболей цэняць аматары паэзіі.

Два зручныя, утульныя томікі, здаецца, удала спалучыліся з настроем, з колерамі краявідаў братняй зямлі, гэтак мілай нашаму сэрцу.

Не выпадкова анталогія адкрываецца радкамі Максіма Танка. Выдатны пясняр Беларусі цудоўна выказаў нашы даўнія пачуцці, любоў і замілаванне беларусаў да літоўскага народа. «Братняй Літве» — называецца верш. Гэта наш хлебсоль, якім мы сустракаем літоўскіх паэтаў на беларускай мове, на сваёй роднай зямлі:

Літва! Літва! Як мне
не паўтараць
Тваё імя, што стала родным
гукам!
Я рад, што зноў магу
пацалаваць
Мазольныя твае, як матні,
рукі.

Укладальнік анталогіі, вядомы літоўскі літаратуразнаўца Рыціс Трымоніс у сваёй прадмове вобразна сказаў, што літоўская паэзія пераступіла парог хаты свайго суседа. Пераступіла яна даўно гэты парог, як і наша, беларуская паэзія даўно пераступіла парог літоўскай хаты. З тых часоў мы ўсё часцей і часцей ходзім адзін да аднаго, радуючыся кожнай сустрэчы, дзелячыся ўсім самым лепшым, што ёсць у кожнага з нашых народаў.

— Беларускі чытач мае магчымасць пазнаёміцца з творчасцю васьмідзесяці шасці аўтараў. Калі ласка, па магчымасці, падрабязней раскажыце хаця б пра некаторых...

— Дарагія імёны гучаць са старонак гэтай анталогіі: Саламея Нерыс, Люцас Гіра, Юстас Палецкіс, Іонас Шымкус, Антанас Венцлава, Тэафіліс Цільвіціс, Костас Корсакас, Эўгеніюс Матузявічус, Эдуардас Межэлайціс, Юсцінас Марцінкявічус, Альгімантас Балтакіс, Альфонсас Малдоніс... Хочацца называць яшчэ і яшчэ. За гэтымі імёнамі — жывыя абліччы сяброў, блізкіх многім з нас. З аднымі з іх у гады цяжкіх выпрабаванняў сустракаліся на дарогах вайны, супрацоўнічалі ў франтавых і партызанскіх газетах, пісалі адозвы і лістоўкі, выступалі па радыё. Прыфрантавая Масква, Масква тых трывожных дзён збірала і яднала нас, рыхтавала да чаканага звароту на бацькоўскія землі. З якой радасцю з імі, старэйшымі, і з новымі, малодшымі нашымі таварышамі, мы потым сустракаліся і сустракаемся ў Вільнюсе і Мінску, у Каўнасе і Гродне, у дні свят і ў працоўныя будні! Спаборнічаюць, супрацоўнічаюць нашы рэспублікі, супрацоўнічаем і мы, паэты.

Выхад анталогіі — новы набытак гэтага супрацоўніцтва. Па даручэнню выдавецтва «Мастацкая літаратура» і Саюза пісьменнікаў БССР разам з паэтам Алесем Разанавым мы працавалі над падрыхтоўкай выдання анталогіі на працягу года. Шчыра скажу, што асабіста для мяне гэта быў год душэўнага ўзбагачэння, шчаслівых адкрыццяў і сустрэч з паэзіяй, якая вырасла, расце і набірае моцы з тых глыбінных крыніц, што народ шанаваў і бярог заўсёды як свае найдаражэйшыя скарбы. Агульна прызнана, што за гады Савецкай улады, у сацыялістычным грамадстве літоўцы набылі асаблівую пашану як народ, што вельмі ярка і адметна раскрыў і раскрывае свой творчы талент ва ўсіх сферах жыцця. Напэўна, маштабамі і крытэрыямі духоўнага народнага рэнесансу належыць вымяраць і дасягненні сучаснай літоўскай паэзіі.

Даўнія класічныя і фальклорныя традыцыі літоўскіх майстроў усё болей узбагачаюцца пошукамі новых магчымасцей выяўлення ў слове. На аператыўны прастор гэтых пошукаў смела і актыўна выходзяць наватарскі замысел, творчы эксперымент, выкарыстанне вопыту савецкай і сучаснай сусветнай паэзіі. Вершаваны радок усё болей набывае індывідуальныя адзнакі, уласную інтанацыю і нават графічную форму.

Значная роля ў гэтым працэсе належыць, вядома, Э. Межэлайцісу. У яго творах на першы план выйшаў новы герой, маштабы якога ўжо немагчыма вызначыць толькі нацыянальнымі рысамі. У паэме «Чалавек» паэт падымаецца да філасофскіх абагульненняў і асэнсавання складаных праблем усяго чалавецтва сваёй эпохі. Аднак паэтычную манументальнасць і сімволіку Межэлайціс умее тонка спалучыць з пяшчотнымі і чароўнымі вобразамі роднай зямлі, з пранікнёнымі лірычнымі настроямі, з інтымнай споведдзю ў самых запаветных пачуццях:

Бяздонні за спіной ужо.
Дарога ж без канца.
А ціша — белым-белая на ўсіх
вяршынях!
А сівізны вага — вага пушынак
дзьмухаўца,
Чурлёнісаўскіх срабраных
пушынак.
(Пераклад Н. Гілевіча).

Пашырэнне інтэрнацыянальных сувязей болей трывала ўмацоўвае народны грунт літоўскай паэзіі. Паэмы Ю. Марцінкявічуса, якія заваявалі шырокае прызнанне і вядомы на мовах многіх народаў, вылучаюцца якраз багаццем і глыбінёй раскрыцця рэальных сучасных і гістарычных нацыянальных характараў.

Яснасць думкі, крынічная чысціня пачуццяў, жыццёвая праўда вобразаў характарызуюць паэтычныя дасягненні А. Венцлавы, Т. Цільвіціса, К. Корсакаса, Э. Матузявічуса, В. Рэймерыса, А. Малдоніса, А. Балтакіса, У. Шымкуса.

Варты ўвагі незвычайна цікавы вопыт нашага даўняга друга, аднаго са старэйшых паэтаў Літвы Альбінаса Жукаўскаса. Як здабытчык каштоўных пород, ён прабіваецца да самых глыбінных пластоў народнага жыцця, побыту, мовы, гаворыць у сваіх маналогах простымі, зямнымі, падчас каструбаватымі ў сваёй натуральнасці словамі, здабываючы сапраўдныя россыпы першароднай паэзіі. Цяжкія, мазольныя рукі хлебароба, каваля і трактарыста — не меней высокая паэтычная катэгорыя, чым рукі музыканта, мастака і хірурга. Самабытныя вобразы яго роднай Дзукіі, яго Белай Лябёдкі паўстаюць перад намі ў арэоле хараства, на якое здольна хіба толькі эпічна-мудрая ў сваёй выразнасці народная песня.

Актыўнае творчае асэнсаванне многіх каштоўнасцей духоўнай спадчыны народа жывіць творчасць усіх лепшых майстроў літоўскай паэзіі. Хвіліны душэўнага азарэння перажываеш, чытаючы вершы В. Рудокаса, Я. Дэгуцітэ, Ю. Мацявічуса, Б. Мацкявічуса, В. Шульцайтэ, А. Бярнатаса, А. Дрылінгі, Юозаса Марцінкявічуса, А. Мікуты, І. Стралкунаса, Ю. Вайчунайтэ, А. Пабіюнаса, М. Марцінайціса.

Выдатная ў літоўцаў паэзія для дзяцей, у якой працуюць майстры самай высокай культуры. Да ўжо вядомых набыткаў С. Нерыс, Э. Межэлайціса, К. Кубілінскаса з поспехам далучаюць свой багаты плён А. Матуціс, М. Вайнілайціс, В. Пальчынскайтэ, Р. Скучайтэ.

— Хто з беларускіх паэтаў працаваў над перакладамі?

— Працаваў вялікі калектыў: М. Танк, П. Панчанка, М. Лужанін, Н. Гілевіч, С. Грахоўскі, С. Дзяргай, У. Караткевіч, В. Вярба, А. Вольскі, В. Зуёнак, Г. Бураўкін, А. Лойка, Э. Агняцвет, П. Макаль, А. Звонак, А. Астрэйка, В. Іпатава, Д. Бічэль-Загнетава, У. Шахавец, Я. Сіпакоў, В. Рагойша — цяжка ўсіх пералічыць. Кожны ўклаў у нашу агульную працу часцінку

ФАНТАСТЫКА, ПРЫГОДЫ

Павел ВЕЖЫНАЎ

ВЫШЭЙ ЗА ЎСЁ!

НАВУКОВА-ФАНТАСТЫЧНАЯ АПОВЕСЦЬ

(Працяг. Пачатак у №№ 10—14).

Дзяўчына ўражана кантрастамі ў жыцці і паводзінах свайго новага сябра Баяна. Асабліва непаразуменне ўзнікае між імі тады, калі Іна бачыць яго на паляванні. Яна не можа зразумець і прыняць забойства безабаронных жывёл. І ўсё ж між юнаком і дзяўчынай, насуперак несумяшчальнасці часоў, узнікае ўзаемнае пачуццё.

Яна ляжала з расплюшчанымі вачамі — устрывожаная, з супярэчлівымі пачуццямі — і думала. Раптам за сцяной пачуліся лёгкія крокі. Ціха рыпнулі дзверы, увайшоў Баян. Іна хуценька заплюшчыла вочы. Аднак не ўтрымалася і зірнула праз павекі. Гэтая маленькая хітрасць была нечаканасцю для яе самой.

Лёгкім, амаль нячутным крокам Баян прайшоў у кут, дзе стаялі некалькі яго коп'яў, выбраў самае кароткае, паспрабаваў пальцам яго металічнае вастрыё. Крыху пастаяў з кап'ём у руцэ, прыслухаўся, кінуў імгненны позірк туды, дзе спала яна, і нячутна пайшоў да дзвярэй Іна пахаладзела. Нейкі ўладарны падсвядомы страх сціснуў яе сэрца.

— Баян! — ускрыкнула яна.

Баян стаў і павольна павярнуў галаву. У пакоі было яшчэ цёмна, але Іну ўразіў бляск яго вачэй. Ён моўчкі глядзеў на яе, нерухомы, як статуя.

— Куды ты?..

— Пасткі паглядзець... Я ненадоўга...

— Чаго так рана?

— Можа, заспею ваўка, — адказаў ён проста.

— Якога ваўка? Ах, так!.. Баян, гэта... небяспечна?

— Што значыць небяспечна?

— Хіба гэта слова не славянскае? Не ведаеш, што значыць небяспечна?

— Не ведаю, — адказаў ён. — Трэба ісці, Іна...

Ён рашуча павярнуўся і выйшаў. Коратка рыпнулі за ім дзверы, крокі хутка пачалі аддаляцца. Яна ўскочыла з пасцелі, таропка апранулася і выбегла ўслед за ім. Яшчэ толькі ледзь бралася на дзень, паветра было халоднае і нерухомае, як вада. Толькі верхавіны дзвюх высокіх ялін на ўзлеску гарэлі, як свечкі, асветленыя нябачным усходам. Але ўнізе, пад густымі шатамі ялін было яшчэ цёмна, і Баяна не было відаць. Яна таропка пайшла знаёмай сцяжынкай і хутка яго дагнала. Баян, відаць, яшчэ здалёк пачуў яе крокі і чакаў.

— Ты павінна вярнуцца дамоў, Іна. — Голас яго быў строгі і ўладарны, нават з ноткамі непрыязнасці. Яшчэ ні разу ён так не гаварыў з ёй. — Я ўжо казаў — не жаночая гэта справа...

— Усё роўна хачу быць з табой, Баян...

— Нельга, Іна! Ідзі дамоў, я скора прыйду.

— А калі... не прыйдзеш?

Суровы пагляд Баяна памякчэў на нейкі момант, недзе ў глыбіні яго прамільгнула ўдзячнасць і пяшчота. Іна паспела гэта адчуць, але, глянуўшы на яго зноў, сустрэла калючы і жорсткі позірк.

— Дазволь мне быць гаспадаром у сваім доме, — сказаў Баян суха. — Зараз жа вяртайся назад!

Ён крута павярнуўся і хутка пайшоў. Яна ж, як у сне, усё-такі падалася за ім, ні пра што не думаючы, не ўсведамляючы што робіць. Псіхолагі яе часу, сутыкнуўшыся з такім фактам, былі б нямала здзіўлены. Што за атавістычнае пачуццё, адкуль яно? Нешта падсвядомае, чым не здолелі авалодаць біёлагі... Як бы там ні было, яна ішла за ім і не заўважала, што твар яе ўвесь мокры ад слёз. Юнак спыніўся, спынілася і яна. Цяпер ён размаўляў больш прыязна.

— Ідзі крокаў за дзесяць... І, глядзі, толькі каб ціха...

Яна старалася. Вядома, яна не магла ісці гэтак, як ён — нібы асцярожны алень. Іна кожны раз прымервалася, куды паставіць нагу, ішла як не на пальчыках. Усё было, як у сне.

Ён запаволіў хаду, затым спыніўся. І яна замерла на сваім месцы ў яго за спіной. Баян стаіў дых — ён выразна бачыў ваўка. Гэта быў малады, але буйны, з магутнымі сківіцамі воўк. Сабраўшыся ў вялікі сівы камяк, ён ласа трыбушыў зайца, які папаўся ў пастку. Відаць, воўк быў надта галодны, калі не па-

сваіх хваляванняў, даніну пашаны паэзіі братняга народа. Асаблівай удзячнасці заслугоўвае дапамога, вопыт, творчая зацікаўленасць у працы над перакладамі паэтаў А. Разанава, які валодае літоўскай мовай, Р. Барадуліна, Я. Семяжона, Р. Семашкевіча, М. Стральцова, што ўзялі на сябе клопат — як мага паўней паказаць і перадаць індывідуальныя абліччы аўтараў самых розных пакаленняў і творчых кірункаў.

— У анталогіі значыцца Ваша прозвішча не толькі як галоўнага яе рэдактара, але і як аўтара перакладаў. Якія цяжкасці ўзнікалі перад Вамі як перакладчыкам?

— Якія цяжкасці? Яны ў перакладчыцкай працы былі заўсёды і будуць. Мне нават думаецца, што яны ў пэўнай меры стымулююць і заахвочваюць: чым цяжэй, складаней, тым цікавей дамагацца адпаведнасці пераўвасаблення. І хоць не блізкія нашы мовы — літоўская і беларуская, але ёсць у нас іншая спаконвечная блізкасць: шчырасць і непасрэднасць суседства, падабенства ўмоў жыцця, бытавога асяроддзя, агульнасць народных этычных і эстэтычных уяўленняў і фальклорных традыцый. Відаць, такая духоўная супольнасць дапамагае нашаму выяўленню і ў слоўных сродках.

Гэта не азначае, што іншамоўных паэтаў, якія наследуюць класічныя або трансфармуюць фальклорныя традыцыі, лягчэй перакладаць, чым тых, хто шукае новых вершаваных форм. Сучасныя літоўскія паэты амаль усе выкарыстоўваюць фальклор, але некаторыя пайшлі на болей смелы, я сказаў бы, азартны эксперымент у карыстанні народным словам. Вось наглядны прыклад. Спалучаючы фальклорную архаіку з вопытам сучаснай прафесійнай паэтыкі, Марцэлюс Марцінайціс дамагаецца яркага, падчас нечаканага ўражання навізны, свежасці і гарманічнасці сродкаў, якімі малюе сучасніка. Захоўваючы сістэму фальклорных прыёмаў, паэт паспяхова ўключае іх у дзейсны ўжытак і актыўныя формы сённяшняга мыслення. Цікавыя пошукі ў гэтым кірунку ў паэтаў Вітаўтаса Бложа. Сігітаса Гяды і ў болей малодшых паэтаў.

Здавалася б, паэзія, народжаная фальклорнай традыцыяй, найболей лёгка паддаецца перакладу. Але паспрабуйце перадаць ва ўсёй дасканаласці і ва ўсіх нюансах з'яву, калі традыцыя становіцца ўзлётнай пляцоўкай для сапраўднага наватарства, узбагачаецца новым вопытам!

Не можа быць перакладу механічнага, пасіўнага, няхай сабе нават тэкстуальна дакладнага. Толькі мовай паэзіі можна перадаць адметнасць паэтычнай індывідуальнасці. Безумоўна, не ўсе аўтары і перакладчыкі, як кажуць, сышліся характарамі і, магчыма, не заўсёды адпавядаюць адной групе паэтычнай крыві. Я цвёрда пераканаўся, што, рыхтуючы падобныя выданні, трэба ўзяць за правіла, каб аўтары і перакладчыкі абавязкова знаёміліся, як мага часцей сустракаліся, а перакладчыкі дасканала вывучалі ўсю творчасць таго, каго ўзяліся перакладаць — класік гэта або сучаснік. Для такога супрацоўніцтва ў нас ёсць усе ўмовы. Перакладаць без падрыхтоўкі, тым больш без ведання мовы арыгінала — нішто іншае, як аматарскае саматужніцтва.

— Пераклады ажыццяўляліся з падрадкоўнікаў ці непасрэдна з арыгінала?

— Нашы літоўскія таварышы вельмі сур'ёзна паставіліся да справы перакладу. Загадзя зрабіўшы падрадкоўнікі, яны выдалі іх разам з арыгіналамі кнігай, якая займае каля тысячы старонак. Гэта — першы неацэнны дапаможнік перакладчыку. Акрамя гэтага, Саюз пісьменнікаў Літвы сістэматычна выдае панарамныя агляды па ўсіх жанрах: што цікавага і новага ў жывым творчым працэсе — карысны і варты ўвагі клопат аб развіцці літаратуры!

Адвечнае, але заўсёды маладое дрэва літоўскай паэзіі, яго карэнні і верхавіна жывяцца глыбінцымі крыніцамі роднай зямлі.

Два зялёныя томікі, як два лісткі гэтага магутнага дрэва.

Нават хто не ў поўным ахопе ведае цудоўную паэзію Літвы, а пазнаёміцца з ёй са старонак нашай анталогіі, застанецца душэўна ўдзячны многім прыемным хвілінам радасных і незабыўных сустрэч.

ЗАКЛІКАНЫ РЭВАЛЮЦЫЯЙ

Васілю ГАРБАЦЭВІЧУ — 85

Прадстаўнік той часткі беларускай інтэлігенцыі, шлях да ведаў у якой пачаўся яшчэ ў дарэвалюцыйны час, Васіль Гарбацэвіч, як і многія яго равеснікі, па-сапраўднаму далучыўся да вышынь культуры толькі пасля перамогі Вялікага Кастрычніка. Фарміраванне ягонага самабытнага таленту адбывалася пад уплывам вуснай народнай творчасці, «Чаравалі мяне заўсёды народныя песні, казкі, легенды, звычаі, абрады. Калі, бывала, на лузе ў час сенакосу ці на полі ў час жніва заспяваюць жанчыны, не знаходзіў сабе месца», — прызнаецца пісьменнік у аўтабіяграфіі, змешчанай у кнізе «Вытокі песні». Там знаходзім і такія радкі: «Любоў да роднага мастацкага слова я адчуў, калі мне было дзесяць гадоў». Гэтаму садзейнічаў родны брат Лукаш, які тады вучыўся ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, сябраваў з Якубам Коласам.

Прага да ведаў прывяла юнака, што быў «восьмы рот у сям'і маламоцнага селяніна», у 1909 годзе ў Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю. Закончыўшы яе, ён ненаторы час настаўнічае ў Лютаўскай земскай школе былога Сенненскага павета, потым вучыцца ў Мінскім настаўніцкім інстытуце.

У гады Савецкай улады В. Гарбацэвіч выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Магілёўскім педтэхнікуме. Асноўную ж частку свайго жыцця ён правёў на роднай Пухаўшчыне, працуючы настаўнікам Дукорскай сярэдняй школы, аддаўшы народнай асвеце 44 гады.

У гады Вялікай Айчыннай вайны быў на фронце, пад Каневам яго цяжка параніла.

Жаданне паспрабаваць свае сілы ў драматургіі з'явілася ў яго пад уплывам фальклору.

Фальклорныя матывы адчувальныя ў п'есе «Пад вішнёвымі садамі» (1927). Непасрэдныя ўражанні ад перабудовы беларускай вёскі знайшлі сваё адлюстраванне ў «Песні нашых дзён» (1930).

Сапраўднае прызнанне пісьменніку прынесла п'еса «Чырвоныя кветкі Беларусі» (1923) — адна з першых спроб у нацыянальнай драматургіі паказаць героіку грамадзянскай вайны уславіць чалавека-змагара, апантанага верай ў заўтрашні дзень, у шчаслівую будучыню. Пабудаваны на канкрэтным гістарычным матэрыяле (у аснову леглі падзеі, якія адбыліся ў Дукоры ў 1920 годзе, калі белапольскія акупанты расстралялі адзінаццаць падпольшчыкаў-партызан на чале з былым матросам Андрэем Блажко), твор гэты пры пэўных драматургічных праліках вабіць жыццёсцвярджальным, рэвалюцыйным пафасам, глыбокай сацыяльнай актыўнасцю галоўных герояў, якія свядома ідуць на смерць, бо ведаюць, што заранні новага жыцця ўжо свецяцца на небасхіле.

Ужо ў 1972 годзе ў часопісе «Беларусь» быў змешчаны невялікі драматургічны абразок В. Гарбацэвіча «Яраслаўскі вечар», у якім пісьменнік вярнуўся да гадоў свайго юнацтва, расказаў пра сустрэчу беларускіх студэнтаў з Максімам Багдановічам, якога сам добра ведаў.

...Доўгае, прыгожае жыццё ў Васіля Гарбацэвіча. Напоўненае важнымі сацыяльнымі і грамадскімі зместам, увабраўшае ў сябе дыханне самога часу, яно — прыклад таго, як трэба служыць свайму народу. Радзіме партыі. Сумленна шчыра, адданаі

С. ВІРЗОЎСКІ.

АДЗІН З ПЕРШЫХ

Да 75-годдзя з дня нараджэння Міколы АЛЯХНОВІЧА

Пра жыццё многіх беларускіх пісьменнікаў як дарэвалюцыйнага часу, так і 20—30-х гадоў, якія ўнеслі пэўны ўклад у развіццё роднага слова, на жаль, напісана мала. Менавіта так здарылася і з Міколам Аляхновічам, пра якога ёсць толькі кароценькія нататкі ў БелСЭ і даведніку «Пісьменнікі Савецкай Беларусі». Вось чаму хочацца нагадаць факты з яго біяграфіі, сабраныя ў архівах, узятыя ў яго брата Аляксея.

Нарадзіўся М. Аляхновіч 21 красавіка 1903 г. у Барысаве. У 1920 годзе скончыў 8 класаў мужчынскай гімназіі. З верасня 1921 года — ён студэнт медыцынскага факультэта БДУ. Правучыўшыся да трэцяга курса, пакідае універсітэт, выкладае беларускую мову і літаратуру ў вопытна-практыкавальнай школе пры Барысаўскім педтэхнікуме. Тут ён актыўна ўключаецца ў бурлівы вір літаратурнага жыцця. У тэхнікуме праходзілі шматлікія вечары мастацкай самадзейнасці, выпускаліся насценгазеты, працавалі гурткі літаратуры, драматычны, абмяркоўваліся вершы і апавяданні студэнтаў.

4 красавіка 1925 г. М. Аляхновіч робіць даклад пра «Маладняк» наогул і пра літаратурныя кадры Барысаўшчыны — утвараецца Барысаўская філія «Маладняка» Членамі яе, хто адразу, а хто крыху пазней, сталі многія пачаткоўцы, сярод якіх быў і Р. Мурашка. М. Аляхновіча абралі кіраўніком філіі, старшынёю яе прэзідыума.

Ужо ў першым нумары часопіса «Маладняк Барысаўшчыны» (1926) ён змясціў артыкул «Маладняк», дзе расказаў пра арганізацыю, мэты і задачы яе, пра гуртаванне літаратурных сіл Барысаўшчыны.

Бачачы, што набытыя веды не задавальняюць яго не толькі як літаратара, але і як настаўніка, М. Аляхновіч вырашае прадоўжыць вучобу. У 1926 г. яго залічваюць адразу на 2-гі курс літаратурна-лінгвістычнага аддзялення педфака БДУ. Яго ён скончыў у 1929 г.

Пасля вучыўся ў аспірантуры АН БССР, працаваў навуковым супрацоўнікам секцыі літаратуры Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР, а ў 1933—1936 гадах — на педагагічнай рабоце ў Мінскім педінстытуце імя А. М. Горкага (у снежні 1935 г. кваліфікацыйная камісія НКА БССР надала яму званне дацэнта).

Як крытык М. Аляхновіч выступаў даволі актыўна. Яго артыкулы і рэцэнзіі пра творчасць П. Труса, А. Александровіча, Я. Коласа, Я. Скрыгана, М. Багдановіча, М. Горкага і інш. друкаваліся на старонках часопісаў «Маладняк», «Полымя», «Камуністычнае выхаванне», «Заклік» і іншых беларускіх перыядычных выданняў. Аналізуючы літаратурны працэс, ён гаварыў аб неабходнасці глыбейшай сувязі літаратуры з сучаснасцю, з жывой практыкай сацыялістычнага будаўніцтва, арыентаваў пісьменнікаў на праўдзівае адлюстраванне рэвалюцыйнага мінулага народа і новай явы, на ўзняцце самых актуальных тэм і праблем.

У пасляваенныя гады М. Аляхновіч працаваў у галіне медыцыны. Памёр ён у Ленінградзе 9 красавіка 1959 г. Але і тое, што ён шчыра працаваў у нашай літаратуры, дапамагаў у меру сваіх сіл будаваць яе гмах, варта пашаны.

Янка САЛАМЕВІЧ.

Віцебскае музычнае вучылішча запрашае выпускнікоў на святкаванне 60-гадовага юбілею, які адбудзецца 20 мая 1978 года ў канцэртнай зале музвучылішча. Пачатак а 14-й гадзіне.

чуў чалавека. Ці пах крыві задурманіў яму галаву да рэшты.

Баян усадзіў кап'ё ў зямлю і адным рухам сцягнуў з пляча лук. Звер пачуў нешта няладнае і паволі ўзняў акрываўленую пысу. Вочы яго пагрозліва бліснулі. Яму трэба было адразу кінуцца наперад ці адскочыць убок. Але ж гэта быў яшчэ малады воўк, і страшныя вочы чалавека на нейкі час прыкавалі яго да месца. Звер толькі гыркнуў, на ім пачала ўздымацца дыбарам поўсць. Стралы ён не заўважыў, але адчуў, як нешта глыбока ўелася ў карак. На нейкі момант востры боль паралізаваў розум ваўка, выклікаўшы лютую злосць. Ён узляцеў у паветра, але адным скачком дасягнуць Баяна не мог, было далекавата...

Баян чакаў гэтага скачка з кап'ём напагатове. Нішто не выяўляла ў ім хвалявання — ні вочы, ні выраз твару, ні пастава. Воўк гатоў быў зрабіць другі, рашучы рывок, ужо вось як рукой падаць, чырванее яго крывавая разяўленая пашча. І ў момант, калі той ужо адштурхнуўся ад зямлі, Баян коратка размахнуўся, і кап'ё з жорсткай дакладнасцю ўвайшло ваўку ў глотку. Скачок звера быў такі магутны, інерцыя такая вялікая, што Баян ледзь устояў на нагах. Яму нічога не заставалася, як выпусціць кап'ё і самому адскочыць убок. Цяжкае цела чмякнулася якраз там, дзе толькі што стаяў чалавек. Баян імгненна выхапіў з похвы нож, але тут жа ўбачыў, што гэта лішне. Кап'ё пранізала звера глыбока і, відаць, дастала да сэрца. Сівая туша ваўка толькі канвульсіўна ўздрыгвала.

Дзяўчына бачыла ўсё — ад пачатку да канца. Яна непрыкметна для сябе нават наблізілася да месца паядынку. Яе ўразіў апошні скачок звера і бязлітасны ўдар кап'я, які зваліў яго. У той момант з яе вуснаў зляцеў слабы піск, у якім былі і жах, і задавальненне. Ваўку настаў канец. Усёй істотай яна адчувала гэта і радавалася такому зыходу. Неверагодна, але гэтаму радавалася тое самае сэрца, якое, здаецца, так добра вывучылі псіхолагі. Што небяспека мінулася. Што ён жывы і здаровы. І сама яна жывая. Яны — жывыя. Над імі святлела неба, зеленаватае і празрыстае. На ім блішчэла ўжо ўсяго адна зорка, таксама празрыстая і бледная, гатовая вось-вось растварыцца ў ранішнім ззянні.

Баян уважліва зірнуў на яе. У ягоным паглядзе гэты раз нічога асаблівага не было — ні жорсткасці, ні гонару пераможцы — хіба, можа, прытоеная трывога і заклапочанасць. Ён зрабіў крок да яе і спытаў, як нічога і не было:

— Бачыла?

— Ага, усё бачыла...

Баян нечакана ўсміхнуўся.

— Я дрэнна зрабіў?

— Не — чаму ж?

— Як — чаму? Ты не раз казала, што нельга забіваць жывёл.

— Але ён... ён задушыў зайчыка! — яна чамусьці пачала заікацца.— Ён мог задушыць і цябе...

— Магло быць і так,— згадзіўся Баян.— Чалавечая скура далікатная, даводзіцца яе ахоўваць...

Яна, як прысаромленая, маўчала.

— Трэба ісці,— сказаў ён,— пара даіць коз.

Іна ў душы засмяялася ад такога супастаўлення — забойца звяроў і мірны казадой. Між тым, вырашыла яна, і тое і другое неяк вельмі натуральна стасуецца да яго. Што сказаў бы пра гэтага чалавека Алек — інтэлігент з тонкімі далікатнымі рукамі, які, здаецца, ні разу за ўсё жыццё не пачухаў за вухам асла...

Баян узяў яе лёгенька вышэй локця, каб вывесці на сцежку. Гэты раз яго дотык зусім не быў брыдкі. Яна адзначыла нават, што рука яго цёплая, нейкая асабліва прыемная ў ранішняй ядранасці.

Іна ішла паперадзе Баяна, адчуваючы сябе маленькай і безабароннай, з няясным адчуваннем таго, што яны пазбеглі смяртэльнай небяспекі.

Іна адразу шмыгнула ў хату пераапранулася, а Баян накіраваўся падаіць коз. Іх было ўсяго тры, і нанач ён заганяў іх у невялікую загарадзь тут жа, непадалёк. І цяпер толькі ўзяўся за работу, як у кустах побач са сваёй невялікай кашарай пачуў нейкі шумок. Паглядзеў уважліва — нідзе нікога. Але востры зрок паляўнічага адзначыў ледзь прыкметнае гайданне галінкі. Там нехта быў, толькі хто — чалавек ці звер? Баян пакінуў даіць казу, прыгледзеўся — па кустах хутка аддалялася прыгнутая постаць чалавека, які хацеў знікнуць так, каб яго не заўважылі. Баян кінуўся наўздагон. Чалавек, напэўна, адчуў пагоню, бо добра-такі даў цягу. Але ж ва ўсім племені не было бегуна спрытнейшага за маладога князя. Ён хутка дагнаў уцекача і, схапіўшы ззаду за плячо, паваліў на зямлю. Той спачатку спрабаваў выкручвацца, але Баян лёгка прыціснуў яго да зямлі.

— Слаў, гэта ты?..

(Працяг у наступным нумары).

ТУДЭМА—СЮДЭМА...

Віктар ШАЎЧЭНКА

ДАКАЗАЎ...

Што ні кажыце, а прыватны сектар у сучасным горадзе—анахранізм. Іду неяк па адной такой архаічнай вуліцы — дамы высачэзныя, хоць і аднапавярховыя, і ўсе розныя. Аж рабацінне ў вачах з'явілася ад гэтай нязвыклай антыстандартнасці.

Сям-там на варотах вісяць шыльдачкі з надпісам: «Асцярожна, у двары злы сабака!». Крочу далей, і раптам на адной брамцы заўважаю: «Калі ласка! У двары добры сабака».

Я аж падскочыў ад нечаканасці і адчуў, як кроў ва мне ўзбунтавалася і напоўніла сэрца пратэстам.

Грукнуў я ў дзверы і, дачакаўшыся пакулі выйдзе гаспадар, прыціснуў яго рэзонным пытаннем:

— Што ж гэта ты, дзядзька, вывешваеш?!

Я злосна пабарабаніў пальцамі па шыльдачцы.

Гаспадар прыветліва ўсміхнуўся і спытаў:

— Чым жа яна вам не падабаецца?

— Тым, што калі б у цябе быў на самай справе добры сабака, ты не стаў бы гэтага афішываваць. Які сэнс прынаджваць злодзеяў?

— А я нанач, чалавеча, сабачку ў дом бяру, каб не ўкралі.

— Прычым тут сабака, я пра каштоўнасці вашы,—крыху супакоіўшыся, перасцярог я гэтага разяваку і дыдактычна дадаў. — Засячы сабе на носе: добрых сабак не бывае.

Хоць мой апанент і не стаў гэты довад аспрэчваць, але я прачытаў на яго твары сумненне.

— Ну што ж, — я адчуў, што мяне перапаўняе добрая спартыўная злосць, — я зараз табе гэта дакажу.

Шалёна сарваўшыся з месца, я пачаў бегаць па двары вакол сабакі. Гэтыя прадстаўнікі фауны не любяць бегаючых незнаёмцаў. Але, наўздзіў, пёс сядзеў нерухома і глядзеў на мяне, як на вар'ята. Тады я апусціўся на карачкі і пачаў павольна набліжацца да сабакі, кукарэкаючы і гаўкаючы. А сабака, звесіўшы адно вуха, з цікавасцю сачыў за мной.

— Р-р-ррр! — страшэнна загыркаў я і пачаў кідацца на сабаку, а той адышоўся крыху ўбок, паглядзеў на гаспадара і пакруціў папай ля скроні.

«Зараз ты ў мяне расколешся, лапавухі», — зларадна падумаў я і ўкусіў гэтую чацвераногую абразіну за бок.

Сабака ўздрыгнуў і ўпіўся сваімі драпежнымі зубамі ў тое месца, дзе пачыналася мая правая нага...

— Ну што, гаварыў жа я табе, дзядзька, што добрых сабак не бывае, — прамовіў я радасна і горда пайшоў сваёй дарогай, моцна кульгаючы.

Сцяпан АЛЕЙНІК

АДПРАЎЛЯЮЦЬ У АРМІЮ ПЯТРА

Паўсяла сабралася на свята.
Прыляцела з Крыму і сястра...
Рук і ног не чуюць мама з татам—
Адпраўляюць ў армію Пятра!

Бубен біў. Гармонікі іграл.
Зноў спявала маміна кума.
— Ты служы, каб выйсці ў генералы!—
Свой наказ чаканіў дзед Хама.

Так тры дні ўсе пілі і елі.
На чацвёрты — селі на «газон»
І праводзіць Пецю захацелі
Аж туды, дзе станцыя, перон...

Як пілі шампанскае ў буфеце,
Спахапіўся раптам дзед Хама:
— Пачакайце, штось не бачна Пеці,
Навабранца нашага няма!..

А на запытанне ваенкома
Дзед прыклаў руку да картуза:
— Мы яго забылі, пэўна, дома!—
І ў старога капнула сляза.

У рэшце рэшт забытага прывезлі,
На хаду ўпіхнулі ў вагон
Ды яшчэ і цалаваццa дезлі.
Ледзьве-ледзьве змог паехаць ён.

. . . . . .

Пеця служыць. Вось прымаць прысягу
Надышла ужо яму пара,
А ў сяле дагэтуль глушаць брагу—
Адпраўляюць ў армію Пятра!

Пераклаў з украінскай
М. МІРАНОВІЧ.

ХТО ВІНАВАТЫ?

Мужчыну паднеслі нашатыру, клапатліва прыўзнялі з крэсла і павялі пад рукі праз залу.

Аркестр адразу замоўк. Падзея ўсхвалявала наведвальнікаў, і яе ажыўлена абмяркоўвалі.

— Ніякай меры ў чалавека, — гнеўна асудзіла мужчыну смуглявая жанчына, абіраючы галінку вінаграда. — Дарвецца такі вось да чаркі — за вушы не адцягнеш.

— Здаецца, не піў ён, — засупярэчыў барадаты сусед, паказваючы на столік, на якім стаяла бутэлька з мінеральнай вадой.— Відаць, здароўе падвяло чалавека...

— Здароўе? — хмыкнула рухавая дзяўчына ў акулярах. — Ды ў яго здароўя, па-мойму, на ўсіх нас хопіць. Ды вы хацяў звярнулі на яго ўвагу? Гэта не мужчына — волат! У яго не плечы, а шыфаньер!

— Навошта аб чалавеку дарэмшчыну несці? — сказаў чацвёрты за столікам — пажылы мужчына, які трымаў у руцэ курыную костку. — Не п'яніца ён — па заказу бачна. І здароўем яго бог не пакрыўдзіў. Усім бы нам такое здароўе. А што ўсеўся занадта блізка за музыкантаў, дык хто ж вінаваты? Здараецца, і здаравейшыя за яго з непрывычкі млеюць. Ужо вы мне паверце. Ці ж я першы раз у гэтым рэстаране?

В. ГІЛЕВІЧ.

ФРАЗЫ

Развязаў «гордаісў вузел» і завязаў марскі.

●

Не прымайце Траянскага каня за Пегаса.

●

Зразумей самога сябе і раскажы біёграфам.

●

Зімой паэт пісаў белыя вершы, а ў астатнія поры года — бясколерныя.

●

Ён доўга выціраў ногі перад тым, як увайсці ў гісторыю, але дзверы аказаліся зачыненымі.

●

«Я з начальнікам на адной назе», — цешыўся падхалім, знаходзячыся з тым у перапоўненым аўтобусе.

●

«Мядовы месяц» пчаляр спраўляў на пасецы.

●

Ён палохаўся выказаць сваё меркаванне — яно было супраць яго.

В. БАЧАРОЎ.

СІЛА ЗАХАПЛЕННЯ

Спрабуючы ўгаварыць старога, каб не ішоў на паляванне, бабка кажа:

— Як мне, то хай бы той заяц больш за каня быў, я не пайшла б на паляванне.

Дзед адказаў:

— А мне — хоць меншы за блыху, але каб уцякаў, то я пайду.

БЕЛЫ І ЧОРНЫ БУСЛЫ

Белыя буслы, кажуць,
прыносяць дзяцей
Чорныя — разносяць
выканаўчыя лісты.
Ён не любіў буслоў. І жыццё
дажывае бабылём.

І. АДАМОВІЧ.

ДЗІВАК-ЧАЛАВЕК...

— Сцэнарый маламетражны? Трэба расцягнуць на дзесяць серый.

Творчы падыход да натуры...

Сумяшчальнік...

— Пастрыжыце мяне пад класіка...

Мал. А. ЧУРКІНА.

Уладзіслаў ЯКУБОЎСКІ

НЕЗАДАВОЛЕНЫ

Мюзік-хол у Ніжніх Лапцях карыстаўся нечуванай папулярнасцю. Дырэктар Патычак прыдумваў штораз новыя цікавыя праграмы і нумары. Ад адных з іх мурашкі па спіне бегалі, іншыя ж давалі паўнату мастацкага захаплення.

Тэатр быў заўсёды паўнюткі.

Гледачы літаральна шалелі ад задавальнення.

Апошнюю праграму ён таксама насыціў выдатнымі нумарамі: Кіт дэкламаваў вершы з авангарднай паэзіі, сапраўдная сірэна рабіла стрыпціз, дзіні сабака Дзінга граў на электрычных гітарах «біг-біт» і шэраг іншых сенсацый.

Кожны вечар Патычак глядзеў на задаволеную публіку. Аднак яго радасць азмрочваў тып, які на кожным канцэрце сядзеў з каменным тварам у чацвёртым радзе і ніколі не смяяўся.

Больш таго, на твары таямнічага пастаяннага наведвальніка дырэктар бачыў грымасу незадаволенасці і пагарды.

Горш за ўсё, дырэктар Патычак прыкмеціў, што публіка, якая першапачаткова з энтузіязмам сустракала кожнае выступленне выканаўцаў, паступова пачала менш захапляцца, што пад уплывам таямнічага госця з чацвёртага рада людзі пачалі ўстрывожана азірацца.

Дырэктар Патычак не меў ні хвіліны спакою. Ён напружваў увесь свой арганізацыйны талент, ездзіў па свеце, здабываў найбольш сенсацыйныя нумары і з-за заслоны сачыў за выразам твару гледача з чацвёртага рада.

Атрымлівалася, што ўсе яго намаганні дарэмныя. Гэты адзіны глядач быў заўсёды незадаволены, на яго твары ні разу не здрыгануўся ні адзін мускул. Гэта Патычка ўсё больш нервавала. З-за гэтага тыпа дырэктар не цешыўся ўжо ні вялікімі даходамі, ні выдатнымі рэцэнзіямі ў друку.

Урэшце ён вырашыў яшчэ раз абнавіць праграму, рэпертуар і завербаваў квартэт найлепшых клоўнаў з найбольш славутых цыркаў.

Выбухі рогату ў часе іх выступленняў даходзілі да апагея. Кожны дзень хуткая дапамога вывозіла з тэатра ў бальніцу па некальні дзесяткаў знямоглых ад смеху. У сваю чаргу, санаторыі прывозілі сваіх пацыентаў у мюзік-хол на лячэнне рогатам. Пасля канцэрта разведзеныя пары зноў уступалі ў гарманічныя сямейныя саюзы.

Толькі таямнічы глядач у чацвёртым радзе быў па-каменнаму абыякавы.

Аднойчы вечарам дырэктар Патычак не вытрымаў: ён выскачыў у глядзельную залу, падбег да гэтага ненавіснага госця і, схапіўшы яго загрудкі, крыкнуў:

— Чаму ты, нягоднік, не смяешся?!

Але глядач маўчаў. Аказалася, што ў зале сядзеў манекен, якога кожны дзень саджалі на адным і тым жа месцы зайздросныя кіраўнікі іншых культурных цэнтраў.

Пераклаў з польскай
П. СТЭФАНОВІЧ.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Індэкс 63856 АТ 12076

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела грамадска-палітычнага жыцця і інфармацыі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела пісем і масавай работы — 33-22-04, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь АСІПЕНКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (адказны сакратар), Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Аляксей ПЫСІН, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Мікола ТКАЧОЎ, Юлія ЧУРКО.